Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
СУБОТА
№ 206 (26071)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Абвінавачванні кіраўніцтва Беларусі ў рэлігійнай і нацыянальнай дыскрымінацыі абсурдныя

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з удзельнікамі міжнароднай канферэнцыі «Дыялог хрысціянства і ісламу ва ўмовах глабалізацыі».**

«У Беларусі няма месца антысемітызму. Калі нехта скажа, што ў Беларусі працвітае ці то антысемітызм, ці то мы прыгнятаем тут мусульманскае насельніцтва, вы гэтаму не верце. Гэта непрыяцелі, ворагі Беларусі. Толькі яны могуць гаварыць аб гэтай святой зямлі, гэтай святой дзяржаве, гэтым святым народзе такія рэчы. Наша краіна паклала ў аснову палітыкі прынцып інтэрнацыяналізму. Мы не проста гэта дэкларуем, мы дэманструем гэта на кожным квадратным метры нашай зямлі. Вы можаце быць упэўнены, што так будзе заўсёды», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на беларускай зямлі беларусы і палякі, татары і яўрэі стагоддзямі жылі добрымі суседзямі. У гарадах і мястэчках побач, на адной плошчы, стаялі царква, касцёл, мячэць і сінагога. Унікальны гістарычны вопыт навучыў нашых людзей разумець і прымаць адзін аднаго. І сёння Беларусь з'яўляецца агульным спакойным і ўтульным домам для прадстаўнікоў 140 нацый і 25 веравызнанняў. «Дастойна вытрымаўшы ўсе выпрабаванні, беларускі народ набыў стойкі імунітэт супраць любых праяў бесчалавечных ідэалогій і поглядаў, накіраваных на падзел і знішчэнне людзей. Таму мы так цэнім мір і ўзаемапавагу паміж народамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На працягу ўсёй сваёй гісторыі Беларусь ніколі не была ініцыятарам міжнацыянальных войнаў і рэлігійных канфліктаў. У краіне створаны ўсе неабходныя ўмовы для таго, каб кожны чалавек адчуваў сябе сацыяльна абароненым, быў упэўнены ў заўтрашнім дні. «Беларускія законы не дапускаюць ніякай дыскрымінацыі па расавых, нацыянальных або рэлігійных прыметах, стаяць на варце свабоды веравызнання. Беларусь становіцца запаветнай зямлёй для людзей з розных краін, дзе разгарэліся ўзброеныя канфлікты. Тут ім гарантуюць стабільнасць і пакой, магчымасць расціць дзяцей і працаваць, захоўваць свае традыцыі і культуру», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што этнаканфесійная палітыка дзяржавы — залог грамадзянскага міру і згоды ў грамадстве. «Бо калі чалавек забяспечаны жыллём, работай, калі ў яго парадак у сям'і і да яго з павагай ставяцца навакольныя, ён ніколі не возьме ў рукі зброю і не накіруе яе на суседа іншай нацыянальнасці або веры», — перакананы Аляксандр Лукашэнка. Кожны народ мае права на ўласны шлях развіцця, самавызначэнне і захаванне гістарычнай пераемнасці. «Нельга проста ўзяць і слепа скапіраваць эканамічную і сацыяльна-палітычную мадэль, дапусцім, Захаду, насільна навязаць яе ў краінах, дзе зусім іншыя, часам больш патрабавальныя падыходы да грамадскага ўкладу, маралі, дзе прыярытэт аддаецца каштоўнасцям, выпрацаваным народам на працягу стагоддзяў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Гаворачы аб міжнароднай канферэнцыі, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што правядзенне такога форуму ў сучасных умовах вельмі неабходна і запатрабавана. «Ва ўмовах глабалізацыі рэлігійная і нацыянальная тэма часта выкарыстоўваецца ў геапалітычных мэтах. Мы бачым, як агрэсіўныя сілы цынічна парушаюць усе Божыя запаведзі, развязваюць крывавыя войны, у якіх гінуць невінаватыя людзі. Чалавецтва падышло да небяспечнай мяжы, ля якой усім неабходна задумацца: як далей будаваць адносіны паміж краінамі і народамі, як трэба вырашаць праблемы — з пазіцыі дыктату, сілы або з пазіцыі розуму, міласэрнасці і справядлівасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, сёння ў сродках масавай інфармацыі нагнятаецца сітуацыя «ў рамках так званага канфлікту цывілізацый, канфлікту паміж хрысціянскім і мусульманскім светам». «Ваш дыялог твар у твар сведчыць аб тым, што шантажыраваць і сутыкаць вас не атрымаецца нікому, нават уладным людзям. Вы дэманструеце ўсяму свету, што сёння няма ніякага канфлікту рэлігій», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ўдзел у канферэнцыі кіраўнікоў паважаных і аўтарытэтных рэлігійных аб'яднанняў Захаду і Усходу дэманструе не толькі занепакоенасць станам спраў у свеце, але і з'яўляецца выказваннем надзеі і веры, што ўсе канфесіянальныя рознагалоссі ў выніку сумеснай работы могуць быць пераадолены. Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што вопыт Беларусі ў справе пабудовы раўнапраўных, дружалюбных адносінаў прадстаўнікоў розных веравызнанняў будзе цікавы і карысны іншым дзяржавам.

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі адзначыў, што мэта гэтай канферэнцыі — у «дзейсным імкненні паказаць вобраз сапраўды адкрытай сустрэчы прадстаўнікоў усіх веравызнанняў».

«Рымска-каталіцкая царква прыкладзе максімум намаганняў у імя развіцця дыялога, здольнага даказаць усім, што Беларусь — гэта «родная хата», дзе ўсім канфесійным і этнічным групам жывецца цёпла і ўтульна, і яны адчуваюць сябе як браты і сёстры», — запэўніў Прэзідэнта Тадэвуш Кандрусевіч, мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архіепархіі.

Старшыня Аб'яднання іудзейскіх рэлігійных абшчын у Беларусі Уладзімір Малінкін падкрэсліў, што ў нашай краіне прадстаўнікі ўсіх рэлігій, у тым ліку іудзейскай, адчуваюць сябе аднолькава камфортна. «Я не адчуваю ніякай праявы антысемітызму. Тое, што ў Беларусі ў апошні час актыўна будуюцца сінагогі, сведчыць аб тым, што яўрэі хочуць жыць і нараджаць дзяцей на гэтай зямлі, дзе ім добра», — сказаў Уладзімір Малінкін.

**Паводле паведамлення прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

Фота Волькі ЛАСКІ.

**28 кастрычніка 2007 г. у рэспубліцы адмяняецца дзеянне «летняга» часу. У сувязі з гэтым 28 кастрычніка 2007 г. у 3 гадзіны стрэлкі гадзіннікаў на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пераводзяцца на адну гадзіну назад.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ХАБАР КОЛЕРУ «ХАКІ»

**Супрацоўнікі міліцыі і КДБ затрымалі падпалкоўніка Узброеных Сілаў Беларусі. Падрабязнасці гэтай скандальнай справы праваахоўныя органы пакуль не рассакрэчваюць.**

Аглядальніку «Звязды» ўдалося толькі высветліць, што афіцэр падазраецца ў хабарніцтве. Яго злавілі за руку ў момант атрымання 18 тысяч долараў. Аднак гэта была толькі частка «ганарару». Усяго ж, паводле звестак, атрыманых у праваахоўных органах, вайсковец запрасіў за свае карупцыйныя паслугі 40 тысяч долараў. Якія гэта былі паслугі, можна толькі здагадвацца, улічваючы, што затрыманы афіцэр займаўся пытаннямі тылавога забеспячэння адной з вайсковых часцей.

### «ЗАЛАТОЕ ДНО» Ў СУМЦЫ

**Больш за паўкілаграма залатых вырабаў спрабавала незаконна ўвезці з Польшчы ў Беларусь наша суайчынніца.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, памежнікі затрымалі кантрабандыстку ў пункце пропуску «Брузгі» ўжо пасля праходжання працэдуры мытнага кантролю. Вартавыя мяжы зазірнулі ў сумку нашай грамадзянкі і знайшлі там «залатое дно». У прыватнасці, жанчына нелегальна перавозіла больш за 250 найменняў залатых упрыгажэнняў агульным коштам прыкладна 25,5 млн рублёў.

### «А ЁН У РАСІЮ, ДА БРАТА ХАЦЕЎ...»

**Грамадзянін Літвы на вачах у беларускіх памежнікаў спрабаваў на поўнай хуткасці прарвацца на тэрыторыю нашай краіны.**

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, свой прарыў на аўтамабілі «Форд-Эскорт» нахабнік ажыццяўляў у пункце пропуску «Каменны Лог». Каб спыніць «гоншчыка», нашым памежнікам давялося прымяняць спецыяльны сродак пад красамоўнай назвай «Бар'ер». Свой неадэкватны ўчынак парушальнік патлумачыў тым, што вельмі спяшаўся ў госці да брата, які жыве ў Расіі. А паколькі пашпарт у яго быў пратэрмінаваны, то вырашыў паспрабаваць проста праскочыць праз пункт пропуску. Не ўдалося. Зараз свавольнік знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ЧЫНОЎНІКАЎ — ДА АДКАЗНАСЦІ!

У адносінах да былога намесніка старшыні Браслаўскага райвыканкама ўзбуджана крымінальная справа. Раней тры старшыні за знойдзеныя ў іх раёнах парушэнні па зямельных пытаннях атрымалі вымовы. Да дысцыплінарнай адказнасці таксама прыцягнуты восем старшынь райвыканкамаў і намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Парламенцкі дзённік

## УРАД АДКАЗАЎ НА ПЫТАННІ ПАРЛАМЕНТА ПРА ГАЗ, ЦЭМЕНТ І ІНШАЕ

**Урад Беларусі занепакоены тым, што 5 з 19 найважнейшых параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны не выконваюцца. Аб гэтым заявіў учора намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў, выступаючы на сумесным пасяджэнні дзвюх палат Нацыянальнага сходу.**

Не выконваецца «прагноз па тэмпах росту вытворчасці спажывецкіх тавараў, у тым ліку нехарчовых, па тэмпах росту імпарту, па сальда знешняга гандлю, па рэнтабельнасці рэалізаванай прадукцыі, прац і паслуг».

«Найбольшую занепакоенасць» выклікае сітуацыя ў знешнім гандлі таварамі і паслугамі. За студзень — жнівень аб'ём знешнегандлёвага абароту павялічыўся на 21,6 працэнта. У тым ліку экспарт — на 18,3 працэнта, імпарт — на 24,8. «Гэта неблагі вынік», але сальда знешняга гандлю «застаецца праблемай». За восем месяцаў яно склалася адмоўным у памеры амаль 1 млрд 300 млн долараў ЗША. Значны ўплыў на сітуацыю аказвае імпарт энергетычных тавараў. «З ростам цаны на газ і ўвядзеннем мытнай пошліны на нафту кошт імпарту энергатавараў рэзка ўзрос».

Андрэй Кабякоў паведаміў, што ўрад выконвае прагнозныя паказчыкі па росце пенсій. З пачатку года адбылося тры пераразлікі мінімальных працоўных і сацыяльных пенсій, а таксама надбавак да пенсій. У студзені—жніўні рэальныя даходы насельніцтва ўзраслі на 16,2 працэнта пры гадавым прагнозе 7,5—8,5 працэнта. Рэальная налічаная заработная плата за восем месяцаў павялічылася ў цэлым па краіне на 10,2 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года.

На 1 верасня ўзровень беспрацоўя ў краіне склаў 1 працэнт ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.

Андрэй Кабякоў таксама паведаміў, што сёння ў Палаце прадстаўнікоў на разглядзе знаходзіцца праект закона, які прадугледжвае павелічэнне памеру дапамогі па догляду дзіцяці да трох гадоў з 60 да 80 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## Кітайскі вектар узаемавыгаднага супрацоўніцтва

**Учора ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі сталіцы адбылося 9-е пасяджэнне Беларуска-кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.**

Паводле слоў старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Зянона Ломаця, які ўзначальвае беларускую частку камісіі, візіт кітайскіх калег у нашу краіну адбываецца на фоне поўнага ўзаемаразумення і партнёрства. Кітайскую дэлегацыю ўзначальваў намеснік міністра камерцыі КНР Юй Гуанчжоу. Акрамя афіцыйных асобаў, у пасяджэнні ўдзельнічалі прадстаўнікі буйных тэлекамунікацыйных карпарацый, прадпрыемстваў па вырабе энергаабсталявання і іншых галін эканомікі КНР.

Сёлета ў студзені—жніўні раслі паставкі у Кітай прадукцыі канцэрна «Белнафтахім», у тым ліку ў сувязі з пачаткам дзеяння ў 2007 годзе гандлёвай кампаніі «Белнафтахім Шанхай». Павялічыўся экспарт калійных угнаенняў да 184,2 млн долараў, жгута сінтэтычных нітак — да 14 млн долараў, шын — да 6,7 млн, поліамідаў — да 5,4 млн долараў.

Па выніках сямі месяцаў года аб'ём экспартных паставак арганізацый Міністэрства прамысловасці ў Кітай склаў 31 млн долараў (216 працэнтаў). ВА «БелАЗ» экспартавала ў Кітай 71 кар'ерны самазвал на суму 28,6 млн долараў.

Першыя асобы Беларуска-кітайскай камісіі адзначалі, што зараз з кампаніямі «ВОЭР» і «Юлі Юнчан» працягваюцца перамовы па стварэнні зборачных вытворчасцяў тэхнікі «Гомсельмаш». Зараз на вырабы ВА «Гомсельмаш» атрыманы сертыфікаты КНР. Гэтыя вырабы ўнесены ў каталогі перадавой сельгастэхнікі адпаведных правінцый КНР, што дазваляе кітайскім спажыўцам атрымліваць дзяржаўныя датацыі на закупку тэхнікі беларускіх машынабудаўнікоў.

Паміж кіраўніцтвам нашых краін дасягнута дамоўленасць аб выдзяленні Кітаем ільготных крэдытаў на фінансаванне беларускай эканомікі па 27 інвестыцыйных праектах на суму 2,7 млрд долараў, якія будуць ажыццяўляцца ў бліжэйшыя 2—3 гады. Інвестыцыі ў памеры 500 млн долараў запланавана накіраваць на мадэрнізацыю і рэканструкцыю трох цэментных заводаў Беларусі.

Сёння бакі працягваюць падрыхтоўку інвестыцыйных праектаў і падпісанне кантрактаў на будаўніцтва ў нашай краіне шасці заводаў, дзе будзе ажыццяўляцца вытворчасць драўнянастружкавых і драўнянавалакністых пліт. Праект ацэньваецца ў 140 млн долараў. На фінішным этапе — перамовы па праекце будаўніцтва завода па вытворчасці беленай цэлюлозы, кошт якога дасягае 200 млн долараў.

Па выніках пасяджэння Беларуска-кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ўдзельнікі мерапрыемства прынялі мемарандум, дзе бакі выказалі ўпэўненасць, што дадзенае пасяджэнне пасадзейнічае больш якаснай падрыхтоўцы пытанняў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў рамках наступнага візіту Прэм'ера Дзяржаўнага Савета КНР Вэнь Цзябао ў нашу краіну.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ДЭПАЗІТЫ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА

**На працягу года, як адзначалася на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка, захоўвалася пазітыўная тэндэнцыя павелічэння дэпазітаў насельніцтва, чаму ў многім садзейнічала працэнтная палітыка, якая праводзіцца галоўнай фінансавай установай.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі Нацбанка, калі на 1 студзеня 2007 года ў сяроднім на аднаго жыхара краіны прыходзілася 820 тысяч рублёў зберажэнняў, размешчаных у банкаўскіх укладах, аблігацыях і зберагальных сертыфікатах (што было эквівалентна 384,6 долара ЗША), дык на 1 кастрычніка — 1013,9 тысячы рублёў (у эквіваленце гэта складае 471,8 долара ЗША). Доля праблемных актываў банкаў у актывах, падвержаных крэдытнай рызыцы, зменшылася з 2,83 працэнта на пачатак года да 2,04 працэнта на 1 кастрычніка (індыкатыўны параметр — не больш за 4 працэнты). Доля праблемнай запазычанасці кліентаў і банкаў у агульнай суме крэдытнай запазычанасці па банкаўскім сектары зменшылася з 1,16 працэнта да 0,81 працэнта (індыкатыўны параметр — не больш за 2 працэнты).

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## Навука і інавацыі

У сталіцы працягваюцца мерапрыемствы, якія праводзяцца ў рамках арганізацыі першага з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь

**25—26 кастрычніка ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі працавала міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Новая якасць эканамічнага росту: інавацыі, інвестыцыі, канкурэнтаздольнасць». Яе арганізатарамі выступілі Інстытут эканомікі НАН Беларусі, Навукова-даследчы эканамічны інстытут Міністэрства эканомікі, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт.**

У праграме было прадугледжана правядзенне пленарнага пасяджэння і работа па секцыях: «Сучасныя тэорыі эканамічнага росту», «Макраэканамічныя ўмовы і фактары эканамічнага росту» і інш. 26 кастрычніка на факультэце міжнародных адносінаў БДУ адбыўся «круглы стол» на тэму «Інавацыі і эканамічны рост».

З 30 кастрычніка па 2 лістапада ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭКСПА» пройдзе выстава «Навука і інавацыі Беларусі». У ёй возьмуць удзел каля 90 арганізацый з 12 ведамстваў. Асноўныя тэматычныя накірункі: інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, лазерныя тэхналогіі і ўстройствы, новыя матэрыялы і вырабы з іх, абсталяванне і тэхналогіі для аграрнага сектара і будаўніцтва, медыцына і ветэрынарыя, экалогія. На выставе будуць прадстаўлены больш за 500 распрацовак беларускіх вучоных.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении торгов 30 ноября 2007 года

**Открытое акционерное общество "МАПИД" (Продавец) совместно с УП "Минский городской центр недвижимости" (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 107 по ул. Притыцкого в г. Минске**

**(при строительстве дома применены энергосберегающие технологии)**

| № лота | Наименование объекта: № квартиры | количество комнат | этаж | подъезд | Площадь, кв.м: общая | жилая | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 4 | 3 | 1 | 1 | 77,8 | 46,5 | 171 549 000 | 17 154 900 |
| 2 | 5 | 3 | 2 | 1 | 77,9 | 45,1 | 171 769 500 | 17 176 950 |
| 3 | 6 | 2 | 2 | 1 | 55,1 | 29,3 | 121 495 500 | 12 149 550 |
| 4 | 7 | 2 | 2 | 1 | 54,8 | 29,2 | 120 834 000 | 12 083 400 |
| 5 | 8 | 3 | 2 | 1 | 77,7 | 45,1 | 171 328 500 | 17 132 850 |
| 6 | 9 | 3 | 3 | 1 | 78,4 | 45,4 | 172 872 000 | 17 287 200 |
| 7 | 10 | 2 | 3 | 1 | 55,1 | 29,3 | 121 495 500 | 12 149 550 |
| 8 | 11 | 2 | 3 | 1 | 55,2 | 29,3 | 121 716 000 | 12 171 600 |
| 9 | 12 | 3 | 3 | 1 | 77,6 | 45,0 | 171 108 000 | 17 110 800 |
| 10 | 13 | 3 | 4 | 1 | 78,1 | 45,3 | 172 210 500 | 17 221 050 |
| 11 | 14 | 2 | 4 | 1 | 55,0 | 29,3 | 121 275 000 | 12 127 500 |
| 12 | 15 | 2 | 4 | 1 | 55,0 | 29,2 | 121 275 000 | 12 127 500 |
| 13 | 16 | 3 | 4 | 1 | 77,6 | 45,0 | 171 108 000 | 17 110 800 |
| 14 | 17 | 3 | 5 | 1 | 78,2 | 45,4 | 172 431 000 | 17 243 100 |
| 15 | 18 | 2 | 5 | 1 | 55,0 | 29,2 | 121 275 000 | 12 127 500 |
| 16 | 19 | 2 | 5 | 1 | 54,9 | 29,2 | 121 054 500 | 12 105 450 |
| 17 | 20 | 3 | 5 | 1 | 77,7 | 45,0 | 171 328 500 | 17 132 850 |
| 18 | 21 | 3 | 6 | 1 | 78,1 | 45,3 | 172 210 500 | 17 221 050 |
| 19 | 22 | 2 | 6 | 1 | 54,9 | 29,1 | 121 054 500 | 12 105 450 |
| 20 | 23 | 2 | 6 | 1 | 55,1 | 29,2 | 121 495 500 | 12 149 550 |
| 21 | 24 | 3 | 6 | 1 | 77,9 | 45,2 | 171 769 500 | 17 176 950 |
| 22 | 25 | 3 | 7 | 1 | 78,2 | 45,4 | 172 431 000 | 17 243 100 |
| 23 | 26 | 2 | 7 | 1 | 55,0 | 29,2 | 121 275 000 | 12 127 500 |
| 24 | 27 | 2 | 7 | 1 | 55,1 | 29,2 | 121 495 500 | 12 149 550 |
| 25 | 28 | 3 | 7 | 1 | 77,8 | 45,1 | 171 549 000 | 17 154 900 |
| 26 | 29 | 3 | 8 | 1 | 78,0 | 45,2 | 171 990 000 | 17 199 000 |
| 27 | 30 | 2 | 8 | 1 | 55,2 | 29,3 | 121 716 000 | 12 171 600 |
| 28 | 31 | 2 | 8 | 1 | 55,1 | 29,2 | 121 495 500 | 12 149 550 |
| 29 | 32 | 3 | 8 | 1 | 77,9 | 45,2 | 171 769 500 | 17 176 950 |
| 30 | 34 | 2 | 9 | 1 | 55,1 | 29,2 | 121 495 500 | 12 149 550 |

**Извещение о проведении торгов 30 ноября 2007 года**

**Открытое акционерное общество «МАПИД» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартиры без отделки в доме № 49 по ул. Притыцкого в г. Минске**

| № лота | Наименование объекта: № квартиры | количество комнат | этаж | подъезд | Площадь, кв.м: общая | жилая | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 31 | 82 | 3 | 9 | 3 | 77,7 | 45,0 | 147 630 000 | 14 763 000 |

Аукцион состоится 30 ноября 2007 г. в 11.00 в театральном зале Центрального Дома офицеров по адресу: г. Минск, ул. Красноармейская, 3.

К участию в аукционе допускаются физические лица — граждане Республики Беларусь.

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: 1) задатка в сумме 10 % начальной цены; 2) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы.

Если участник аукциона выражает желание участвовать в торгах по нескольким объектам, задаток вносится в размере 10 % от стоимости объекта с наибольшей начальной ценой.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель — паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

Внесение необходимых для участия в аукционе платежей осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНН 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня подачи заявления на возврат задатка или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с Условиями проведения аукциона и объектом. Оплата за приобретенную на аукционе квартиру производится в течение 25 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 14 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона КУП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за квартиры обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату за подготовку и проведение аукциона УП «Минский городской центр недвижимости» сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 29 ноября 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник — четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 29 ноября 2007 г. до 17.00 включительно. Телефоны для справок: 227 40 22; 227 48 36. Для осмотра квартир необходимо обращаться по телефонам: 207 19 15; 207 14 77.

Интернет: www.mgcn.by.

КУП «Слуцкое ЖКХ» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже зданий, расположенных: г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 13 в/г, в том числе: лот № 1 — здание склада (общ. пл. 705,2 кв. м). Пл. зем. участка 0,2873 га. Начальная цена — 57 305 581 бел. руб. и лота № 1 — здание склада (общ. пл. 698, 4 кв. м). Пл. зем. участка 0,2961 га. Начальная цена — 54 540 838 бел. руб. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Объекты продаются без условий. Переход права пользования земельными участками будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 27.11.2007 г. в 15.00 по адресу: г. Слуцк, ул. Пионерская, 23. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, (8 01795) 5 23 88.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПУЦІН АФІЦЫЙНА СТАЎ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ

**У пятніцу прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін афіцыйна стаў кандыдатам у дэпутаты Дзярждумы: Цэнтрвыбаркам зарэгістраваў федэральны спіс партыі «Адзіная Расія», які ўзначальвае прэзідэнт РФ.**

ЦВК абнародавала звесткі аб даходах адзінарасаў. Агульны прыбытак Уладзіміра Пуціна за 2006 год склаў 2 млн 11 тыс. 611 рублёў 28 капеек. Ва ўласнасці прэзідэнта знаходзяцца ўчастак плошчай 15 сотак у Маскоўскай вобласці і кватэра ў Санкт-Пецярбургу плошчай 77,7 квадратнага метра. На прэзідэнта зарэгістравана дзве «Волгі» — ГАЗ М-21 і ГАЗ М-21Р (1960 і 1965 гадоў выпуску), а таксама прычэп «Скіф» 1987 года. Адзначаецца, што машыны Пуціну дасталіся ў спадчыну ад бацькі і іх перарэгістрацыя не праводзілася. Акрамя гэтага, паводле звестак ЦВК, на рахунках прэзідэнта ў Ашчадным банку Расіі ляжаць 3 млн 83 тыс. 219 рублёў 34 капейкі, у банку ВТБ — 563 тыс. 763 рублі 35 капеек, а ў Балтыйскім банку — 53 тыс. 317 рублёў 50 капеек. Таксама Пуцін валодае 230 акцыямі Банка «Санкт-Пецярбург».

### ПАРЛАМЕНТ ЧЭХІІ АДМОВІЎСЯ ПРАВОДЗІЦЬ РЭФЕРЭНДУМ ПА ПРА ЗША

**Парламент Чэхіі не падтрымаў прапанову правесці рэферэндум па пытанні размяшчэння ў краіне радара амерыканскай проціракетнай абароны. З патрабаваннямі параіцца з народам наконт гэтага важнага для краіны пытання выступілі дэпутаты ад апазіцыйнай сацыял-дэмакратычнай партыі.**




Ім не ўдалося пераканаць сваіх калег, нягледзячы на падтрымку прадстаўніка кіруючага Хрысціянска-дэмакратычнага саюза спадара Гаворкі. Для прыняцця рашэння ў падтрымку рэферэндуму выказаліся толькі 76 дэпутатаў пры неабходных 120 галасах.

Апытанні жыхароў Чэшскай Рэспублікі паказваюць, што за правядзенне рэферэндуму па пытанні размяшчэння элементаў ПРА на тэрыторыі Чэхіі выказваюцца 70 працэнтаў жыхароў краіны. У сувязі з гэтым апазіцыйныя партыі абвінавачваюць урад Мірэка Тапаланека ў ігнараванні інтарэсаў чэхаў.

### ПАСМА ВАЛАСОЎ ЧЭ ГЕВАРЫ ПРАДАДЗЕНА ЗА $100 ТЫСЯЧ

**Пасма валасоў, зрэзаная з галавы забітага Чэ Гевары ў 1967 годзе, у чацвер была куплена на аўкцыёне ў Даласе за 100 тысяч долараў.**

Як паведамляецца, яе ўладальнікам стаў гаспадар кніжнай крамы непадалёк ад Х'юстана, які лічыць Чэ «адным з найвялікшых рэвалюцыянераў XX стагоддзя». 61-гадовы Біл Батлер, які калекцыяне прадметы 60-х гадоў, быў адзіным прэтэндэнтам на лот. Ён плануе ўпрыгожыць ровікіяй сваю краму.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.10.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 151,00 |
| 1 еўра | 3 090,88 |
| 1 латвійскі лат | 4 401,92 |
| 1 літоўскі літ | 895,19 |
| 1 чэшская крона | 114,32 |
| 1 польскі злоты | 852,07 |
| 1 расійскі рубель | 86,83 |
| 1 украінская грыўня | 426,02 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,7722 |
| 10 UAH | 49,0112 |
| 1000 BYR | 11,5052 |
| EUR | 35,5580 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 26.10.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў удзельнікаў фестывалю тэатральнага мастацтва «Панарама» з адкрыццём форуму

**Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

«Прытрымліваючыся свайго высакароднага дэвіза «Тэатр без межаў», фестываль разгортвае перад гледачамі маштабную панараму сучаснага сцэнічнага мастацтва, аб'ядноўвае праслаўленых майстроў і творчую моладзь розных краін», — гаворыцца ў пасланні. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што гэта свята ўнясе свой дастойны ўклад у захоўванне і развіццё цудоўных традыцый айчыннага і сусветнага тэатра, заснаваных на ідэалах дабра, гуманізму і духоўнасці.

## Беларусь зацікаўлена ў развіцці эканамічнай інтэграцыі ў СНД

**Аб гэтым сказаў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы са старшынёй Выканаўчага камітэта — выканаўчым сакратаром СНД Сяргеем Лебедзевым.**

Прэм'ер-міністр адзначыў, што ўрад зацікаўлены ў развіцці знешняга гандлю ў Садружнасці. «Мы выходзім з пазіцыі роўнага доступу да рынку, роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання», — сказаў прэм'-ер. Ён таксама адзначыў неабходнасць максімальнай скаардынаванасці пытання ўступлення краін СНД у СГА, каб «на рынкі трэціх краін мы ўваходзілі з роўнымі правамі».

## Расія перанесла тэрмін увозу малочнай прадукцыі з атэставаных прадпрыемстваў Беларусі на 1 сакавіка 2008 года

**Беларускія малакаперапрацоўчыя прадпрыемствы да 1 сакавіка 2008 года могуць бесперашкодна экспартаваць сваю прадукцыю ў расійскія рэгіёны, не чакаючы афіцыйнага заключэння атэстацыі Рассельгаснагляду.**

Цяпер усе малочныя прадпрыемствы Беларусі, у якіх высокі экспартны патэнцыял сыравіны і гатовай прадукцыі, маюць права рэалізоўваць яе ў Расію па заключаных кантрактах, дасягнутых дамоўленасцях.

**БЕЛТА.**

# УРАД АДКАЗАЎ НА ПЫТАННІ ПАРЛАМЕНТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гаворачы пра планы змяншэння падатковага заканадаўства ў 2008 годзе, намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што ўрад мае намер адмяніць падатак з карыстальнікаў аўтадарог, які спаганяецца па стаўцы 1 працэнт з выручкі ад рэалізацыі тавараў. «Выпадаючыя даходы» павінны быць кампенсаваныя за кошт «адэкватнага павелічэння стаўкі ПДВ з 18 да 20 працэнтаў».

Адказваючы на пытанні парламентарыяў, намеснік прэм'ер-міністра заявіў, што зараз вядуцца перамовы аб кошце расійскага газу на 2008 год. Пры гэтым ён не змог назваць мяркуемы кошт газу да заканчэння перамоў. Андрэй Кабякоў дадаў, што налета не выключаецца магчымасць павышэння тарыфаў на цеплавую і электраэнергію. Аднак велічыня гэтага павелічэння «залежыць ад перамоўнага працэсу» з Расіяй аб кошце энерганосьбітаў, які зараз ідзе.

Першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Міхаіл Абрамчук паведаміў, што сёлета заводы краіны павялічылі вытворчасць цэменту ў параўнанні з мінулым годам. Пры гэтым летась на экспарт было прададзена больш за 800 тыс. тон, а ў айчынны гандаль пастаўлена ўсяго каля 70 тыс. тон цэменту. Сёлета ж планавалася накіраваць на экспарт 400 тыс., а ў гандаль — 200 тыс. тон. У той жа час на 1 кастрычніка ў гандаль было пастаўлена 250 тыс. тон і да канца года плануецца паставіць яшчэ 50 тыс. Пры гэтым айчынныя заводы фасуюць цэмент сёння «толькі ў 25 і 50-кілаграмовыя мяхі».

«Мы адсочваем наяўнасць цэменту ў абласцях і Мінску. Паводле нашых даных, штодзень у гандлі не бывае менш за 200-250 тон цэменту».

Міністр фінансаў Мікалай Корбут паведаміў журналістам ў парламенце, што ўрад разглядае зараз магчымасць павелічэння да канца 2007 года тарыфнай стаўкі першага разраду. Акрамя таго, у лістападзе — снежні можа быць прынята рашэнне аб павышэнні некаторых відаў пенсій.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

## ЛОМ ПАД ВЫГЛЯДАМ ШКЛОВАТЫ

**Самую буйную за апошнія гады партыю лому каляровых металаў затрымалі супрацоўнікі Віцебскай мытні сумесна з аператыўнікамі абласнога ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй.**

Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, больш за 40 тон лому расіянін і беларус спрабавалі вывезці ў РФ на двух грузавых аўтамабілях. Кантрабандысты «экспартавалі» каляровыя металы пад выглядам запасных частак і абсталявання да станкоў, а таксама уцяпляльных плітаў са шкловаты. Менавіта такія суправаджальныя дакументы яны прад'явілі мытнікам і міліцыянерам. Аднак пры аглядзе транспартных сродкаў у грузавых адсеках была знойдзена вялікая партыя лому каляровых металаў коштам 60 млн рублёў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## СА СВЯТАМ, КАМСАМОЛ!

**У панядзелак, 29 кастрычніка, будзе варта ўзгадаць, што менавіта ў гэты дзень 89 гадоў назад нарадзіўся камсамол, з якім звязаны жыццё і лёс больш як 160 мільёнаў савецкіх людзей.**

У іх жыцці былі ўсесаюзныя камсамольскія будоўлі і будатрады, спартыўныя рэкорды і песніля вогнішча. Самыя лепшыя камсамольскія традыцыі ў нашай краіне захаваў правапераемнік камсамола — Беларускі Рэспубліканскі Саюз Моладзі.

У дзень нараджэння камсамола ў Рэспубліканскім Доме моладзі адбудзецца святочная сустрэча ветэранаў камсамольскага і маладзёжнага руху пад назвай «Гэта наша з табой біяграфія». У гэты дзень збяруцца разам маладзёжныя лідары некалькіх пакаленняў. Гэтая сустрэча і ёсць тая непарыўная сувязь, якая, безумоўна, дасць новы імпульс у рабоце, новыя ідэі, праекты і справы.

Дарэчы, сёлета БРСМ арганізуе рэспубліканскую маладзёжную працоўную акцыю «Моладзь. Традыцыі. Будучыня». Яна праводзіцца па ўсёй краіне, а завершыцца ў 2008-м, калі будзе 90-годдзе камсамола.

Сродкі, якія ўдзельнікі акцыі заробяць сваёй працай, будуць накіраваны на рэканструкцыю Камсамольскага возера і добраўпарадкаванне тэрыторыі побач з ім.

**Ірына АНАТАВА.**

# ЯК ПРЫЦЯГНУЦЬ ІНВЕСТАРА Ў АПК?

**Прадпрыемствы льнаперапрацоўкі — сёння самыя праблемныя ў сельскай гаспадарцы. Іх рэнтабельнасць — мінус 50 — мінус 70 працэнтаў. Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Іван Бамбіза, выступаючы перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу падчас тэматычнай вучобы парламентарыяў, прысвечанай праблемам АПК.**

«У рэспубліцы няма больш ніводнага віду прадпрыемстваў, якія б пры такой мінусавой рэнтабельнасці вялі фінансавую дзейнасць», — дадаў ён. Пры гэтым дзяржава вымушана накіроўваць значныя сродкі, каб падтрымаць галіну.

Іван Бамбіза дадаў, што ў бліжэйшы час павінна адбыцца «даволі прадметнае» абмеркаванне сітуацыі ў кіраўніка дзяржавы. «Урад рыхтуе свае прапановы наконт стварэння ўмоў, якія зацікавілі б сельгасвытворцаў займацца вытворчасцю льноваланка».

Гаворачы пра сітуацыю ў цукровай галіне, Іван Бамбіза адзначыў, што праца беларускіх прадпрыемстваў «выроўніваецца» пасля падпісаных з Расіяй пагадненняў (у якіх беларускі бок прымае на сябе самаабмежаванні ў пастаўках цукру). І прадпрыемствы «будуць працаваць з прыбыткам».

Нядаўна быў зацверджаны тыпавы праект пяціпавярховага шматкватэрнага жылога дома (на 20 кватэр) для будаўніцтва ў вёсцы. Паводле слоў намесніка прэм'ер-міністра, завершана таксама распрацоўка тыпавога праекта аднакватэрнага пяціпакаёвага эканамічнага жылога дома для шматдзетнай сям'і. Усяго ж сёння налічваецца больш за 60 тыпавых праектаў жылых дамоў, якія могуць быць прапанаваны забудоўшчыкам у сельскагаспадарчых прадпрыемствах. Што датычыцца ўводу жылля ў вёсцы ў 2007 годзе, то заданне, паводле слоў Івана Бамбізы, будзе выканана на 100 працэнтаў.

Сёлета на пастаянную працу было ўладкавана каля 19 тыс. жыхароў сельскай мясцовасці. Пры гэтым было створана 465 новых працоўных месцаў з дапамогай дзяржаўных структур.

Была таксама аказана дапамога 310 беспрацоўным у арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці ў вёсцы. Паводле слоў Івана Бамбізы, гадавое заданне па дадзеным паказчыку выконваецца. У той жа час, «улічваючы тое, што ў краіне існуе амаль 24 тыс. сельскіх населеных пунктаў, гэта вельмі мала».

Намеснік прэм'ер-міністра паведаміў таксама, што на 1 кастрычніка з 363 кантрольных заданняў, якія павінны быць выкананы сёлета па Праграме адраджэння і развіцця вёскі, было выканана 94, або 26 працэнтаў. Іван Бамбіза заклікаў дэпутатаў не палохацца гэтай лічбы, бо «большасць мерапрыемстваў зараз знаходзяцца ў стадыі выканання» і вынікі будуць падведзены пасля заканчэння года.

Урад падрыхтаваў праект Дэкрэта Прэзідэнта, які накіраваны «на развіццё сельскіх тэрыторый». Дакумент, паводле слоў Івана Бамбізы, ужо ўзгоднены з усімі зацікаўленымі міністэрствамі і перададзены на разгляд кіраўніка дзяржавы.

«Дэкрэт накіраваны не на выдзяленне дадатковых сродкаў на развіццё сельскіх тэрыторый і сельскагаспадарчай вытворчасці, а на стварэнне эканамічных перадумоў, каб інвестары прыйшлі на вёску і стваралі новыя працоўныя месцы, падтрымлівалі вытворчасць». Галоўным механізмам прыцягнення інвестараў павінны стаць падаткавыя льготы.

Сёння таксама «разглядаецца пытанне аб пашырэнні» ранейшых указаў Прэзідэнта, якія былі накіраваны на перадачу стратных гаспадарак прамысловым арганізацыям і іншым суб'ектам гаспадарання. Гэтыя дакументы давалі інвестарам адтэрміноўкі па выплаце запазычанасцяў гаспадарак, падаткавыя льготы.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**
*Мінская вобласць.*

### ШТО ЧАКАЕ РЫНАК МАЛОЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ?

***Па просьбе карэспандэнта «Звязды» старшыня Палаты прадстаўнікоў Вадзім ПАПОЎ пракаментаваў падчас вучобы дэпутатаў сітуацыю, якая складваецца на рынку малочнай прадукцыі, а таксама меры, якія можа прадпрыняць дзяржава для папярэджання дэфіцыту:***

***— Рост вытворчасці малочнай прадукцыі сёлета ў нас склаў больш за 8 працэнтаў. І ніякіх крызісных з'яў на ўнутраным рынку з-за вытворчасці і перапрацоўкі няма.***

***Ёсць праблемы ў суседніх дзяржавах. Напрыклад, у Расіі. Але гэта звязана не толькі з павышэннем цэнаў на малочную і мясную прадукцыю ў еўрапейскіх дзяржавах, але і з палітычнымі кампаніямі ў Расіі і ва Украіне. Больш трывогі ў нас выклікае сітуацыя ў Расіі. З-за таго, што мы маем празрыстую мяжу, павышэнне цэнаў у Расіі, безумоўна, адаб'ецца на нашым рынку. Адток прадукцыі можа быць.***

***Урад вызначае меры. У прыватнасці, падтрымкі АПК, каб прадпрыемствы маглі дадаткова вырабіць і прадаць прадукцыю, якая не патрэбна нашаму насельніцтву...***

***Выказваць апасенні, што наш рынак харчавання можа рухнуць, падстаў пакуль няма. Расія прыняла меры для зніжэння ўвазных мытных пошлін. Таму, мяркую, гэтым скарыстаюцца прадпрыемствы Украіны, краін Балтыі, іншых дзяржаў, якія мяжуюць з Расіяй. І яны дапамогуць зняць вастрыню праблемы.***

## Спажывец

# ГРОШЫ НА ВЕЦЕР. ЦІ ЗНОЎ У КІШЭНЮ?

**Пераважная большасць з нас наведвае крамы літаральна штодня, прычым статыстыка сведчыць, што сярэднестатыстычны грамадзянін нашай краіны з кожным годам набывае ўсё больш як харчовых, так і нехарчовых тавараў. Аднак таксама не сакрэт: разам з павелічэннем аб'ёмаў продажу расце і колькасць «няўдалых» пакупак. І перш-наперш — на рынках. Між тым, як адстаюць свае правы на якасную прадукцыю, на што звяртаць увагу пры выбары той або іншай рэчы ў першую чаргу і як быць у сітуацыі, калі прадавец адмаўляецца прыняць тавар назад з вяртаннем грошай? Гэтыя і іншыя пытанні сталі асноўнай тэмай чарговай «прамой лініі» Беларускага радыё і газеты «Звязда» з удзелам прадстаўнікоў Мінскага таварыства спажыўцоў — галоўнага спецыяліста па даследаванні абутку Наталлі Бежнар і юрысконсульта Аляксея Лучанка.**

### АСОБНЫЯ ЗАКОНЫ ДЛЯ БЕЛНЭТУ

Як сведчыць аналіз, на першым месцы па колькасці скаргаў апошнім часам трывала «замацаваліся»... мабільныя тэлефоны. І, у прыватнасці, апараты, што прадаюцца праз распаўсюджаныя ў буйных гарадах Інтэрнэт-крамах. Як засцерагчыся ад непрыемнасцяў у такім выпадку?

— Галоўная парада ў такой сітуацыі — настойліва папрасіць у кур'-ера Інтэрнэт-крамы касавы чэк або ў крайнім выпадку звычайную распіску, якую, дарэчы, зусім не абавязкова завяраць у натарыуса, — адзначае Аляксей Лучанок. — Апроч таго, ні ў якім разе нельга забывацца на гарантыйны талон, прычым у такім талоне павінна стаяць пячатка менавіта прадаўца, а не рамонтнай майстэрні. Нарэшце, вазьміце асабістыя даныя непасрэдна кур'ера, папрасіце яго паказаць калі не пашпарт або службовае пасведчанне, то хоць бы пасведчанне на права кіраваць аўтамабілем. У сваю чаргу атрыманне гэтых звестак і будзе дадатковай «падстрахоўкай». Прынамсі, на падставе іх у выпадку выяўлення тых ці іншых недахопаў «мабільніка» ў пакупніка з'явіцца падставы патрабаваць вяртання кошту няякаснага тавару.

### УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЗАЯВЫ

Калі складаць своеасаблівы «рэйтынг папулярнасці» няякасных тавараў, то на другім месцы ў ім акажацца абутак. Прычым перш-наперш такі малюнак складваецца ў перыяды змены сезонаў. Дарэчы, статыстыка сведчыць, што ў сярэднім грамадзянін нашай краіны набывае ў год недзе 3—4 пары. І пры гэтым далёка не заўсёды ў крамах.

— Многія проста не ведаюць, што тэрмін прыгоднасці і гарантыйны тэрмін — зусім не адно і тое ж, — заўважае Наталля Бежнар. — Паводле Закона «Аб абароне правоў спажыўца», тэрмін прыгоднасці абутку ў нашай краіне вызначаны ў два гады. Інакш кажучы, на працягу менавіта гэтых двух гадоў да прадаўца можна прад'яўляць прэтэнзіі па якасці. А вось якім будзе сам механізм гэтага прад'яўлення — гэта ўжо шмат у чым залежыць ад гарантыйных абавязацельстваў.

Для пачатку варта падкрэсліць: пры куплі абутку ў крамах, дзе наяўнасць сертыфіката адпаведнасці з'яўляецца абавязковай, гарантыйны тэрмін складае ад 45 да 70 дзён. А вось пры куплі на рынку ў індывідуальнага прадпрымальніка, які мець сертыфікат адпаведнасці не павінен, гарантыя вызначаецца непасрэдна прадаўцом. І, як правіла, гаворка тут ідзе аб 14 або 30 днях.

— У любым выпадку пры выяўленні праблем з абуткам у межах тэрміну прыгоднасці пакупнік павінен звярнуцца да прадаўца менавіта з пісьмовай заявай, дзе тлумачацца прычыны вяртання тавару і ўтрымліваецца патрабаванне аб кампенсацыі ўрону. Прычым калі заяву прыняць адмаўляюцца, то можна паслаць яе на імя індывідуальнага прадпрымальніка ў заказным пісьме з паведамленнем аб уручэнні або проста паскардзіцца адміністрацыі рынку, — працягвае Наталля Бежнар. — Далей жа, на працягу 7 дзён пасля атрымання заявы, прадавец павінен прыняць рашэнне — вярнуць грошы або накіраваць абутак на экспертызу. Пры гэтым, калі заява паступіла ў межах гарантыйнага тэрміну, экспертыза будзе праводзіцца за кошт прадаўца. А калі ўжо за межамі гарантыі — за кошт пакупніка.

У сярэднім паслугі эксперта сёння ацэньваюцца прыкладна ў 50 тыс. рублёў. Аднак гэтыя грошы можна вярнуць. У выпадку прызнання прэтэнзій да якасці абутку абгрунтаванымі, прадавец павінен будзе аплаціць кошт экспертызы разам з коштам тавару. Важна толькі захаваць касавы чэк, гарантыйны талон, што пацвярджае куплю менавіта ў гэтым гандлёвым пункце, ці ў крайнім выпадку — каробку. У прыватнасці, звычайна на кожнай каробцы пазначаецца нумар, што даецца падатковай інспекцыяй кожнаму канкрэтнаму прадаўцу.

— Зразумела, сама па сабе працэдура вяртання грошай патрабуе шмат часу і нерваў, таму лепш за ўсё — праявіць пільнасць падчас куплі, — зазначае Наталля Бежнар. — Скажам, калі вам прапануюць «танныя італьянскія боты», ёсць сэнс добра падумаць. Бо, па-першае, гандлёвых пунктаў, дзе ёсць сапраўдны абутак з гэтай краіны, у нас не так і шмат. А, па-другое, само па сабе прывабнае слова «танны» можа аказацца пасткай і азначаць на справе, што на паліцы ляжыць «сток», рэчы, што былі выраблены шмат гадоў таму. Таму ў працэсе выкарыстання пачнецца іх хуткае разбурэнне, напрыклад, стануць рызыходзіцца швы ці адклейвацца падэшва.

### ДВА ТЫДНІ НА РОЗДУМ

Купіў, прымераў дома яшчэ раз і... пашкадаваў. Сітуацыя тыповая. Між тым, з яе ёсць выйсце. Як падкрэсліваюць у таварыстве абароны спажыўцоў, на працягу 14 дзён пакупнік мае поўнае права проста вярнуць новае адзенне ці абутак і запатрабаваць вяртання сваіх грошай. І прычым зрабіць гэта нават пры адсутнасці якіх-небудзь заўваг па якасці.

Праўда, падобны варыянт усё ж можна выкарыстаць далёка не заўсёды. Да прыкладу, паводле пастановы ўрада, вяртанню не падлягаюць якасныя дзіцячыя цацкі. І ў тым ліку цацкі, што знаходзяцца ва ўпакоўцы.

### КВЕТКІ — ТАКСАМА ТАВАР

Крыху незвычайнае пытанне і тым не менш: ці можна вярнуць назад кветкі?

— Артыкул 19 Закона «Аб абароне спажыўцоў» дае права звярнуцца да прадаўца з патрабаваннем вярнуць грошы або зрабіць замену няякаснага тавару, — тлумачыць Аляксей Лучанок. — Прычым гэта датычыцца і кветак — яны таксама з'яўляюцца таварам. Праўда, таварам даволі спецыфічным, таму пакупнікам, якія маюць намер прад'явіць прэтэнзіі па якасці, трэба дзейнічаць вельмі хутка.

### КАМУ ПЛАЦІЦЬ ЗА СЛОІК?

Чым больш харчовых крамаў працуюць у рэжыме самаабслугоўвання, тым часцей выпадае сутыкацца з праблемай... выпадкова разбітых слоікаў. І ўсё ж ці павінен плаціць за іх пакупнік?

— У дадзеным выпадку трэба выходзіць з сітуацыі, — зазначае Аляксей Лучанок. — Бо адна справа — наўмыснае знішчэнне тавару. У такім разе плаціць сапраўды давядзецца, і ў тым ліку, калі «вінаватымі» аказаліся грамадзяне ў стане алкагольнага ап'янення або дзеці. Аднак калі слоік ці бутэлька разбіліся з-за таго, што чалавек іх выпадкова зачапіў, кампенсацыя страт звычайна перакладваецца на прадаўца. Прынамсі, у любым судзе можна лёгка даказаць, што прычынай надзвычайнага здарэння стала няправільнае размяшчэнне тавару на паліцах.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Спорт-тайм

### «РУСЕНБОРГ» ПЕРАМОГ «ВАЛЕНСІЮ»

**Удзельнікі групавога турніру Лігі чэмпіёнаў пераадолелі палову дыстанцыі — завяршыліся ўсе матчы трэцяга тура. У групе «А» французскі «Марсель» дома ўнічыю згуляў з партугальскім «Порту» — 1:1.**

Марсельцы напарадзе з 7 ачкамі, а ў іх сапернікаў на два менш. Англійскі «Ліверпуль» прайграў на выездзе турэцкаму «Бешыкташу» — 1:2. У групе «В» англійскі «Чэлсі» не дазволіў нямецкаму «Шальке-04» забіць гол у варотаў на сваім полі — 2:0. Лонданцы лідзіруюць з 7 ачкамі. Другую пазіцыю нечакана заняў нарвежскі «Русенборг» (4 ачкі), які святкаваў хатнюю перамогу над іспанскай «Валенсіяй» — 2:0. У кватэрце «С» родны газон дапамог выйграць гаспадарам поля. Іспанскі «Рэал» засмуціў грэчаскі «Алімпіякос» — 4:2, а нямецкі «Вердэр» — італьянскі «Лацыо» — 2:1. У мадрыдскай каманды 7 ачкоў, на тры менш у афінян. У групе «D» першае паражэнне ў данецкага «Шахцёра». Украінцы ўступілі ў гасцях у італьянскаму «Мілану» — 1:4. Каманды набралі па 6 ачкоў. Партугальская «Бенфіка» перамагла «Селцік» у Лісабоне — 1:0.

### ГУРЭНКА ЗАСТАЕЦЦА Ў «ЛАКАМАТЫВЕ»

**Беларускі футбаліст Сяргей Гурэнка застаецца ў маскоўскім «Лакаматыве» яшчэ на сезон. 35-гадовага паўабаронцу хацеў набыць клуб «Хімкі», аднак ігрок аддаў перавагу чыгуначнікам.**

7 лістапада «Лакаматыў» прыме на сваім полі мадрыдскі «Атлетыка» ў стартавым матчы групавога этапа Кубка УЕФА. Нагадаем, што Гурэнка доўгі час з'яўляўся капітанам нацыянальнай зборнай Беларусі, за якую правёў 80 матчаў. У спісе яго ўзнагарод «золата», «срэбра», «бронза» чэмпіяната Расіі, перамогі ў розыгрышах кубку Расіі і Іспаніі.

### ФРЭЙЗЕР НАЗІРАЕ ЗА ХАКЕІСТАМІ ЗБОРНАЙ

**Капітан нацыянальнай хакейнай зборнай Алег Антоненка, які выступае за падмаскоўны МУС, вярнуўся на лёд пасля траўмы і вызначыўся галавой перадачай паядынку са сталічным «Дынама» (2:1 па булітах).**

Дарэчы, гэтымі днямі галоўны трэнер нашай «нацыяналкі» прысутнічае на гульнях расійскай суперлігі. Курт Фрэйзер назірае за гульнёй вратара «Металурга» Андрэя Мезіна і нападаючага «Салавата Юлаева» Канстанціна Кальцова.

### НОВАЯ ФОРМУЛА ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ

**На нарадзе кіраўнікоў нацыянальных федэрацый вядучых хакейных краін свету і Міжнароднай федэрацыі хакея з шайбай была прынята новая формула правядзення чэмпіянату свету.**

Колькасць зборных вышэйшага дывізіёна скараціцца з 16 да 14. Таксама адменена правядзенне Кубка свету па хакеі.

### ФУТБАЛІСТА ДЫСКВАЛІФІКАВАЛІ ПАЖЫЦЦЁВА

**Дысцыплінарны камітэт беларускай федэрацыі футбола пажыццёва дысквалiфікаваў 30-гадовага ігрока каманды «Палессе-2» Сяргея Труніна за яго ўчынак у матчы другой лігі з «Бярозай».**

Футбаліст у нецэнзурнай форме абразіў суддзю Віктара Міроня і бярозаўскіх балельшчыкаў, ударыў рэферы ў жывот кулаком, за тое, што арбітр паказаў яму чырвоную картку.

# Размеркаванне — не толькі абавязак, але і гарантыя працаўладкавання

**Устанаўленне фінансавай адказнасці за ўхіленне ад працы паводле размеркавання павысіла адказнасць учарашніх выпускнікоў — такую думку выказаў на прэс-канферэнцыі ў Грамадскім прэс-цэнтры начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі нашай краіны Юрый МІКСЮК.**

Сёлета, напрыклад, прыступілі да працы па месцы свайго размеркавання 96 працэнтаў размеркаваных выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў і каля 92 працэнтаў размеркаваных выпускнікоў ССНУ. Некаторыя выпускнікі «праігнаравалі» размеркаванне вымушана, толькі па той прычыне, што вырашылі прадоўжыць навучанне — або ў магістратуры (выпускнікі ВНУ), або ў вышэйшай навучальнай установе (выпускнікі ССНУ).

— Стаўленне да размеркавання апошнім часам змянілася, — падкрэсліў Юрый Мікасюк. — Звычайна, калі мы абмяркоўваем з навучэнскай моладдзю пытанні размеркавання, аўдыторыя падзяляецца. Тыя маладыя людзі, якія яшчэ на старшых курсах знайшлі сабе месца будучай працы, выступаюць супраць размеркавання. Але ж далёка не ўсе выпускнікі могуць самастойна працаўладкавацца па сваёй спецыяльнасці. А размеркаванне якраз гарантуе ім прадастаўленне першага працоўнага месца. Заўважу, што ў некаторых заходніх краінах учарашнія выпускнікі гатовы нават бясплатна працаваць, толькі б атрымаць нейкі практычны вопыт. У нас інтарэс да размеркаванная праяўляюць ужо і так званыя «платнікі». Так, сёлета мы размеркавалі 12,5 працэнта выпускнікоў ВНУ, якія атрымлівалі адукацыю на платнай аснове і каля 10 працэнтаў выпускнікоў ССНУ, якія навучаліся за ўласныя сродкі.

Самыя запатрабаваныя на сёння выпускнікі будаўнічых спецыяльнасцяў, IT-тэхналогій, інжынеры, а таксама будучыя медыцынскія работнікі (як з вышэйшай, так і з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй). Попыт на іх нават перавышае патрэбы работадаўцаў. Сярод будучых педагогаў самыя дэфіцытныя — гэта настаўнікі матэматыкі, фізікі, інфарматыкі. Чым вышэйшы ў маладых людзей узровень адукацыі, тым менш у іх шанцаў аказацца на біржы працы. На аднаго ўчарашняга выпускніка ВНУ на біржы працы прыпадае ад трох да чатырох выпускнікоў ССНУ, як правіла, з эканамічнай і юрыдычнай адукацыяй. Ды і працэнт размеркавання выпускнікоў ССНУ крыху ніжэйшы — сёлета гэты паказчык склаў 89 працэнтаў.

Выпускнікі прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў абавязаны адпрацаваць адзін год паводле размеркавання, і два гады — выпускнікі ВНУ і ССНУ. У тым выпадку калі маладыя людзі не прыязджаюць да месца свайго размеркавання ці звальняюцца раней заканчэння тэрміну адпрацоўкі, яны абавязаны кампенсаваць дзяржаве сродкі за ўсе гады свайго навучання, а гэта могуць быць вельмі вялікія сумы. І калі малады спецыяліст не робіць гэтага добраахвотна, грошы спаганяюцца ўжо ў судовым парадку. Праўда, нярэдка навучальным установам даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб адшукаць такога «парушальніка». А апошняму для ажыццяўлення кампенсацыі прадастаўляецца шасцімесячны тэрмін.

Па выніках размеркавання 2006 года рашэнне аб спагнанні кампенсацыі было прынята па 137 выпускніках ВНУ і 68 выпускніках ССНУ. Судовыя рашэнні ўжо прыняты па 65 выпускніках ВНУ і 34 выпускніках ССНУ, а вярнулі ў бюджэт грошы пакуль толькі 16 уладальнікаў дыпломаў аб вышэйшай і 7 уладальнікаў дыпломаў аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Сёння на разглядзе ў Савеце Міністраў знаходзіцца праект новага палажэння аб размеркаванні выпускнікоў, якое павінна быць прыведзена ў адпаведнасць і з Законам «Аб вышэйшай адукацыі», і з пастановай урада аб кампенсацыі сродкаў, і з працоўным заканадаўствам. Прадстаўнікі Міністэрства адукацыі пакуль адмаўляюцца каментаваць гэты дакумент, аднак пытанні ў студэнтаў застаюцца. Напрыклад, чаму ад кампенсацыі выдаткаваных на навучанне сродкаў вызваляюцца «чарнобыльцы»? Атрымліваецца, што яны могуць наогул не прыязджаць да месца размеркавання? Тое ж самае з сіротамі: яны таксама могуць не прыехаць або звольніцца без нейкіх фінансавых для сябе наступстваў. Праблема заключаецца ў тым, што пэўныя катэгорыі студэнтаў адчуваюць, што нікому нічога не вінны. У той жа час нормы заканадаўчых актаў павінны задавальняць пераважную большасць студэнтаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ВЕРТАЛЁТ З ФРАНЦЫІ

На ўзбраенне Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі ў першым квартале 2008 года па ўмовах дагавора паступіць паліцэйскі верталёт французскай вытворчасці. Як паведаміў начальнік дэпартамента фінансаў і тылу МУС Віктар Мельнікаў, да гэтага на працягу прыкладна 8 месяцаў праводзіўся тэндар з удзелам спецыялістаў Мінэканомікі, Мінфіна, сілавых структур для таго, каб вызначыць аптымальны варыянт. Цяпер завяршаюцца работы па вытворчасці «Еўракаптэра», 5-меснага паліцэйскага верталёта. Гэта адзін з самых сучасных лятальных апаратаў, які выкарыстоўваюць праваахоўныя органы еўрапейскіх краін. Віктар Мельнікаў таксама не выключыў верагоднасці таго, што з часам на ўзбраенні МУС можа з'явіцца дырыжабль, «гэта пытанне вывучаецца».

**БЕЛТА.**

## «ЗВЯЗДА» І «СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ»: ПОГЛЯД ДАСЛЕДЧЫКАЎ

**На факультэце журналістыкі БДУ прайшла рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю газеты «Звязда» і 80-годдзю газеты «Советская Белоруссия».**

У канферэнцыі бралі ўдзел не толькі навукоўцы, але і журналісты-практыкі.

Гісторыя, малавядомыя факты біяграфій першых рэдактараў газет, «Звязда» і «СБ» ў Вялікай Айчыннай вайне... Аднак не толькі ў мінулым ёсць нязведанае. Падчас канферэнцыі былі ўзняты надзённыя пытанні сучаснасці: размоўны стыль на старонках газет, творчыя знаходкі аўтараў, тэндэнцыі афармлення і вёрсткі, арфаграфічныя нормы...

**Настасся КАРАЦЕЕВА, студэнтка журфака БДУ.**

**У суд Баранавіцкага раёна і горада Баранавічы** звярнулася грамадзянка Курыцына Вольга Міхайлаўна з заявай аб прызнанні адсутным без вестак **КУРЫЦЫНА Ігара Вітальевіча,** 18 ліпеня 1967 года нараджэння, ураджэнца горада Кастрама, РФ, апошняе вядомае месца жыхарства якога — вул. Касманаўтаў, 2, кв. 58, г. Баранавічы.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Курыцына Ігара Вітальевіча, паведаміць суду Баранавіцкага раёна і горада Баранавічы на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

## У сельгасвытворцаў ёсць права самастойнага вызначэння цаны на цяплічную гародніну для яе рэалізацыі ў рознічным гандлі

**Аб гэтым заявіў намеснік міністра эканомікі Уладзімір Адашкевіч, прымаючы ўдзел у вучобе дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

Міністэрства эканомікі зняло ўсялякія абмежаванні пры вызначэнні цэнаў на цяплічную прадукцыю. Цяпер у Беларусі дзяржавай не рэгулююцца цэны на цяплічныя памідоры і агуркі, падкрэсліў ён. Гэта робіцца для таго, каб сельгасвытворцы маглі кампенсаваць затраты на іх вытворчасць. Звяртаючыся да прадстаўнікоў сельскай гаспадаркі, ён сказаў: «Сёння вы маеце права вызначаць рознічную цану для гандлю. Чаму ж вы не карыстаецеся гэтым?»

Дырэктар агракамбіната «Ждановічы» Рыгор Чуйко пераканаў, што кожны павінен займацца сваёй справай. На яго думку, вытворцы павінны вырабіць якасную і канкурэнтаздольную прадукцыю і паставіць яе на Мінскі аптовы рынак. А Мінсельгасхарч з Міністэрствам эканомікі мае магчымасць адрэгуляваць цэны для гандлёвых арганізацый. Аднак цяпер, атрымліваючы з кожнага квадратнага метра па 60 кг агародніны, камбінат мае сабекошт Br1600 за кг. Адпускная цана складае пры гэтым — Br2200. У рознічнай сетцы цана цяплічнай агародніны перасягае 4—5 тыс. за кілаграм. Значыць, гандлёвыя прадпрыемствы за кошт гандлёвых надбавак маюць большы прыбытак, чым самі сельгасвытворцы. Такім чынам, перакосы ў цэнаўтварэнні сапраўды існуюць. На думку Рыгора Чуйко, пытанні цэнаўтварэння патрабуюць больш уважлівага і рацыянальнага падыходу. Асабліва гэта датычыцца цэнаў на малочныя прадукты. На думку Рыгора Чуйко, цэны на гэту сацыяльна значную прадукцыю абавязкова павінны рэгулявацца дзяржавай і цяпер стрымлівацца, улічваючы фінансавае становішча неабароненых слаёў насельніцтва.

**БЕЛТА.**

## Казкі для дарослых

# Сэрца жанчыны — як акіян...

**...Тая восень стала для мяне суцэльным кашмарам. Я хадзіла па кватэры з кута ў кут, як загнаная ў клетку тыгрыца. Да таго ж смяротна параненая...**

Як ён мог? Як ён мог мне здрадзіць? Як ён мог здрадзіць МНЕ? Такой разумнай, такой прыгожай, такой вытанчанай... І з кім? Са сваёй памочніцай, лічы, сакратаркай... Прымітыўны сюжэт для мыльнай оперы. Пікантнасць сітуацыі заключалася ў тым, што я сама блаславіла мужа на адпачынак у Крым у кампаніі добра вядомых мне людзей — яго калег і сяброў. Я давярала яму бязмежна, і калі нехта з сябровак спытаў: «Ты адпускаеш яго на поўдзень аднаго? А раптам загуляе?» — што, вы думаеце, я адказала? «Гэтага не можа быць, таму што гэтага не можа быць ніколі!»

На тое шэрае мышаня з бледным тварыкам не паставіў бы і скончаны крэцін. Час ад часу забягаючы да мужа на працу, я заўсёды натыкалася на яе ў прыёмнай і ўвесь час шкадавала. Цяжка было ўявіць сабе больш нязграбную істоту, якая, да таго ж, увесь час нешта губляла і блытала. Пры сустрэчы са мной яна ветліва віталася, апускала вочкі і моцна чырванела... Карацей кажучы, паступова я зусім страціла пільнасць, і вось вам вынік.

Я хадзіла з кута ў кут па кватэры,

# КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 14 (26)

Пытальнік

## Ці давядзецца вяртаць у магазін падарунак?

*У некаторых абутковых магазінах праходзяць рэкламныя акцыі — пры набыцці пары абутку на пэўную суму табе дораць яшчэ адну пару, таксама на пэўную суму. «На падарунак гарантыя не распаўсюджваецца», — папярэджваюць прадаўцы. Наша чытачка паведаміла, што яны разам куплялі мужу ў сталіцы туфлі, а ёй у якасці бонуса дасталіся красоўкі. Як кажуць, прыемная нечаканасць, ад якой яны нават разгубіліся. Аднак ужо дома ўзнікла заканамернае пытанне. Калі ў набытым мужу абутку выявіцца брак і ім давядзецца вяртаць няякасны тавар у магазін, ці змогуць у гандлёвым прадпрыемстве патрабаваць вярнуць назад і падарунак? Проста не вельмі зразумела, што рабіць з парай красовак, якія дасталіся ў якасці падарунка: або насіць, або чакаць, калі завершыцца гарантыя на набытыя туфлі?*

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ва ўпраўленні абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Беларусі, у выкладзенай вышэй сітуацыі паміж прадаўцом і пакупніком у рамках правядзення рэкламнай акцыі быў заключаны змешаны дагавор, у якім утрымліваюцца элементы розных дагавораў: дагавора куплі-продажу і дагавора дарэння. Набыццё абутку па дагавору куплі-продажу (у дадзеным выпадку гэта туфлі для мужа) рэгулюецца Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў». А да праваадносінаў, звязаных з набыццём абутку па дагавору дарэння ў рамках рэкламнай акцыі, прымяняюцца палажэнні аб дагаворы дарэння, і рэгулююцца яны адпаведнымі нормамі Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Дадзеныя праваадносіны паміж сабой не ўзаемазвязаныя. Такім чынам, калі ў туфлях, набытых па дагавору куплі-продажу, будзе выяўлены брак, і іх давядзецца вяртаць у магазін, то патрабаванне прадаўца аб вяртанні падораных красовак будзе неправамоцным.

## Хто кантралюе рэкламныя гульні аператараў GSM?

*Аператары мабільнай сувязі пастаянна запрашаюць сваіх абанентаў паўдзельнічаць у нейкіх гульнях і розыгрышах. Вось адна з падобных SMS-ак: «Удзельнічай у гульні і выйграй скутар, фотаапарат, мабільнік ці спецыяльны прыз — ноўтбук». Далей называецца памер тарыфа за SMS-паведамленне, дарэчы, зусім не сімвалічны. «Хацелася б ведаць, хто-небудзь у нашай краіне кантралюе падобныя гульні і розыгрышы прызоў, ці гэта адзін са спосабаў выцягвання грошай з рахункаў абанентаў сотавых аператараў?» — з такім пытаннем у газету звярнуўся жыхар Мінскага раёна Андрэй Гутнік. Наш чытач сцвярджае, што ніколі не чуў, каб хто-небудзь з яго сяброў, знаёмых ці калег і іх знаёмых і сваякоў, якія ўдзельнічалі ў падобных «гульнях», што-небудзь выйграваў.*

Як паведамілі нашай газеце ва ўпраўленні абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю, парадак правядзення і рэгістрацыі рэкламных гульняў рэгулюецца Палажэннем аб правядзенні рэкламных гульняў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 студзеня 2003 г. № 51. Дзяржаўную рэгістрацыю правілаў правядзення рэкламнай гульні, складу камісіі па яе правядзенні, памеру і складу прызавога фонду ажыццяўляюць асобы пры пасадзе Міністэрства гандлю. Прызавы фонд фарміруецца арганізатарам рэкламнай гульні да пачатку гульні, змяненне памеру і складу прызавога фонду пасля іх дзяржаўнай рэгістрацыі не дапускаецца.

Пры гэтым правілы правядзення рэкламнай гульні, склад камісіі па яе правядзенні, памер і склад прызавога фонду яшчэ да пачатку рэкламнай гульні падлягаюць абавязковаму апублікаванню разам з іх рэквізітамі дзяржаўнай рэгістрацыі ў перыядычных друкаваных выданнях. Мерапрыемствы па розыгрышу прызавога фонду праводзяцца адкрыта. Вынікі розыгрышу павінны быць апублікаваны ў тых жа перыядычных друкаваных выданнях, у якіх былі апублікаваныя правілы правядзення, склад камісіі, памер і склад прызавога фонду.

Пасля заканчэння рэкламнай гульні яе арганізатар на працягу трох месяцаў абавязаны прадаставіць органу, які рэгіструе, справаздачу. У справаздачы ў абавязковым парадку ўказваюцца звесткі аб колькасці ўдзельнікаў рэкламнай гульні ці звесткі, якія дазваляюць устанавіць іх колькасць, а таксама вынікі правядзення розыгрышу прызавога фонду. Кантроль за правядзеннем рэкламных гульняў ускладаецца на Камітэт дзяржаўнага кантролю, Міністэрства па падатках і зборах і Міністэрства гандлю.

А на мой погляд...

## Дэфіцыт большы на старонках СМІ, чым на паліцах магазінаў

**Апошнім часам актуальнай стала тэма, што была характэрнай для сярэдзіны — канца 1990-х гадоў: асартымент некаторых харчовых прадуктаў на паліцах магазінаў і цэнаў на яе. Сітуацыю, вядома ж, нельга параўноўваць цалкам, паколькі тады і зараз пэўны дэфіцыт быў наступствам некалькі розных прычын (сёлета, напрыклад, праблемы з алеем тлумачацца сусветным неўраджаем сланечніку), ды і шляхі вырашэння ўзніклых праблем адрозніваюцца. Так, зараз дзяржаўныя органы даволі аператыўна адрэагавалі на сітуацыю з перабоямі паставак у гандаль прадуктаў малочнай групы, не адчуваюць спажыўцы і дэфіцыту таго ж алею. Цэны, безумоўна, павялічыліся, чаму таксама могуць быць аб'ектыўныя абгрунтаванні. Тым не менш тэма абмяркоўваецца, без перабольшвання, у кожнай сям'і, бо, у адрозненне ад тавараў іншых груп, харчавацца мы мусім штодзённа, гэтак жа рэгулярна наведваць магазіны.**

**Ці адчулі асабіста вы нейкі дэфіцыт харчовых тавараў за апошні час? Наколькі закранула ваш сямейны бюджэт павелічэнне цэнаў на асобныя прадукты?**

**Надзея СЕЛЯХ, галоўны бухгалтар ААТ «Кісялёўцы» Кобрынскага раёна:**

— Ніякага дэфіцыту абсалютна не заўважыла, паколькі трымаю ўласную гаспадарку: свінаматак, свіней і інш. Каровы, праўда, няма, але і ў мяне, і ў іншых работнікаў, у тым ліку і пенсіянераў, ёсць магчымасць выпісваць яго ў лік зарплаты ў гаспадарцы. Выходзіць нават танней, чым у магазіне, бо выпісваецца яно па цане рэалізацыі — 470 рублёў за літр першага гатунку. Ды і тлустасць у такога малака большая, чым усе задаволены. Такім жа чынам у гаспадарцы можна выпісаць і мяса, ялавічыну, напрыклад. Усё гэта зафіксавана ў нашым калектыўным дагаворы.

Што я набываю ў магазіне? Сыр зрэдку, каўбасу. Купіш калі пачак масла, дык яго на тыдзень хапае. Хлеб там яшчэ. Падаражанне, скажу шчыра, не заўважыла. Алей даўно не набывала, бо засталіся рэшткі старых запасаў. Свежыны нядаўна брат «падкінуў».

**Анатоль АЛЯХНОВІЧ, вучоны сакратар Інстытута заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук:**

— Не адчуў і не закранула. Шчыра кажучы, няма нават часу разбірацца падрабязна ў гэтай сітуацыі, калі, умоўна кажучы, нейкі харчовы прадукт падаражаў на 100 рублёў. Безумоўна, часткова тут адбіваецца памер заработнай платы, калі можаш дазволіць сабе не звяртаць увагі на пэўныя дробязі. З іншага боку, мая жонка рэгулярна на два тыдні выязджае працаваць у радыяцыйную зону, таму гаспадарку вядзём мы з сынам. Зразумела, у некаторых момантах — па-мужчынску: прыйшоў, убачыў, што трэба, купіў. Гэта вядома ж вобразна. Усё ж я імкнуся, каб харчаванне было разнастайным. Часцей раблю закупкі на рынках — там і больш танна, і выбар значна большы. Бярэш самую вялікую «авоську» і набываеш усё патрэбнае на тыдзень наперад *(смяецца)*. У магазінах жа звычайна бяру хлеб, малако.

**Супрацоўнік Міністэрства юстыцыі, які пажадаў захаваць поўную ананімнасць:**

— Абсалютна не закрануў. Увогуле пра існаванне нейкага дэфіцыту харчовых тавараў, скажу шчыра, я даведаўся са сродкаў масавай інфармацыі. Не, па магазінах і рынках ходзіць не толькі жонка, але і я сам. Але ўсё, што нам бывае патрэбным, я знаходжу на паліцах, у вітрынах і магазінаў, і рынкаў, прычым, цэны на гэтыя тавары нас не засмучаюць.

**Сяргей СЯНКЕВІЧ, начальнік аддзела аховы лесу Мінскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання:**

— Не адчуў ніякага дэфіцыту. Хоць набыццём прадуктаў да стала рэгулярна займаецца жонка, я толькі зрэдку ўдзельнічаю ў гэтым працэсе *(смяецца)*. У мяне ў сям'і іншыя абавязкі. Зрэшты, пачакайце... Літаральна ўчора жонка скардзілася, што з продажу зніклі беларускія цвёрдыя сыры, гандаль прапануе расійскія па 26 тысяч рублёў за кілаграм. Што да цэнаў, дык іх павелічэння мы таксама не адчулі. Магчыма, таму, што сям'я ў нас невялікая, тры чалавекі: я, жонка і дачка, ды і калі кожны дзень набываеш нешта пакрысе, лішнія 50—100 рублёў пагоды не робяць. А вось для вялікай сям'і, асабліва калі набываць прадукты харчавання на працяглы час, павелічэнне можа быць і адчувальным.

**Ірына КАСІЧЭНКА, хатняя гаспадыня, г. Заслаўе:**

— Я зараз часова не працую, даглядаю дзіця. Жывём пакуль фактычна на зарплату мужа. Не шыкуем, таму, падаецца, хапае. Магчыма і таму, што чым могуць дапамагаюць бацькі, якія трымаюць уласную гаспадарку: трусоў, курэй, казу. Безумоўна, нейкія зрухі цэнаў у магазінах я заўважыла, але яны, на мой погляд, не адчувальныя. Хоць увогуле жыццё становіцца больш дарагім, таму што набываць трэба не толькі прадукты харчавання. Тут лішняя капейка, там — глядзіш, за месяц «набягае» больш, чым было нядаўна.

**Аляксандр ЛАСТОЎСКІ, начальнік прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама:**

— У дзяржслужачых заробкі, вядома ж, не завоблачныя, але, лічу, і не настолькі нізкія, каб адчуць на ўласнай кішэні нейкі дыскамфорт ад павелічэння цэнаў. Зразумела, я не гавару пра асобна ўзятую бабульку-пенсіянерку, якая вымушана лічыць кожную капейку. Ды і, па шчырасці, ніякага дэфіцыту я не заўважыў, хоць даволі часта наведваю магазіны. У параўнанні з 10—15-гадовай даўніной у іх ёсць усё, калі не ў адным, дык у другім. Таму ніякай праблемы я не бачу ні для Мінска, ні для вёскі, дзе многія трымаюць уласную гаспадарку, маюць малачко ад уласнай каровы. А калі дзе і ўзнікаюць перабоі з нейкімі таварамі, дык гэта, упэўнены, часовая з'ява.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Удостоверение председателя садоводческого товарищества Н. В. Ритвинского **считать недействительным.**

## «Зараз беларусы падобныя да туркаў і карэйцаў!»

**«Мода становіцца ўсё больш даступнаю» — канстатавалі знакамітыя сусветныя дызайнеры на апошніх паказах адзення і вырашылі зрабіць не проста яркія і незвычайныя мадэлі, а яшчэ і практычныя. Пра моду, яе сучасны стан у нас у краіне пойдзе размова з маладым мадэльерам, пераможцам рэспубліканскіх фестываляў «Мамант» і «Млын моды» Кацярынай ШУКАЛА.**

**— Самае цікавае для любой дзяўчыны пытанне: што зараз у модзе?**

— Зараз у модзе — 60-я гады, прычым ва ўсіх стылях — этнічным, класічным, спартыўным. Адсюль і яркія колеры, і арнаменты намаляваныя так, быццам вырваныя з коміксаў ці з рэкламы.

**— А чаму менавіта 60-я?**

— На мой погляд, гэты час зноў вярнуўся таму, што людзі сталі адставаць ад навакольнага асяроддзя. Ужо даўно з'явілася авангардная мэбля, знешні дызайн бытавых прыбораў змяняецца кожны дзень, а чалавек у сваім адзенні застаецца нязменным! Менавіта 60-я адрозніваюцца навізною, і толькі пасля 60-х узнікла фраза, што ўсё новае — гэта добра забытае старое. У гісторыі моды гэта апошні перыяд, дзе дызайнеры прыдумалі нешта новае. Зараз у нас другі перыяд усплёску гэтага часу. Магчыма, хутка мы будзем насіць цалкам новае адзенне!

**— А як ты ацэньваеш узровень моднасці нашых людзей?**

— Не вельмі *(смяецца)*. Яны чамусьці баяцца выдзеліцца з натоўпу.

**— Дык можа на модныя прыбамбасы проста не хапае грошай?**

— Наўрад ці! У нас спрацоўвае стэрэатып — НЕЛЬГА выдзяляцца з агульнай кампаніі. Усе павінны хадзіць аднолькавымі! У нашу краіну прыязджаюць іншаземцы, яны хочуць бачыць беларусаў, а не каго-небудзь іншага. Зараз жа мы падобныя да туркаў і карэйцаў, таму што носім у асноўным толькі такое адзенне. На жаль, у нас толькі некалькі прадпрыемстваў, якія арыентаваныя на маладзёжны стыль. Астатнія — для тых, каму далёка за... Але вельмі прыемна, што зараз праводзяцца шмат конкурсаў і фестываляў, дзе маладыя дызайнеры могуць паказаць сваё ўспрыманне моды, гледачы — узяць на ўзбраенне нешта цікавае ў свой гардэроб!

**— Зараз ты заканчваеш вучобу ў Інстытуце сучасных ведаў. Якія планы?**

— О-о, планаў шмат! Гэта і з'ездзіць на стажыроўкі ў Берлін і Милан, якія я выйграла на конкурсах. Але самае галоўнае — дастойна прадставіць Беларусь на Міжнародным конкурсе маладых дызайнераў «Рускі Сілуэт», які адбудзецца 11 лістапада ў Маскве. З нашай краіны паедуць чатыры дзяўчыны — Кацярына Голікава з калекцыяй «Тэатр ценяў» з Віцебска, Яўгенія Лук'янава з «Ролевай гульнёй» з Мінска, Вольга Пад'ельская з «Капітанскай дачкой» (Мінск) і я з калекцыяй «Зямля ў ілюмінатары».

**— Едзеш, каб абавязкова перамагчы?**

— Гэта як атрымаецца. Але тое, што мы там апынуліся, вялікае шчасце!

**— Поспехаў вам!**

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара і з асабістага архіва.**

Карысная парада

# МАТЭРЫЯЛ, які не пакідае раўнадушным

**«Гэты матэрыял або адразу і надоўга прыцягвае ўвагу да сябе, або пакідае цалкам раўнадушным». Упершыню гэтыя словы я пачуў ад прадаўца каля чатырох гадоў таму, калі толькі «засвяціла» магчымасць пабудаваць уласнае жыллё. Яшчэ не ведаючы як след шмат чаго, што чакала наперадзе ў рамонце, у глыбіні душы тым не менш я быў упэўнены ў адным: гэты матэрыял абавязкова выкарыстаю, калі не адразу, дык калі выпадзе магчымасць. Ужо зараз, не маючы аніякай у ім патрэбы, «прабягаючы» па будаўнічых рынках зусім па іншых справах, заўсёды хоць бы мімаходзь спыняю крок каля яго, не прамінаю магчымасці правесці па ім рукой, спытаць у прадаўца наконт навінак. Меў рацыю той мой суразмоўца: матэрыял гэты — корак, — прыцягвае.**

### Ужо не экзотыка, а будзённасць

Натуральны корак — гэта кара коркавага дуба, які расце ў Міжземнаморскім басейне: у Партугаліі, Іспаніі, Алжыры, Марока. Яна здымаецца з дрэва (дзякуючы сваёй жыццеўстойлівасці, яно потым на працягу некалькіх гадоў зноў нарошчвае новы слой кары) і, дзякуючы прыдуманаму ў канцы XIX стагоддзя спосабу прасавання сыравіны, ператвараецца ў будаўнічы матэрыял, дакладней, аддзелачны. Дзякуючы свайму саставу і будове корак мае шэраг унікальных уласцівасцяў (пра іх крыху ніжэй), што робіць яго ўніверсальным для многіх выпадкаў матэрыялам.

У нас ім гандлююць недзе каля дзесяці гадоў. Напачатку корак успрымаўся выключна як экзотыка, зараз жа гэты матэрыял калі і не перайшоў у разрад масавых, дык прынамсі, фактычна стаў даволі будзённым у выкарыстанні. Да прыкладу, прадаўцы вам пацвердзяць, што заказ сёння нават 60—80 квадратных метраў пакрыцця з корку — звычайная рэч. Хоць, шчыра скажам, задавальненне гэта не з самых танных, але ўкладзеныя сродкі кампенсуюцца арыгінальным інтэр'ерам, працяглым тэрмінам службы аддзелачнага матэрыялу і інш.

Сёння з кары вырабляюць даволі шырокі спектр прадукцыі, сярод якіх можна прыгадаць шпалеры, дэкаратыўныя насценныя пакрыцці, пакрыцці на падлогу, плінтусы, вугалкі і г.д. Нагадаем, што гаворка ідзе пра натуральны прыродны матэрыял, таму ўсё вышэйпералічанае выдатна спалучаецца як паміж сабой, так і з іншымі аддзелачнымі матэрыяламі. Дзякуючы ў тым ліку і гэтаму, попыт на корак павялічваецца.

### Не гарыць, не збірае пыл, не старэе

Чым жа ён такі адметны? Па-першае, корак вельмі лёгкі; па-другое, воданепранікальны; па-трэцяе, не гарыць і не выдзяляе шкодных рэчываў, і ў той жа час мае трывалаваць да хімічна актыўных рэчываў. Гэты прыродны матэрыял мае ўласцівасць аднаўляць першапачатковую форму пасля нагрузкі (корак не дэфармуецца, увагнутасці знікаюць).

Пакрыцці з корка маюць добрыя цепла- і гукаізаляцыйныя якасці («выдаляюць» рэха, зніжаюць шум). Яны не назапашваюць статычнай электрычнасці, а, значыць, не прыцягваюць пыл. Корак практычна не старэе, не патрабуе асаблівага догляду. Ён не «ўсмоктвае» старонніе пахі, у тым ліку і цыгарэтны дым. У выпадку нават сур'ёзнага ненаўмыснага механічнага пашкоджання, гэты ўчастак даволі лёгка можна самастойна выдаліць і замяніць цэлай панэллю, пры гэтым, дзякуючы сваёй тэкстуры, «латка» не будзе кідацца ў вочы.

Дзякуючы ўсяму гэтаму пакрыцці з корка падыходзяць практычна для ўсіх нежылых і, што істотна, жылых памяшканняў. У тым ліку і для такіх, як ванны пакой, сауна, кухня, — дзе можа быць уздзеянне вільгаці, пары.

Акрамя таго асобна хацелася б адзначыць энергетыку гэтага аддзелачнага матэрыялу. Некаторыя спецыялісты гавораць, што ён можа абараняць арганізм ад шкоднага ўздзеяння геапатагенных зон, аслабляць узровень анамальных выпраменьванняў. Асабіста я пацвярджэння гэтаму ў літаратуры не сустракаў, але тое, што корак цёплы, прыемны навобмацак і «для вока» — сведчу. Пакрыцці для падлогі маюць значнае супраціўленне слізганню, амартызуючыя якасці. Па такой падлозе проста прыемна хадзіць (у тым ліку і дзецям), асабліва басанож.

### У кожнай калекцыі — асобная назва

Прадаўцы сцвярджаюць, што пліты для падлогі не змогуць сапсаваць ні цяжкая мэбля, ні жаночыя «шпількі». Магчыма, яно і так, але цудоўна ведаючы, што такое «перманентны рамонт» (ёсць грошы — ёсць рамонт), рызыкну сцвярджаць, што далёка не ўсе механічныя ўздзеянні такі корак зможа вытрымаць без наступстваў. Застрахавацца можна, толькі калі ў жыллі ўжо ўсе зроблена.

Коркавая падлога можа быць двух відаў. Першы, гэта калі панэлі (памерам 900 на 180—185 міліметраў, таўшчынёй 9—12 міліметраў) праклейваюцца толькі ў месцах злучэння або манціруюцца на замках паміж сабой (як замковы ламінат). Гэта так званая «плавающая» падлога, яе можна ўкладваць на любую аснову, што ўжо маецца. Уласна таўшчыня самога корка на плітах складае каля 3 міліметраў (абароненага лакам), а самі панэлі маюць выгляд «слоенага пірага» (з цвёрдай асновай).

Плітачны від пры ўкладцы патрабуе больш ідэальнай паверхні, таму ранейшыя пакрыцці выраўноўваюць з дапамогай вільгацетрывалай ДСП або фанеры. Панэлі мацуюцца да асновы з дапамогай спецыяльнага клею. Таўшчыня іх крышку меншая — 3,2—6 міліметраў (пласціны могуць быць памерам, напрыклад, 900 на 150 ці 600 на 300 міліметраў), чым у «плавающай» падлогі. Кошт аднаго квадратнага метра корка для першага віду падлогі можа складаць каля 40 долараў, другога — даходзіць да 25 долараў за «квадрат».

Насценныя панэлі маюць значна большы асартымент па адценнях і тэкстуры матэрыялу. Могуць мець як натуральны колер, так і быць цалкам пафарбаванымі ці мець каляровыя «ўстаўкі». У кожнай калекцыі свая асабістая назва: «Дэтройт», «Бостан», «Бамбус», «Балі» і інш. Дарэчы, за некалькі апошніх гадоў назвы ў некаторых змяніліся, таму калі каму патрэбна знайсці штосьці дакладнае, трэба арыентавацца найперш на зрокавую памяць. Цана на насценныя пакрыцці ў залежнасці ад калекцыі можа вагацца ад 12,5 да 25 долараў за квадратны метр.

### Каб не сапсаваць выгляд, выраўняйце сцены

«Прафесійнай» паклейкай коркавых пакрыццяў у сталіцы займаюцца літаральна некалькі чалавек — ужо на працягу шэрагу гадоў. Хоць у прынцыпе працэс гэты падуладны практычна любому будаўніку або «аматару». Панэлі — гнуткі матэрыял, дазваляюць без праблем самастойна аклейваць нават закругленыя куты. Праўда, калі корак давядзецца шмат дзе «падразаць» і «падганяць», лепш не рызыкаваць і запрасіць спрактыкаванага чалавека. У залежнасці ад канфігурацыі паверхняў, якія трэба аклеіць, «тарыф» можа складаць ад шасці долараў за адзін квадратны метр (выяўляецца попыт, пра які мы згадвалі вышэй: расцэнкі за работу крыху павялічыліся ў параўнанні з недалёкім мінулым). У залежнасці ад складанасці работы, дзесяць квадратных метраў могуць паклеіць гадзін за пяць. Прычым, у цішыні — у адрозненне ад іншых відаў аддзелачных работ. Дарэчы, пры набыцці коркавага пакрыцця лепш загадзя браць дадатковыя 10 працэнтаў матэрыялу ад выніковай лічбы, што патрабуецца — на «прырэзку».

Паколькі корак (асабліва для сцен) — даволі тонкі матэрыял, ён будзе паўтараць рэльеф паверхняў, на якія яго будуць клеіць. Іншымі словамі, з яго дапамогай схаваць нейкія хібы атрымаецца не заўсёды, наадварот, сцены давядзецца любым магчымым спосабам выраўноўваць (тынкоўкай, гіпсакардонам). Перад паклейкай паверхні трэба двойчы загрунтаваць (апошні раз мінімум за 12 гадзін да асноўных работ).

Клей, як мы ўжо гаварылі, патрэбны спецыяльны (нагадвае абутковы, дарэчы, вельмі добра клеіць кераміку). Каштуе ён амаль 20 тысяч рублёў за літровую бляшанку (хапае прыкладна на 4 квадратныя метры плошчы).

Дарэчы, калі ў вас пасля паклейкі застануцца рэшткі матэрыялу (цэлыя панэлі ці абрэзкі), іх можна з карысцю выкарыстаць. Напрыклад, аклеіць люстэрка ў ванным пакоі ці проста замацаваць у дзіцячай на сцяну некалькі пласцін — ваш нашчадак будзе мацаваць кнопкамі да іх свае малюнкі, не псуючы шпалераў. З рэшткаў таксама можна нарэзаць прыгожыя падстаўкі пад стравы на стол, у тым ліку і пад гарачыя. У рэшце рэшт можна выкарыстаць іх для аздаблення інтэр'еру ў іншых памяшканнях: у якасці бардзюра, фрыза, дэкаратыўнай устаўкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Будзь пільны!

## Перайшлі на дзвюхсоткі

**Фальшывыя еўра сустракаюцца, але наміналам у 200 еўра даволі рэдка.**

У Пінску менавіта з такімі купюрамі звярнулася ў мясцовае аддзяленне ААТ «Белаграпрамбанк» жыхарка горада — хацела іх абмяняць на беларускія рублі. Еўра выклікалі падазрэнне ў касіра, і жанчыну затрымала ахова. Экспертыза ўстанавіла, што валюта сапраўды аказалася фальшывай і выраблена плоскім афсетным друкам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Срэбра на любы густ

**Ад трох да васьмі гадоў пазбаўлення волі пагражае за незаконныя здзелкі з каштоўнымі металамі дзвюм жыхаркам Гродна, якіх затрымалі супрацоўнікі міліцыі.**

Згодна з інфармацыяй прэс-службы Гродзенскага УУС, у адной з гандлярак меліся візітоўкі, што яна быццам спецыялізуецца на афармленні высакаякаснага макіяжу, а таксама рэалізацыі біжутэрыі. На справе ж яна займалася збытам «левага» срэбра (без прабірнага кляйма Беларусі і іншых рэспублік былога СССР) — ланцужкоў, завушніцаў, кулонаў. Пры вобыску на месцы яе жыхарства выявілі больш за 300 розных вырабаў. А ў яе калегі па незаконнаму бізнэсу, якая ў пошуку пакупнікоў на срэбра не апасалася пакідаць свой нумар тэлефона ў цырульнях, буціках і іншых установах — больш за 150 вырабаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## На працягу года «палявалі» на дрэвы

**У Горацкі РАУС перададзены матэрыялы для разгляду пытання аб узбуджэнні крымінальнай справы ў адносінах да токара прадпрыемства «Цеплаэнергетыка» і рабочага ААТ «Рамкам».**

Яны былі затрыманы пры правядзенні сумеснай аперацыі работнікамі Горацкага МРА УКДБ па Магілёўскай вобласці і Мсціслаўскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету падчас незаконнай высечкі дрэў у лясах I групы каля г. Горкі. Як высветлілася, на працягу года гэтыя асобы незаконна высеклі больш за 60 дрэў. Згодна з папярэднімі данымі, нанесены прыродным рэсурсам урон склаў 219 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЧАМУ КУПЭ, КАЛІ ЯНА — ШАФА?

Выпрабавана на сабе

**Па аналогіі з вядомым транспартам: дзверы, як правіла, рассоўныя, выконваюць сваю функцыю і ў той жа час займаюць мінімум месца, эканомячы літаральна кожны сантыметр дэфіцытнай плошчы, бо вырабляюцца па індывідуальным заказе. Найперш па гэтай прычыне шафы-купэ ўстанаўліваюць у нішах у прыхожай, калідоры, на балконе ці лоджыі, словам, там, дзе размешчаны нейкі суседні пакой, памяшканне, у якім устаноўлены традыцыйныя дзверы ці вокны, што адчыняюцца. Дзве аднолькавыя сістэмы, якія адчыняюцца «на сябе», у такіх сітуацыях сумясціць бывае цяжка, а часам і ўвогуле нерэальна. Рассоўныя дзверы шафы-купэ якраз і бываюць лепшым выйсцем са становішча.**

### А за дзвярамі — асобны пакой

Зрэшты, шафы-купэ ўжо даўно перасталі ўстанаўліваць толькі ў нейкіх не вельмі зручных месцах кватэры, туды, дзе звычайная корпусная мэбля не ўваходзіць. У адрозненне ад апошняй, з дапамогай шафы-купэ можна вырашыць значна больш задач (акрамя, уласна, эканоміі прасторы). Хоць і ў гэтым плане мы яшчэ не ўсё сказалі. Так, традыцыйна шафу-купэ робяць ад падлогі да столі, атрымліваючы дастаткова зручныя «антрэсолі» для розных рэчаў у верхняй яе частцы.

З дапамогай убудаванай мэблі можна схаваць пэўныя хібы жылля. У маёй кватэры, напрыклад, усе куты — закругленыя (такі праект). Паставіць звычайную шафу ці іншую корпусную мэблю побач з такім кутом, значыць, атрымаць, дастаткова велізарны зазор (чытай, пылазборнік) паміж гэтай самай мэбляй і сцяной (зноў жа, дарэмна прападае дэфіцытная плошча). А шафа-купэ якраз дапамагае вырашыць гэтую праблему, прынамсі, знешне.

Шафа-купэ дае таксама цудоўныя магчымасці для заніравання памяшкання (выдзялення тых ці іншых зонаў: для працы, адпачынку і г.д.). Напрыклад, у каго дазваляе плошча і планіроўка, могуць зрабіць у прыхожай гардэробную. У сэнсе, не зусім звычайную шафу, а нібыта асобны пакой, куды, рассунуўшы дзверы, можна заходзіць, каб выбраць адзенне, або апрануцца. Зразумела, у такой «шафе» прадугледжана ўсё, што павінна «адпавядаць моманту»: паліцы, штангі для вопраткі і адзення, шуфляды, падсветка, люстэрка, дыванок, банкетка і інш.). У падобнай шафе-купэ можна схаваць што заўгодна: пісьмовы стол з камп'ютарам, трэнажор, тэлевізар і інш.

### Варыянт дыктуе месца размяшчэння

Увогуле шафа-купэ — гэта нібыта своеасаблівы канструктар, які можа складвацца так, як пажадае заказчык-кліент. Дарэчы, сабраць такую шафу пры жаданні і ўменні можна самому. Дастаткова на будаўнічым рынку заказаць у адной з фірмаў матэрыял, указаць канкрэтныя памеры выбару (і яго асобных частак), пры жаданні — дастаўку, і атрымаць на дом гэты «лего» для дарослых. Галоўнае, не памыліцца пры вылічэннях і мець рукі, якія растуць адкуль трэба.

Калі шафа-купэ будзе ў нейкай нішы, у якасці яе паверхняў выкарыстоўваюцца нясучыя сцены, падлога, столь. Да іх мацуюцца паліцы, шуфляды і ўсё іншае. Варыянт, па-першае, эканамічны, па-другое, калі ў вас на сценах добрыя шпалеры, а на падлозе — напольнае пакрыццё, ён дазваляе пры рассунутых дзвярах дэманстраваць усё гэта харство навакольным ці самому сабе любімаму.

Можа быць варыянт шафы-купэ, які нагадвае корпусную мэблю: з задняй і бакавымі сценкамі, уласнай «столлю» і «падлогай» (усё гэта пры жаданні можа быць выкарыстана і пры ўладкаванні ўбудаванай мэблі ў той жа нішы — была б, як кажуць, ахвота). Гэта, вядома ж, не азначае, што такую мэблю вы зможаце пры жаданні перасоўваць як звычайную, проста ўсё залежыць ад месца размяшчэння шафы-купэ і асаблівасцяў жылля. Скажам, калі сцены кватэры ў вас былі «абшыты» гіпсакардонам, мацаванняў «начыння» шафы-купэ ён наўрад ці вытрымае, давядзецца ісці на варыянт корпуснай мадэлі.

Заднія сценкі, як правіла, вырабляюцца з ламінаванай ДВП, усё астатняе ўнутранае «начынне» шафы-купэ — з такой жа ДСП.

### Будзем выбіраць бук ці вішню?

Колеру фанеры можа быць не менш за 20—30. Як правіла, у кожны аднолькавы цэнавы дыяпазон трапляе не менш за паўтузіна, так што выбраць ёсць з чаго. Фанера можа быць як айчынная, украінская ці расійская, так і больш дарагая польская, і яшчэ даражэйшая нямецкая ці фінская. На мой суб'ектыўны погляд, аптымальны варыянт — Польшча, прынамсі, у параўнанні з беларускай, украінскай ці расійскай яна найбольш трывалая да выгарання ад сонечных промняў (шафа-купэ, нагадаю, не корпусная мэбля — дзе яе ўстанавілі, так фактычна «пажыццёва» і будзе стаяць).

Самы танны варыянт, зразумела, белы (каля 7,5 долара за квадратны метр). Для бялізны яшчэ куды ні ішло, але для гаспадарчай шафы такі колер наўрад ці пойдзе. Дарэчы, колеры могуць быць самыя розныя: і фарбаваныя (барвовы, сіні), і пад драўніну (яблыня, вішня, дуб, бук). Цана менавіта польскага вытворцы (у залежнасці ад таўшчыні) — ад 9,5 да 15—17 долараў за квадратны метр.

Наконт таго, якую сістэму выбраць — «Сенатар» ці «Камандор» — думаю, асабліва вагацца не варта. Ад спецыялістаў можна выслухаць «лекцыі» на розныя тэмы (і пра плюсы, і пра мінусы адной перад другой). А лепшы варыянт — бярыце, што падабаецца асабіста вам, выбірайце колер профіляў пад асабісты інтэр'ер.

На што раіў бы звярнуць увагу, каб ваша шафа не выглядала «змрочнай», дык гэта на «ўпрыгажэнні» кшталту люстэркаў, такіх матэрыялаў як ратанг, бамбук. Першыя могуць быць як прамымі і ў поўны рост (для прыхожай, аднаго з пакояў), так і фігурнымі (самі люстэркі таксама могуць быць некалькіх відаў). Канфігурацыю намалюе або ваша ўласная фантазія, або дапамогуць майстры. Ратанг і бамбук — даволі дарагія матэрыялы — ліст памерам 2,7х0,9 метра каштуе ад 90 да 130 долараў. Пры жаданні можна набыць адзін ліст, які потым у якасці невялікіх уставак выкарыстаць на некалькіх шафах-купэ.

### Дзесяць разоў адмерай, потым закажы

Любы добры майстар вам скажа, што няма горш кліента, які дакладна не ведае, чаго ён хоча (гэта датычыцца не толькі шафаў-купэ). Напярэдадні ўстаноўкі мне такой убудаванай мэблі пад гаспадарчыя патрэбы, я, не смейцеся, замераў вышыню ўсіх літровых, двух- і трохлітровых слоікаў, пыласоса, скрыні з інструментамі і г.д. Затое дагэтуль усё гэта стаіць там, дзе і задумвалася. Скажам, майстры вельмі здзівіліся просьбе зрабіць мацаванні некаторых паліц вельмі трывалымі. Усе іх сумненні былі зняты сустрэчным пытаннем: ці ведаюць яны, колькі важыць дзесятак трохлітровых слоікаў з хатнімі закаткамі?

Калі ёсць нейкія сумненні, зрабіце паліцы здымнымі. Каштавацьгэта будзе не намнога даражэй, затое вы заўсёды ў далейшым зможаце ўнутры шафы складаць свой уласны «канструктар». Калі заказваеце шуфляды, падумайце, для чаго яны будуць прызначаны: для дзіцячых цацак, коўдры ці падушак, якія ў вас ужо ёсць.

Штангі для «плечыкаў-вешалак» могуць быць як для верхняй вопраткі (паліто, курткі), так і для кашуль, штаноў (апошнія можна размяшчаць у два «паверхі» для эканоміі ўнутранай прасторы). Акрамя традыцыйных паліц і шуфлядаў кліенту могуць прапанаваць і дастаткова дарагія сістэмы кшталту міні-ліфта (адзенне можна ўздымаць на вышыню) і высоўных шуфлядаў, што «цягнуць» за сабой дадатковыя паліцы. Выбар тут вельмі вялікі, варта толькі вызначыцца з патрэбамі і магчымасцямі.

Напрыканцы колькі слоў пра падсветку. Калі мы гаворым, скажам, пра «шафу-гардэробную», без яе не абысціся. У калідоры ўмацаваныя ў «казырок» шафы перад люстэркам свяцільні таксама будуць да месца. І ў якасці «фонавага» святла ў шафе-купэ са шкляными паліцамі і дзверкамі яны будуць дарэчы. Калі 

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 12 (17).

Далёкае — блізкае

# ЛЮБІМЫЯ МЯСЦІНЫ ЛЕШАКА ДАМАГАЛЫ

## Вясковы святар стварыў ля храма алею памяці

Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

Вёска Капцёўка размешчана ў нейкіх дзесяці хвілінах язды ад абласнога цэнтра. Праўда, ксёндз тутэйшага парафіяльнага касцёла Лешак Дамагала з ветлівай усмешкай удакладняе, што гэта, маўляў, гораду Гродна выпаў гонар знаходзіцца побач са знакамітай Капцёўкай. Вось такі ён патрыёт гэтых мясцін, прычым без усякай гульні на публіку, а насамрэч. Нават манаграфію пра іх напісаў.

Ксёндз Дамагала прыехаў у Капцёўку ў 1992 годзе, прычым сам папрасіў пасадзейнічаць у пераводзе сюды сваё епархіяльнае кіраўніцтва. І такое жаданне было невыпадковым: менавіта тут, у Капцёўцы, добрую памяць аб сабе пакінуў яго сваяк і калега Ян Храбонш. Гэта ён у 1936 годзе паклаў пачатак гісторыі тутэйшай рымска-каталіцкай парафіі, а яшчэ праз тры гады было завершана будаўніцтва касцёла. Потым ксёндз Храбонш служыў капеланам у польскім войску, а калі вярнуўся з вайны, то быў арыштаваны. Доўгі час ён для сваякоў лічыўся прапалым без вестак і толькі ў 1988 годзе Лешак Дамагала даведаўся з адной кніжкі, што ягоны продак загінуў ва Узбекістане. А пабудаваны намаганнямі Яна Храбонша і прыхаджан касцёл быў прыстасаваны пад збожжасховішча, затым — пад млын...

У 1991 годзе мясцовыя жыхары звярнуліся з пісьмом да Гарбачова, пасля чаго напаўразбураны будынак перадалі касцёлу, і з прыездам Лешака Дамагалы пачалося яго аднаўленне. Гаспадарчым спосабам, талакой. Ксёндз кажа, што ён вельмі ўдзячны сваім прыхаджанам за самаадданую работу (асабліва ўраджаны ён працавітасцю жанчын), а таксама кіраўніцтву гаспадаркі за дапамогу тэхнікай.

Зрэшты, толькі адбудовай касцёла, якая завяршылася ў 2000 годзе, інтарэс Лешака Дамагалы не абмежаваўся. Шукаючы архіўныя сведчанні аб ранейшым выглядзе храма, ён пазнаваў і гісторыю Капцёўкі, навакольных вёсак. У прыватнасці, даведаўся, што вядомы беларускі і літоўскі асветнік, матэматык, астраном Марцін Пачобут-Адляніцкі (1728—1810) нарадзіўся ў вёсцы Саломенка, якая ўвахо-дзіць у тутэйшую парафію. Памяць аб гэтым вучоным, чыімі адкрыццямі і цяпер карыстаюцца ў абсерваторыях многіх краін свету, ушаноўвае мемарыяльная дошка на сцяне касцёла.

З беларускіх, польскіх і літоўскіх архіваў, а таксама ад мясцовага насельніцтва ксяндзу стала вядома і пра колішнія могілкі. Аказваецца, раней яны існавалі практычна ля кожнай вёскі, але сёння там лес ці поле і быццам нішто ўжо не нагадвае пра месцы пахавання нашых продкаў. «Нішто?» — засумняваўся Лешак Дамагала. І з дапамогай тутэйшых старажылаў распачаў пошукі «сведкаў» — надмагільных камянёў, якія затым былі дастаўлены да касцёла. Ксёндз і сваёй машынай іх прывозіў, і вяскоўцы свайго транспарту альбо коней не шкадавалі. І ў выніку сёння гэтыя васемнаццаць камянёў утварылі ля касцёла алею памяці, у тым ліку і аб ужо неіснуючых вёсках.

— Гэты камень людзі мне паказалі каля вёскі Жылічы, — расказвае ксёндз Дамагала. — Гэты, у памяць аб вёсцы Кавальцы, якая ўжо аб'яднаная са Славічамі, знайшлі ў лесе. Гэты адшукалі ля вёскі Каменка там, дзе была бульба. А вось камень з вёскі Саломенка мы выявілі яшчэ вясной, аднак каб забраць яго, не пашкодзіўшы аўтамабілем пасевы, давялося чакаць завяршэння жніва.

На камянях самай рознай формы выбіты крыжы і даты: 1816, 1818, 1858, 1869... Лешак Дамагала тлумачыць, што гэта пазначаны год смерці чалавека.

— Такімі надмагільнымі камянямі, — лічыць святар, — ушаноўвалі памяць аб сваяках не багатыя людзі, а тыя, у каго не было магчымасці ўстанавіць помнік. Яны ішлі ў поле, знаходзілі камень, счэсвалі адзін бок, пазначалі год і ставілі на магіле. Цяпер гэта алея для маіх парафіян — як напамін аб іх каранях, каб яны не забывалі сваіх продкаў.

Дарэчы, калі Лешак Дамагала бывае ў Польшчы на сваёй радзіме ў Кельцах, то абавязкова прыходзіць да магілы праваслаўнага святара, з якім быў знаёмы. Тут, у Капцёўцы ён разам з айцом Міхаілам сустракаецца з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, а пры размеркаванні дапамогі па лініі каталіцкай дабрачыннай арганізацыі «Карытас» ніколі не падзяляе яе атрымальнікаў згодна з іх веравызнаннем.

У гэтых, стаўшых ужо любімымі для Лешака Дамагалы мясцінах яго ведаюць у многіх сем'ях, у тым ліку так званых цяжкіх, якім ён стараецца дапамагчы стаць на шлях сапраўды. А вось яшчэ адну сваю неад'емную місію ксёндз Дамагала, ён пахаваў каля шасцісот чалавек. Праўда, ёсць надзея, што дэмаграфічная сітуацыя будзе паляпшацца: на першага студзеня гэтага года насельніцтва на тэрыторыі Капцёўскага сельсавета ў параўнанні з тым жа перыядам мінулага года павялічылася з 5297 да 5320 чалавек.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## «БЕЛАРУСКІ ТЭАТРАЛЬНЫ АЛІМП»

У Беларусі з'явіцца прэмія ў галіне тэатральнага мастацтва «Беларускі тэатральны Алімп». Аб гэтым паведаміў рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Рычард СМОЛЬСКІ. Прадугледжваецца, што па выніках 2007 года будуць названы лепшыя рэжысёр, акцёр, мастак, спектакль. Узнагароды будуць уручацца ў Міжнародны дзень тэатра 27 сакавіка.

**БЕЛТА.**

# Хіт-парад... людзей

**Прыгожых і паспяховых мінчан зноўку пералічаць і занясуць у спіс. Праўда, змесціцца ў ім толькі 50 чалавек. Хто менавіта стане кандыдатам на ўваходжанне ў «Топ-50 самых прыгожых і паспяховых людзей горада Мінска» — стане вядома 15 лістапада.**

Ініцыятарам і арганізатарам праекта другі год запар выступае «Святочнае бюро Ларысы Грыбалёвай», а сама спявачка, прадзюсар і бізнэс-лэдзі будзе вядучай цырымоніі ўзнагароджання — гэткага гламурнага «Оскара» беларускага разліву. Дапамагаць Ларысе ў гэтай пачэснай місіі будзе, як плануюць арганізатары, адзін з найбольш рэйтынгавых тэлевядучых і шоўменаў Іван Ургант. Урачыстае агучванне «Топ-50» версіі 2007 года адбудзецца 1 снежня ў сталічным клубе «Bronx», дзе збяруцца эксперты прыгажосці і стылю, зоркі эстрады і тэлеэкрана, журналісты, дый самі намінанты — папулярныя асобы з самых розных сфераў. Дарэчы, мяркуючы па леташнім спісе «Топ-50», не абавязкова ўсе самыя прыгожыя і паспяховыя — мінчане, але ж гэта не страшна: сёлета нават карону «Міс Мінска» атрымала палачанка, і гэта нікога не засмуціла. Генеральны прадзюсар праекта Ларыса Грыбалёва, дарэчы, не выключае, што з цягам часу спіс пашырыцца і ў колькасным, і ў геаграфічным сэнсе, каб ахапіць усю Беларусь — дакладней, прыгожую і паспяховую яе частку.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Старт праекта ў лютым 2007 года.

Напередадзе — Каласавіны

# «...К ТАБЕ Я Ў ДУМКАХ ЗАЛЯТАЮ І ТАМ ДУШОЮ СПАЧЫВАЮ»

## Трэцяга лістапада краіна адзначыць 125-годдзе з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

**Каласавіны — менавіта так па традыцыі называюць святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да дня нараджэння Якуба Коласа. Сёлета яны будуць асабліва маштабнымі і цікавымі.**

Якуб Колас — Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч — нарадзіўся ў засценку Акінчыцы Мінскага павета ў сям'і лесніка. Вучыўся ў Мікалаеўшчынскім народным вучылішчы (1892—1894), скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1902). Настаўнічаў на Піншчыне. За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе ў вёсцы Мікалаеўшчына (1906), як ён сам пісаў, «быў звольнен ад настаўніцкай службы і да 1908 года быў пад доглядам паліцыі і жандараў. У 1908 г., 15 сенцябра, мяне асудзілі на тры гады ў крэпасць. Гэтыя тры гады выседзеў у Мінскім астрозе. Пасля гэтага год не меў месца...» У 1915-м мабілізаваны ў армію. Скончыўшы Аляксандраўскае ваеннае вучылішча, служыў у званні прапаршчыка, падпаручніка. У 1918-м як настаўнік вызвалены ад вайсковай службы настаўнічаў на Куршчыне.

У 1921 годзе па выкліку ўрада БССР вярнуўся ў Мінск. Працаваў у навукова-тэрміналагічнай камісіі, у літаратурнай камісіі Інбелкульта па збіранні вуснай народнай творчасці, выкладаў... Народны паэт Беларусі (1926), акадэмік АН Беларусі (1928)...

Паэт, чыё слова — на вякі.

*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары-лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць;*
*Гэтых гмахаў безгранічных*
*Балатоў тваіх, азёр,*
*Дзе пад гоман хваль крынічных*
*Думкі думае прастор;*
*Дзе увосень плачуць лозы,*
*Дзе вясной лугі цвітуць,*
*Дзе шляхом старым бярозы*
*Адзначаюць гожа пуць?*
*<...>*
*Брацце мае, беларусы!*
*У той кнізе людскіх спраў*
*Сам лёс, мусіць, для спакусы*
*Гэты край нам адзначаў.*
*Тут схадзіліся плямёны*
*Спрэчкі сілаю канчаць,*
*Каб багата адароны*
*Мілы край наш звяваць,*
*А нас цяжка ў сэрца раніць,*
*Пад прыгон узяць навек,*
*Нашы скарбы апаганіць,*
*Душу вынесці на здзек,*
*Каб у віры той ашукі*
*Знішчыць нашы ўсе сляды,*
*Каб не ведалі і ўнукі,*
*Хто такія іх дзяды.*

**(«Сымон-музыка»)**

***

— На Стаўбцоўшчыне, радзіме паэта, чатыры мемарыяльныя сядзібы, — расказвае дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская. — Акінчыцы, дзе нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, будучы Якуб Колас. Ласток, дзе ён пражыў з трох да васьмі гадоў з бацькамі (лічу, што паэма «Сымон-музыка» — гэта ўсплыў успамінаў пра яго жыццё ў Ластку). Альбуць, дзе Колас жыў даволі доўгі перыяд, яна вельмі хораша апісана ў «Новай зямлі» пад назвай Парэчча. А Смольня — гэта сядзіба, дзе пабудавана першая ўласная хата Міцкевічаў, ужо пасля смерці бацькі. Вы ж памятаеце, у паэме «Новая зямля» лейтматыў — зямля, свой кавалак зямлі... Бацька вельмі хацеў набыць свой кавалак зямлі. Пасля яго смерці дзядзька Антось з маці Якуба Коласа і дзецьмі перавезлі хату з Уздзеншчыны і пабудавалі ў Смольні. Гэта хутар непадалёк ад Мікалаеўшчыны. Увогуле коласаўскія сядзібы — гэта хутары ў лесе: бацька паэта быў лесніком і часта мяняў месца жыхарства.

Хата ў Смольні пабудавана ў 1910 годзе, Колас тады сядзеў у турме. Пасля вызвалення ў 1911 годзе ён прыехаў на гэту сядзібу і пасадзіў ліпы, якія да гэтага часу радуюць сваёй веліччу і прыгажосцю.

*О добры час дзянькоў прыгожых!*
*Ты знік у хвалях часоў божых,*
*І толькі ў думках і ўспамінах*
*Жывеш-гарыш у днях дзяціных.*
*Далёка я ад межаў родных*
*І дзён галодных і халодных*
*Пражыў нямала. Я гадаю,*
*Я родны край успамінаю,*
*Я ім жыву, я ў ім душою*
*І сэрцам кожнаю парою,*
*Як той нявольнік прагне волі,*
*Так прагну я ступіць на ролі*
*Сваіх палеткаў, ніў благенькіх,*
*Дарог і сцежачак крывенькіх,*
*Што гожа ўюцца спомеж жыта*
*Або срэдзь лесу самавіта.*
*І ўстануць з'явы, як жывыя,*
*Малюнкі сэрцу дарагія,*
*І моцна душу парываюць.*
*«Ідзі да нас! ідзі», — гукаюць.*
*Благаславёны час той будзе,*
*Калі я ў родным сваім людзе*
*Куточак бацькаў прывітаю*
*І радасць жыцця там пазнаю.*

**(«Новая зямля»)**

***

Якуб Колас запісаў у дзённіку 2 чэрвеня 1947 года: «...З раніцы ездзілі ў Смольню. Слаўная мясціна. Тая ж хата, у якой адбылася мая сустрэча з Янкам Купалам. На гумне агромнае буславае гняздо з буслам. Мае дрэвы павыраставалі. Проста не верыцца, што я саджаў іх 36 гадоў таму назад і так паразрасталіся яны за гэты час...»

***

— Сёлета споўнілася 40 гадоў з часу адкрыцця мемарыяльнай сядзібы ў Смольні, — адзначае Зінаіда Камароўская. — У 1967 годзе намаганнямі старэйшага сына Якуба Коласа, дырэктара і стваральніка музея Данілы Канстанцінавіча Міцкевіча была створана экспазіцыя пра жыццё і творчасць — у двухпавярховым будынку, які быў спецыяльна ўзведзены. А ўжо ў 1972 годзе створана экспазіцыя ў хаце, дзе жыла маці Коласа... У Смольні мы цалкам абнавілі экспазіцыю — можна нават сказаць, стварылі новую. Там працуе выстаўка, прысвечаная 95-годдзю першай сустрэчы Купалы і Коласа.

***

**Менавіта ў Смольні ў 1912 годзе адбылася першая сустрэча паэтаў, імёны якіх сталі знакавымі ў гісторыі нацыянальнай літаратуры.**

Вось як апісваў гэту сустрэчу сам Якуб Колас у лісце да літаратурнага крытыка Льва Клейнбарта, з якім быў добра знаёмы (ён нарадзіўся ў мястэчку Копысь Слуцкага павета, жыў у Ленінградзе). Ліст напісаны па-руску:

***«Личное мое знакомство с Янкой Купалой произошло летом 1912 года... Купала специально приехал повидаться со мною. И тогда и впоследствии Купала рассказывал о своем путешествии пешком со станции Столбцы в Николаевщину, где он был впервые. Верст восемь пройти нужно было лесом. Радзивилловские леса очень велики, и свежему человеку в них легко потерять дорогу. Зная, что Николаевщина стоит на Немане, Купала руководствовался тем соображением, что в сторону Немана должно быть больше влажности в воздухе, каковую он и ощущал, и благополучно дошел до места назначения, несмотря на ночную пору и незнакомство с местностью. Тогда Купала был цветущим красивым юнаком с мягкими, немного насмешливыми глазами. В тоне его разговора все время сквозил добродушный юмор. На меня он произвел прекрасное впечатление, и я полюбил его искреннею товарищескою любовью. Свое знакомство ознаменовали мы очень солидною выпивкою. Я старался не уступать Купале на этом поприще, но все же он оказался крепче меня. После выпивки пошли спать в гумно на горох. Назавтра Купала проснулся как ни в чем не бывало, а у меня трещала голова и была рвота. Но на другой день я подтянулся. В местечке Свержень мы зашли до знакомого ксендза, человека, сочувствующего белорусскому возрождению, и доброго выпиваки. Он очень радушно принял нас и угостил на славу. Ксендз отстал от нас и свалился, а мы выпили все его водки и вина и пошли в другое место, где опустошили также все запасы выпивки. Купала направился на станцию Столбцы, и на прощание мы и здесь выпили графин водки и, как говорится, остались «и не лысыми». Все время живем мы очень дружно, хоть переписки между нами и не было, если не считать очень немногих писем, которыми обменялись мы за всю жизнь. Купала небольшой охотник до переписки. Я, как опороченный человек в глазах начальства, также старался избегать ее. Кроме того, наше время слабо способствовало правильным сообщениям по почте. Второй раз встречались мы в 1913 г. в Вильно, когда Купала жил в редакции «Нашай нівы». Во время войны мы потеряли из виду друг друга, и до 1921 года я с ним не встречался».***

***

На Стаўбцоўшчыне шмат робіцца па ўшанаванні памяці Якуба Коласа, добраўпарадкаванні мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю славутага земляка. Старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама Уладзімір Міська і загадчык аддзела культуры Анатоль Грэкаў перакананы: гэта святая справа, складнік духоўнасці, масток паміж мінулым і будучыняй.

На Стаўбцоўшчыне штогод праходзіць рэспубліканскі фестываль юных музыкантаў «Сымон-музыка», у рамках якога традыцыйна ладзяцца літаратурныя сустрэчы «Слова пра Коласа» з удзелам паэтаў, пісьменнікаў, кампазітараў, мастацкіх калектываў раёна.

31 кастрычніка тут пройдзе вялікае літаратурнае свята, прысвечанае юбілею паэта.

***

— Юбілейныя Коласаўскія мерапрыемствы пачалі праводзіцца з мінулага года. У Беластоцкім ваяводстве ў Польшчы, у Гайнаўцы, экспанавалі выстаўку пра жыццё і творчасць Якуба Коласа. Выстаўка пабывала таксама ў Нясвіжы, Гомелі, Бабруйску, Маладзечне, у Шклове. Прычым менавіта ў юбілейныя гады мы вывозім экспанаты-арыгіналы. Гэтага мы не практыкуем, увогуле перамяшчэнне ўнікальных экспанатаў забаронена па інструкцыі. Але мы перакананыя: выключэнне з правілаў у юбілейныя гады цалкам абгрунтаванае.

**— Якія экспанаты ўдзельнічаюць у перасоўнай выстаўцы?**

— Асабістыя рэчы Якуба Коласа. Паэт нібыта ідзе да тых людзей, якія не могуць прыехаць да яго ў хату (наш музей, нагадаю, размяшчаецца ў доме, у якім жыў Колас). Вопратка, кіёк, ручка паэта, чарнільны набор, рукапісы, яго барометр, яго партфель... Мы гэта робім для таго, каб людзі адчулі прысутнасць Коласа. Таму што фатавыстаўка не дае таго эмацыянальнага зараду, які атрымлівае чалавек, калі судакранаецца, бачыць асабістыя рэчы.

Гэтыя выстаўкі карыстаюцца вялікай папулярнасцю, заўсёды шмат наведвальнікаў.

Коласаўскія фатавыстаўкі экспанаваліся ў Рысе і ў Вільнюсе ў рамках святаў беларускай песні, а таксама ў Кіеве ў час канферэнцыі літаратурных музеяў Украіны.

Адбылася цікавая сустрэча «Нашчадкі славутых людзей». Коласаўскі музей сябруе з кіеўскім музеем паэта Максіма Рыльскага. Там я пазнаёмілася з прапраўнучкай Тараса Шаўчэнкі і загарэлася жаданнем абавязкова арганізаваць сустрэчу ў нас, у Доме Коласа. Максім Рыльскі тут бываў, нават ёсць і кажух, якім ён накрываўся, калі прахалодна было ў хаце... У Мінск прыехаў унук Максіма Рыльскага, прапрапраўнук Тараса Шаўчэнкі, родзічка паэта Паўло Тычыны — і яны сустрэліся з малодшым сынам Якуба Коласа Міхасём Канстанцінавічам Міцкевічам (ён доктар тэхнічных навук), іншымі родзічамі: гэта была вельмі шчымлівая сустрэча. Мы стварылі выстаўку чатырох музеяў — Коласа, Рыльскага, Тычыны, Шаўчэнкі.

Сёлета мы дапаможам стварыць пакой Якуба Коласа ў Каралішчавічах. Гэта былы Дом творчасці, зараз там знаходзіцца дом адпачынку «На ростанях». Мы перадалі мэблю Коласа і нават тую піжаму, у якой Колас на фатаздымку ў Каралішчавічах... Атрымаўся цікавы літаратурны пакой. Гэта добра: людзі, якія там адпачываюць, могуць знаёміцца і з творчасцю Коласа, і іншых пісьменнікаў: прадстаўлены фатаздымкі, дзе Колас з пісьменнікамі, якія там адпачывалі.

**— Зінаіда Мікалаеўна, што падрыхтавалі сёлетнія Каласавіны?**

**— 30 кастрычніка** пачнецца 22-я навуковая канферэнцыя «Каласавіны». Акрамя беларускіх даследчыкаў, у ёй возьмуць удзел супрацоўнікі літаратурных музеяў Масквы і Кіева.

**1 лістапада** ў музеі адбудзецца традыцыйнае дзіцячае свята «Казкі жыцця». Выхаванцы дзіцячых садкоў будуць чытаць вершы, спяваць песні, танчыць. Яны сустрэнуцца з малодшым сынам Якуба Коласа, з беларускімі паэтамі і пісьменнікамі.

У Белдзяржфілармоніі 1 лістапада пройдзе ўрачысты вечар з нагоды 125-годдзя Якуба Коласа.

**2 лістапада** каля музея, на сядзібе Якуба Коласа, сумесна з магазінам «Акадэмкніга», Першамайскім райвыканкамам беларускай сталіцы, Стаўбцоўскім райвыканкамам мы ладзім прыгожае тэатралізаванае свята «Колас і кніга». Яно пачнецца ў 15 гадзін. Будзе шмат розных мерапрыемстваў: кніжная выстаўка-кірмаш, прэзентацыя кніг выдавецтва «Мастацкая літаратура», выступленні творчых калектываў... Сядзіба будзе адмыслова аформленая. Артысты ў вобразах Ганны і Міхала запросяць гасцей свята і паспяваць, і патанцаваць... У гэты ж дзень пройдзе і падвядзенне вынікаў літаратурнага конкурсу творчых работ «Мой родны кут, як ты мне мілы!».

**3 лістапада** на плошчы Якуба Коласа, каля помніка, у 10 гадзін пачнецца гарадское свята паэзіі.

Вялікая ўрачыстая вечарына адбудзецца ў гэты дзень у Віцебску ў Нацыянальным тэатры імя Якуба Коласа.

Шчыра запрашаем чытачоў «Звязды» на Каласавіны!

***

Юбілей класіка — гэта яшчэ адна магчымасць дакрануцца да яго творчасці, роздумаў пра лёс радзімы і ўласнае жыццё.

Чым большы жыццёвы шлях праходзіш, тым лепш усведамляеш (а часам і пераасэнсоўваеш) многія радкі Якуба Коласа, паэта-філосафа.

...Толькі рыхтуючы гэту публікацыю, я, нарэшце, зразумела, чаму менавіта ў самым пачатку паэмы «Новая зямля» паэт прызнаецца:

*О, як бы я хацеў спачатку*
*Дарогу жыцця па парадку*
*Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,*
*Сабраць з дарог каменні тыя,*
*Што губяць сілы маладыя, —*
*К вясне б маёй хацеў вярнуцца...*

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

# Фарбы і экспрэсія Ніды

***Чароўны куток літоўскай зямлі, узяты пад ахову ЮНЕСКА, — Куршская каса, стаў месцам сапраўдных паломніцтваў майстроў пэндзля: болей за дзесяць гадоў там адбываюцца міжнародныя мастакоўскія пленэры, у якіх заўсёды бралі ўдзел і беларускія мастакі. Пасольства Літвы ў Беларусі арганізавала выстаўку з калекцыі твораў, прысвечаных прыгажосці гэтага бурштынавага краю пад назваю "Экспрэсія Ніды", якая адкрылася і праходзіць у сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Выстаўка прымеркавана да 15-годдзя дыпламатычных адносінаў паміж Літвой і Беларуссю.***

**Фота Вольгі ЛАСКА.**

Анталогія беларускай песні

# Песенька шафёра

У мінулым дзесяцігоддзі Якаў Навуменка вынес на эстраду вясёлую «Песеньку шафёра». Пра няўрымслівых вадзіцеляў транспарту, пра іх імклівасць, цягу да руху, зменаў і пра нялёгкую працу складзена шмат музычных і мастацкіх твораў. А беларускія стваральнікі песні — паэт Анатоль Зэкаў і кампазітар Мікалай Алешка — адлюстравалі адметнасць, характэрную для нашага грамадства напрыканцы XX стагоддзя: кіроўцамі легкавога аўто стала аграмадная колькасць насельнікаў, і на спатканне яны спяшаюцца на машынах.

**Міхась ШАВЫРКІН.**




***Верш Анатоля ЗЭКАВА***
***Музыка Мікалая АЛЕШКІ***

*Еду, еду на спатканне*
*Па слізгоце, па шашы*
*Да цябе, маё каханне,*
*Што і ў сэрцы, і ў душы.*

*Прыпеў:*
*Паварот, паварот,*
*Там і тут віражы.*
*Галалёд, галалёд,*
*Не занось ты на шашы.*

*Я шчаслівы, я вясёлы,*
*А завея як назло*
*То шпурляе снег пад колы,*
*То цаляе прама ў шкло.*

*Прыпеў.*
*Не прашу падмогі ў ветру*
*Паказаць да любай след,*
*Да яе і сам даеду,*
*Як не вынесе ў кювет.*
*Прыпеў.*

# Нататкі мастака

## Добрыя людзі

### ХАДЫКА І АКУЛЯРЫ

Выкладчык у акулярах выглядае правільна. Ну каму, як не настаўніку, пасуюць акуляры? Можна задумацца і пачаць пералік іншых, але прасцей паверыць, што выкладчыкам і настаўнікам акуляры падыходзяць лепш, чым усім астатнім. Хадыка акуляры насіў. Таму ягоная гісторыя пра канфлікт у трамваі выглядала праўдзівай... У паўпусты трамвай зайшоў п'янаваты рабочы ў шэрай кепачцы. Яго хістанула на чалавека ў акулярах — акулярніка. «Ты, інцялягент, чаго піхаешся? Зараз як урэжу! Развялося вас — акулярнікаў; ні прайсці, ні праехаць!» Рабочы пачаў аглядацца па баках, шукаючы падтрымку публікі. Ён, відавочна, спадзяваўся, што пралетарскіх безакулярных твараў у трамваі будзе многа. А пабачыў ён зусім іншую карціну: кругом былі адны акулярнікі. У трамваі ехалі людзі ў акулярах, усе ў акулярах, акрамя яго. Рабочы перапужаўся так, што моўчкі вярнуўся да дзвярэй і выйшаў на першым жа прыпынку. Такую павучальную гісторыю пра акуляры я пачуў ад Хадыкі. А цяпер раскажу іншую, сваю гісторыю... На аддзяленне жывапісу прынялі студэнта ў тоўстых акулярах. Тыя акуляры, не памыліўшыся, можна называць біноклямі. Але сярод іншых студэнтаў гэны бінакулярнік вызначаўся не столькі кепскім зрокам, колькі тупасцю. Ён быў тупы і бяздарны настолькі, што Хадыка сказаў: «Трэба гнаць!» І я пагадзіўся б са сваім настаўнікам, каб ён не назваў прычыну, па якой трэба выгнаць няздару. «Вы бачылі, якія біноклі ў яго на носе? Ён прафнепрыдатны! Ён не можа быць жывапісцам, бо ў яго няма вачэй!» Як я запэражываў! Не за тупога бяздарнага пэцкуля ў біноклях, а за Алега Хадыку запэражываў. Ён не меў права папракаць студэнта акулярамі, а папракнуў.

### ЛЕНКА ЛОСЬ І МАНЕКЕНШЧЫКІ

Вялікая, канапатая, вясёлая, яна ўвесь час займалася рукадзеллем. Сшывала анучкі, пляла саломку, вышывала зоркі з кветкамі, вязала шалікі, шапкі і швэдры. А яшчэ Ленка Лось задзірыста смяялася. Ха-ха-ха на ўсю кватэру, ха-ха-ха на ўсю майстэрню, ха-ха-ха на ўвесь наш невясёлы свет. Я сябраваў не з Ленкаю, а з яе братам Алесем, адпаведна, яе бадзёрысты смех заўсёды быў недзе побач. А весяліў рыжавалосую Ленку Цэслер. Ён — вялікі майстар распавядаць показкі ды гісторыі, таму Ленка смяялася бясконца. «Ленка, табе падабаецца Цэслер?» — «Мне падабаецца Элтан Джон! Ха-ха-ха...» Рыжавалосая Ленка і папрасіла мяне пабыць манекеншчыкам. Я прынёс на выставу карціну, а яна — швэдар, шалік і шапачку з кутасом. «Давай, адзявай швэдрык, замотвай шалік і прайдзіся перад камісіяй...» — «Ідзі ты... Хай твой Вова Цэслер у шапачцы з кутасом павыступае...» — «Ну, Валодзя, ну міленькі, ну родненькі...» Пераапрануўся я ў Ленкіны шэдэўры, зайшоў у пакой, дзе засядала прыёмная камісія, і стаю. «Адамчык, ты чаго ў шапцы стаіш?» — спытаўся ў мяне старшыня камісіі Гаўрыла Вашчанка. «А гэта не я ў шапцы, гэта шапка, швэдар і шалік Лены Лось, а я проста манекеншчык...» — «Адамчык, ты ў нас яшчэ і манекеншчыкам падпрацоўваеш?» — «Папрасіла яна...» — «І часта цябе просяць манекеншчыкам працаваць?» — «Першы раз! Я прапаноўваў, каб Цэслер швэдар надзеў, але швэдар малы, не налез на яго!» — «Добра, ідзі...» — «А што Ленцы Лось сказаць?» — «Скажы, што швэдар выдатны, а манекеншчыка трэба прафесійнага прывадзіць, а не выкарыстоўваць сваіх кавалераў...»

### МУЖЧЫНЫ І АДПАЧЫВАННЕ

Раніца ў суботнім метро. Адзін мужчына кажа другому: «Учора класна адпачыў у гаражы!» Адпачыў ён сапраўды класна, бо водар таго адпачынку ніякі парфум не перашыбе. Бензін, перагар, тытунь і мужчынскі пот пахнуць на ўвесь вагон. Другі мужчына, напэўна, таксама адпачыў выдатна, бо, наставіўшы на мяне чырвоныя вочы, спытаў: «У вас валідолу не будзе?» Валідолу ў мяне няма, і я не адпачываў ноччу з пятніцы на суботу ў гаражы. Але пытанне... Няўжо я так выглядаю і пахну, што варта спытацца пра валідол?

### ЦЁГЛІС І АБУТАК

Робертас Цёгліс выправіўся з Вільні ў Прагу, каб зрабіць дамову на пастаўку мэблі. Ехаў ён на аўтобусе. Дзеля камфорту ўзяў з сабою тапкі. Дарога доўгая, цяжка і непрыемна ўвесь час сядзець у зімовым абутку, ды і ногі прэюць. Таму Цёгліс ехаў у кватэрных тапках, а чаравікі стаялі пад крэслам. У лёгкіх тапках ён і з аўтобуса ў Празе выйшаў, і на сустрэчу з пастаўшчыкамі прыйшоў. «Яны ў касцюмах, у белых кашулях, у модных туфлях, а я — у шэрых тапачках. Мае новыя чаравікі з'ехалі назад, у Літву... Дамовы я падпісаў, бо выгляд выглядам, а грошы грашыма. Але для чэшскіх пастаўшчыкоў я — Робертас Цёгліс — так і застаўся чалавекам у хатніх тапках».

### СЯРГЕЙ І ШКЛО

Сяргей Малішэўскі расказаў мне пра свой плач па бацьку... «Вестка пра татаву смерць, само развітанне, пахаванне ніякага ўражання на мяне не зрабілі. Быў я ў нейкай адстаранёнасці ад свету. Усё цякло само па сабе. Я нешта рабіў, казаў, некуды хадзіў і ездзіў, але рабілася ўсё тое механічна. Прайшло некалькі дзён пасля пахавання, і я прыйшоў у бацькаву майстэрню. Там рэчы былі парасстаўлены і параскладаны ягонай рукою. І я падумаў: вось тут яшчэ захоўваецца татаў парадак, а на мальберце стаіць ягоная недапісаная карціна, а на кавалку шкла свеціцца павыцісканая ягонай рукою алейная фарба. На шкле фарбы доўга не засыхаюць, яны захоўваюць першасную свежасць, яркасць, сакавітасць... Ну, ты ж і сам ведаеш, як робіцца палітра на шкле... Вось толькі што, вось тут ён быў, і больш яго няма, і ніколі-ніколі не будзе... У мяне ў сярэдзіне ўсё сціснулася. Я не мог адвесці вачэй ад шкляной палітры са свежымі фарбамі, глядзеў і глядзеў на ўсе гэтыя ўльтрамарыны, цэруліўмы, кадміі, вохры, марсы, сажы, пакуль не заплакаў».

### САВІЧ І АБЕДЫ

Вова Савіч ходзіць шпарка. Ён і робіць усё хутка. Здавалася б, выдатная рыса ў характары — дынамічнасць, але гэта не зусім так. Вова ўвесь час спяшаецца, ён нібыта некуды спазняецца. «Бягу, браце, бягу... Няма калі, дружа, няма калі...» Шмат разоў я тое чуў ад Савіча. Ці яшчэ такое: «А ты сягоння на абед сабе зарабіў? А я вось яшчэ не зарабіў... Трэба ляцець, трэба на абед зарабляць!» Мы абодва цудоўна ведаем: на абед ён зарабіў, і зарабіў ён сабе на тыя абеды на год наперад, але веды нашыя нічога не змяняюць. Савіч ляціць, спяшаецца і імчыцца. Толькі ў людзей складаецца ўражанне, што Вова спазняецца, не паспявае, не дадумвае, мітусіцца і не дазарабляе сабе на абед.

### ДАЧКА І СУСТРЭЧЫ

У выпадковай сустрэчы больш радасці, чым у запланаваным спатканні. Вось мільгануў у метро знаёмы твар, міжволі ўсміхаешся. Ідзеш па вуліцы, а насустрач — даўні прыяцель. Радасць шчырая, нязмушаная. Але больш за астатніх я люблю выпадкова сустрэць на вуліцы любімых жанчын — сваю маму і дачку Ядзю. Сягоння на пляцы Перамогі спаткаўся з Ядзяю, а яна ўся ружовая, твар гарыць. Дакрануўся да шчакі: «У цябе ж тэмпература!» — «Сягоння лепей, а ўчора я цэлы дзень устаць не магла...» — «Як жа гэта ты ўстаць не магла, калі ты да мяне на працу па грошы заходзіла?» — «Удзень заходзіла, а ўвечары захварэла...» — «Ідзі дамоў і паляжы...» — «Няма калі, трэба працаваць...» Ядзя пацалавала мяне ў шчаку і пабегла, а я расстроіўся

# ПУСТЭЧУ ЗАПАЎНЯЕ ЗАЛЕЖНАСЦЬ

**Чалавек спрабуе выкарыстоўваць залежнасці для дасягнення пэўных мэтаў. Аднак, калі доўга «пракачваць» адну канкрэтную рэч, то аднойчы яна... спустошыць і вынішчыць. Як жа быць? Ці можна стаць незалежным? Расказвае ўрач-псіхатэрапеўт Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Сяргей ЛАЗАРАЎ.**

— Адна з асаблівасцяў асобы — схільнасць выкарыстоўваць пэўныя правілы, прынцыпы, рэчы, рэчывы, адным словам, любыя падручныя сродкі для дасягнення сваіх мэтаў. Таму немагчыма і бессэнсоўна дзяліць залежнасці на дрэнныя ці добрыя, звычкі — на шкодныя ці карысныя, як і нельга ўзняцца над сваімі слабасцямі, таму што гэта насамрэч не слабасці, а шляхі вырашэння ўласных праблем. З залежнасцямі складана змагацца, таму што механізмы іх фарміравання не ўсведамляюцца людзьмі. Па-другое, у аснове кожнай, нават такой «дрэннай», да якой адносець ужыванне алкаголю, хаваецца некалькі складнікаў. Найперш — грамадска-культурны. Так, у нашым грамадстве сотні гадоў укаранялася ўжыванне алкагольных напояў. Перад кожным новым пакаленнем, асобным чалавекам паўстае дылема: піць ці не? Асаблівай пагрозы адразу і не бачна, паколькі пілі і бацькі, і прадзеды. Акрамя таго, да ўжывання алкаголю неадназначна ставяцца нават самі ўрачы: адны катэгарычна супраць, другія кажуць, што ў меру — можна. Пазіцыя царквы таксама лагодная, паколькі віно там асацыюецца з крывёю Хрыстовай і з'яўляецца адным з элементаў прычасця. Дарэчы, я сутыкаўся са свяшчэннаслужыцелем, у якога была алкагольная залежнасць, але сама царква ставіцца да такіх момантаў як да грахоўнага падзення канкрэтнай асобы. Традыцыя не асуджаецца. Другі складнік — асаблівасці самой асобы. Можна падзяліць нас на дзве ўмоўныя групы: на тых, хто мае паспяховыя стратэгіі перанясення жыццёвых цяжкасцяў, і тых, хто іх, на жаль, не мае. Прыгадайце сваё дзяцінства. Добрае — гэта калі цябе, па-першае, любяць, а, па-другое, паважаюць. Толькі ў такім выпадку вы станеце асобай самадастатковай і самацэнтраванай — якая знаходзіцца ў цэнтры сваёй «планетарнай» сістэмы. Тады вы — Чалавек-сонца, які разумее, што ад яго ўнутранага стану, патэнцыялу залежыць уладкаванне навакольнага свету, у тым ліку дзяцей, партнёра па шлюбе, сваякоў і г.д. Калі вы самадастатковы і ўстойлівы, значыць, у вас шмат сілаў і вы здольны саграваць навакольных, калі ж не, значыць, маеце нізкую ўстойлівасць да псіхаэмацыянальных нагрузак і дэманструеце сузалежныя паводзіны. Інакш кажучы, чалавек спадзяецца атрымаць нейкі дывідэнд за тое, што робіць. Але, як правіла, не атрымлівае. Залежная асоба траціць шмат сілаў, таму што спрабуе ва ўсім быць бездакорнай, дастойнай тых маральных крытэрыяў, якія існуюць, яна не знаходзіцца ў стане раўнавагі, імкнецца ўсё рабіць на выдатна, усім павінна, спрабуе кожнаму дапамагчы, абавязковая, напружаная... І гэта напружанне, назапашанае ў працэсе пераадолення нейкіх стрэсаў, жыццёвых цяжкасцяў прыводзіць да таго, што чалавек аднойчы перастае з ім сраўляцца, і пачынае шукаць якія-небудзь «мыліцы», у якасці якіх могуць выступіць алкаголь, тытунь, наркотыкі, лекавыя сродкі, ежа, нейкія віды актыўнай дзейнасці — адсюль любоў да экстрэмальных відаў спорту і г.д. Як толькі чалавек вызначаецца з «мыліцамі», яны становяцца сродкам вырашэння, інструментам дасягнення мэтаў на ўсё жыццё...

**— Мяркую, людзей-сонцаў вельмі няшмат...**

— Але яны ёсць. Ім дастаткова тых здзяйсненняў, якія яны маюць: скончыў інстытут — добра, нарадзіў дзіця — малайчына і г.д. Самадастатковая асоба заўсёды знаходзіць шматлікія шляхі для самарэалізацыі. А несамадастатковая заглушае душэўны боль. Тая ж алкагольная залежнасць — пабочны прадукт імкнення запоўніць душэўную пустэчу. Дарэчы, перанапружаны чалавек не абавязкова адразу пачынае парадаць ці злоўжываць алкаголем. Спачатку могуць з'явіцца трывога, навязлівыя думкі, напружанне, нездавальненне тым, што зроблена. Пагаршаецца якасць жыцця — калі перастае радавать тое, што радавала, зніжаецца працаздольнасць, сэксуальнае жаданне. У падлеткаў з'яўляюцца комплексы — нездавальненне сваёй знешнасцю, вагой і г.д. Чалавек не можа дасягнуць таго, чаго яму хацелася б, і ён паглыбляецца ў сябе, раздражняецца. Знясіленая асоба павінна ўсвядоміць, што з ёю адбываецца і чым гэта абумоўлена. Гэта — першы крок да свабоды.

Ну як можна вылечыць, напрыклад, хворую на анарэксію, якая катэгарычна не прымае ніякай лішняй вагі? Устаноўка настолькі жорсткая, што ніхто не дапаможа гэтай дзяўчыне перайсці ў стан здаровых людзей. З алкагалізмам, наркаманіяй, тытунёвай залежнасцю — тое ж самае. Такі хворы павінен захацець памяняць мадэль паводзінаў. Для таго ж алкаголіка яго жыццё — гэта паездка на шыкоўнай машыне па шыкоўнай дарозе, а цвярозае — хада пешшу па зарослай сцяжынцы. А трэба, каб менавіта цвярозае жыццё стала паездкай на шыкоўнай машыне. Кожны чалавек павінен адказваць за свае паводзіны і верыць, што можа ўсё. Канкрэтна ён, а не ўрачы і сучасныя тэхналогіі.

**— Як раптам стаць самадастатковай асобай, калі не пашчасціла з дзяцінствам?**

— Адзін з прыёмаў апісаны Карласам Кастанедам — «змяненне асобаснай гісторыі». Трэба працаваць дзеля змянення адносінаў да драматычных падзей і перажыванняў. Бо пакуты фарміруюцца ў комплекс: пэўны вобраз, маўленчае апісанне плюс эмоцыі. Калі чалавек узгадвае непрыемную сітуацыю, ён увесь і выпаўзае: ад карцінкі да ўзрушэння. Калі ж мы вырашаем канфліктны эпізод, «адпускаем» яго, то вызваляем частку энергіі. Можна выкарыстаць і методыку «работы над памылкамі». Уявіце сабе, што глядзіце відэафільм са сваім удзелам. У момант прагляду нараджаецца крытыка ў дачыненні да сябе і ўносяцца пэўныя карэктывы. Калі ўсё зроблена правільна, у другі раз вы пачняце інакш паводзіць сябе. Людзі перажываюць, шкадуюць сябе, асуджаюць іншых, наракаюць на бога. Нагул жа трэба разумець, што свет да нас — індыферэнтны, што няма ні чорных, ні белых палос, няма агрэсіі і ён не збіраецца нас з'есці. Усё, што мы адчуваем — вынік нашага ўнутранага стану. Калі мы патрацілі шмат сілаў на будаўніцтва нейкага замка на пяску, які вельмі лёгка разбураецца, то ў рэшце рэшт прыйдзем да таго, што нас не будуць радаваць ні дзеці, ні работа. Нічога. Бо сілаў не засталося. Знясілены чалавек драматызуе абставіны, даводзіць да абсурду сваё незадавальненне: ўсе — дрэнныя і ўсё — дрэнна. Вось мы і коцімся ў неўратычнае балота і нават самую простую задачу ўжо не можам вырашыць. Калі чалавек разумее, што з ім адбываецца, то прымае адказнасць на сябе і пачынае мяняцца. Дарогу адолее той, хто ідзе. І яшчэ: калі ты не любіш сябе, то ніколі не зможаш палюбіць бліжняга. Калі ты злодзей, то ўбачыш навокал злодзеяў, калі пралюбадзей, то будзеш падазраваць жонку. Мексіканскія шаманы лічылі, што з моманту нараджэння чалавек змяшчаецца ў люстраное асяроддзе, у якім бачыць... сябе. З другога боку, нашы думкі, як вядома, здольныя матэрыялізавацца. Уявіце сабе наступны ход думак: мае сваякі хворыя — мая маці была няшчасная — я няшчасны — я хворы. Паступова гэта захаваецца ў глыбіні свядомасці, і на адну нашу пазітыўную думку ўзнікне тысяча негатыўных: «людзі хварэюць» — «сваякі хварэлі» — «я хварэю». Чым больш мы драматызуем, тым глыбей пагружаемся ў «драму». Давайце спытаем у тых, хто наведвае любую медустанову, чаго яны чакаюць ад гэтых наведванняў? Адна справа думаць «я хачу быць здаровым», і зусім іншая — «я не хачу хварэць», а большасць пацыентаў думаюць менавіта так. Апошняе раскрывае той жа ланцуг: не хварэць — хварэць — бальніца — лячэнне. Тут няма і слова пра здароўе. Які вынік мы можам атрымаць у такім выпадку? Адсутнасць абвастрэння. Вось усе і ходзяць у рэмісіі. Чалавек ужывае, напрыклад, снатворнае, і дзён дзесяць яно яму дапамагае, але ён нічога за гэты час не памяняў і праз нейкі час вяртаюцца і дрэнныя думкі, і дрэнны вынік.

**— Іншымі словамі, галоўны складнік любога захворвання — псіхалагічны...**

— Правільна. Скажам, ад той жа імпатэнцыі немагчыма пазбавіцца з дапамогай таблетак ці масажу прастаты. Уразлівы, трывожны чалавек сутыкнуўся, напрыклад, з несправядлівым выказваннем жанчыны ў свой адрас і яго выбіла з каляіны. Праблема хаваецца ў яго галаве. Вось чаму трэба спачатку прыняць сваю праблему. У процілеглым выпадку рэмісія, у тым ліку алкагольная, абавязкова скончыцца і ўсё вернецца. Вынік можна атрымаць толькі тады, калі ёсць жаданне стаць гаспадаром свайго жыцця. Усвядоміць, што твайму здароўю і ўладкаванню сям'і пагражае не шкодная звычка, а небяспечнае захворванне, якое існуе звыш 8 тысяч гадоў, якое прывяло да заўчаснай смерці шмат людзей.

**— Вы тлумачыце ўсё гэта пацыентам?**

— Спрабую. І таму магу сцвярджаць: калі хворы прыходзіць на прыём па просьбе сваяка ці таму што знаёмыя ўгаварылі — нічога не атрымаецца. Асмелюся меркаваць, што алкагалізм — захворванне масавае, і думаць, што яно мае дачыненне выключна да нейкіх ізгояў, па меншай меры няправільна. Нядаўна за шэсць дзён я агледзеў 120 чалавек у шасці гарадах Беларусі. Сярод хворых былі нават 16-гадовыя дзяўчаты.

**— Не думаю, што тут можна было абысціся без прымянення аднаго з распаўсюджаных псіхатэрапеўтычных метадаў — кадзіравання...**

— Гэта ўсяго толькі інструмент, які пры правядзенні адпаведнай падрыхтоўкі добра ўздзейнічае. Іншая справа, матывацыя ў дадзеным выпадку грунтуецца выключна на забароне: «алкаголь — атрута, ужываць яе нельга». Калі гэта і спрацоўвае, то на кароткі час. Доўгатэрміновая матывацыя павінна быць пазітыўнай: «я хачу жыць». Бо алкагалізм — пухліна, якая «прарастае» ў чалавеку і паступова разбурае асновы асобы. Алкаголік павінен зразумець, што ён гіне. Калі прыйдзе гэта ўсведамленне, можна выкарыстоўваць іншыя методыкі. Удалося «ўвайсці» у рэмісію — рухайся далей. Не чакай, пакуль скончыцца яе тэрмін, вучыся атрымліваць задавальненне ад цвярозага жыцця, кантралюй думкі і асацыяцыі. Той, хто ўжывае безалкагольнае піва ці думае, як сумна цяпер на вяселлях, аднойчы сарвецца, «працісне забарону». Як толькі алкаголік адчуў, што з'явілася цяга, трэба зноў бегчы да спецыяліста, шукаць выйсце.

**— Што канкрэтна вы прапануеце сваім пацыентам у цэнтры?**

— Я называю гэта «тэрапіяй пяці сустрэч». Падчас іх праводзіцца кансультацыйная работа над усведамленнем праблемы, фарміраваннем мэты — новага пазітыўнага выніку і замацаваннем дасягнутага на ўзроўні падсвядомасці з дапамогай сучасных і эфектыўных псіхатэрапеўтычных сродкаў.

**Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.**

**Республиканский центр медицинской реабилитации и бальнеолечения**

***25 лет безупречной службы на защите Вашего здоровья!***

- Эндокринолог, гинеколог, уролог, невролог, терапевт, педиатр, гомеопат, ЛОР-врач, офтальмолог
- Психотерапия
- Диагностика: лабораторная, функциональная, рентгенологическая, УЗИ всех органов, фиброгастроскопия, колоноскопия
- Стоматология
- Водолечение
- Грязелечение — сапропелевые **и иловые сакские грязи Крыма**
- Традиционная китайская медицина
- Различные виды массажа, солярий
- SPA-комплекс

**г. Минск, ул. Макаенка, 17.**
**Справка — тел. 267 65 10,**
**предварительная запись — 266 27 70(71).**

**www.med.rehabilit.belhost.by**
**E-mail: dispanser@mail.belpak.by**

**Лицензия 02040/0204820 выдана Министерством здравоохранения Республики Беларусь, действительна до 26 августа 2009 года.**

**Лячэнне неўратычных расстройстваў, алкагольнай залежнасці.**
**Сучасная псіхатэрапія — гэта сродак дасягнення пастаўленай мэты!**

***Пытанні можна пакінуць на сайце***
**www.independ.narod.ru.**

# Грыбок — ваша праблема?

**Грыбок пазногцяў і ступняў — найбольш распаўсюджаныя віды грыбковых захворванняў (па-навуковаму — мікозы) чалавека.**

Грыб-паразіт, які пасяліўся на скуры, здольны атруціць жыццё любому. І асабліва шмат клопатаў і непрыемнасцяў выклікае грыбок, які атабарыўся на скуры ног, рук, пазногцях. Людзей, якія сталі яго ахвярай, у першую чаргу займае знешні бок пытання — трэскаецца і лушчыцца скура, крышацца пазногці. Аднак, на думку ўрачоў, эстэтычная праблема тут далёка не галоўная. Размова ідзе пра сур'ёзнае захворванне, якое патрабуе працяглага лячэння. Асноўная небяспека грыбковага пашкоджання заключаецца ў тым, што хвароба ўвесь час прагрэсуе. Калі грыбок не лячыць, то, пачаўшыся на адным пазногці, ён пяройдзе на іншыя, а затым і на ўчасткі скуры, пазногці рук. У рэдкіх выпадках сустракаецца нават пашкоджанне ўнутраных органаў. Акрамя таго, узбуджальнікі гэтага захворвання, з'яўляючыся вельмі моцнымі алергенамі, могуць уплываць на адчувальнасць арганізма і тым самым выклікаць разнастайныя алергічныя рэакцыі.

Спецыялісты сцвярджаюць, што распаўсюджанне грыбковых інфекцый часцей за ўсё абумоўлена аслабленнем імунітэту, але існуюць і пэўныя правакуючыя фактары:

- трэшчынкі, ранкі ў складках паміж пальцамі, што выклікана патлівасцю або сухасцю скуры, пацёртасцю, дрэнным высушваннем пасля водных працэдур, вузкасцю міжпальцавых прамежкаў, плоскаступнёвасцю, нашэннем цеснага абутку і інш.;
- сасудзістыя і эндакрынныя захворванні, абмаражэнне канечнасцяў, праца ў стаячым становішчы, варыкознае расшырэнне венаў, стрэсы;
- праца ў металургічнай і хімічнай прамысловасці; таксама на мікозы часта хварэюць ваеннаслужачыя і спартсмены;
- павышаецца верагоднасць развіцця хваробы ў жанчын падчас цяжарнасці і ў пасляродавы перыяд (аслабленне імунітэту, анемія, дэфіцыт пажыўных рэчываў і вітамінаў у выніку кармлення дзіцяці грудным малаком).

Захворванне перадаецца пры цесным кантакце з хворым або праз прадметы, якімі ён карыстаўся.

І мужчыны, і жанчыны становяцца ахвярамі мікозаў амаль з роўным поспехам. А вось дзеці ад грыбка пакутуюць намнога радзей, бо рэгенерацыя тканак, замена старых новымі, у іх адбываецца вельмі хутка. Нават пазногці ў малых растуць значна хутчэй, чым у дарослых, а грыбок, наадварот, развіваецца даволі марудна. І ўсё ж цалкам выключыць дзяцей з групы рызыкі нельга. Заражаюцца яны, як правіла, ад бацькоў і, як ні дзіўна, праз абутак: красуючыся па кватэры ў маміных туфлях, дзяўчынка рызыкуе падхапіць мамін грыбок.

Асноўныя ўзбуджальнікі хваробы — грыбы-дэрматафіты. Для іх развіцця і росту неабходнае вільготнае асяроддзе. Вось чаму павышаная патлівасць і вільготны абутак з'яўляюцца правакуючымі фактарамі развіцця грыбковых захворванняў, а асноўныя месцы заражэння — плавальныя басейны, лазні і душавыя, на вільготнай падлозе якіх грыбкі знаходзяць надзвычай спрыяльныя ўмовы для свайго існавання.

Развіваюцца грыбкі ў нейтральным або слаба шчолачным асяроддзі. Найбольш спрыяльнае значэнне РН для іх — 6—6,7. Неабходна падкрэсліць, што РН скуры здаровага чалавека складае 5,5, што з'яўляецца адным з фактараў засцярогі скурнага покрыва ад грыбковай інфекцыі. Некаторыя хранічныя захворванні, а таксама празмерная патлівасць суправаджаюцца зрухам РН скуры ў шчолачны бок, што і робіць яе безабароннай перад грыбковымі хваробамі.

Споры грыбка лёгка вытрымліваюць нізкія тэмпературы. Яны застаюцца жыццяздольнымі і могуць выклікаць хваробу нават пасля замарожвання. Высокія тэмпературы, наадварот, згубна ўздзейнічаюць на грыбкі. Вільготная гарачыня пры 75 градусах ужо праз 15 хвілін выклікае іх гібель. Пры кіпячэнні грыбкі гінуць на працягу 3—5 хвілін. Таму высокая тэмпература можа быць выкарыстана пры грыбковых захворваннях у якасці метаду дэзінфекцыі.

Добра пераносяць грыбкі і высушванне. Яно не забівае іх, а толькі на час затрымлівае або спыняе рост і размнажэнне. У высушаных валасах і лускавінках, якія хворы страчвае з паверхні пашкоджаных ачагоў, грыбковыя споры захоўваюць жыццяздольнасць гадамі. Трапляючы потым у спрыяльныя ўмовы (напрыклад, на скуру чалавека), яны зноў пачынаюць сваю разбуральную дзейнасць.

Класічны пачатак захворвання — невялікія трэшчынкі паміж пальцамі, якія не выклікаюць ніякіх асаблівых адчуванняў, а таму звычайна застаюцца незаўважанымі. Далей развіваюцца сверб, пачырванение, лушчэнне, невялікі сып у выглядзе пухіркоў, якія лопаюцца і чэшуцца. Затым у складках скуры, паміж пальцамі, на далонях і ступнях з'яўляюцца ўчасткі, быццам бы прысыпаныя мукой, а скура становіцца яшчэ больш сухой, чым звычайна. Пры развіцці хваробы мучністыя высыпанні пакрысе згортваюцца і ператвараюцца ў малюсенькія колцы. Праяўленні захворвання на пазногцях залежаць ад віду грыбка, а таксама ад ступені і глыбіні пашкоджання інфекцыяй. Перабраўшыся на пазногцевую пласціну, дэрматафіты звычайна заяўляюць аб сабе жоўтымі плямамі ці падоўжнымі палоскамі па баках або ў цэнтры пазногця. На руках пазногці таксама бываюць «упрыгожаныя» падобнымі палосамі, але больш светлымі — белаватымі або шэрага адцення. Увогуле колер хворых пазногцяў можа быць розны: жоўты, карычневы, чорны, шэры, белы. Некаторыя грыбкі патанчаюць пазногцевую пласціну з бакоў, пры гэтым яна адстае ад пазногцевага ложа і набывае жаўтаватую афарбоўку. Часта захворванне пачынаецца з пазногцевых валікаў, звычайна на руках. Валікі патаўшчаюцца, ацякаюць і чырванеюць, па краі з'яўляюцца серабрыстыя лускавінкі, паступова знікае пазногцевая скурка. Да працэсу можа далучыцца бактэрыяльная інфекцыя, у такім выпадку магчыма нават нагнаенне. Сілкаванне тканкі ў вобласці валіка парушаецца, у выніку з'яўляюцца папярочныя канаўкі. Дэфекты пазногцяў могуць правакаваць нават фізічны боль: змяняецца хада і ўчора яшчэ такія любімыя туфлі прыносяць адны пакуты. Праз некаторы час пасля першых праяў хваробы становіцца складана працаваць на камп'ютары, мыць посуд, нават зашпільваць раменьчыкі на туфлях. Вы саромеецеся падаць руку, навакольныя баяцца дакрануцца да вашых знявечаных пазногцяў. Што ж рабіць?

Заўважыўшы першыя адзнакі захворвання, звярніцеся да ўрача-дэрматолага. Ён правядзе агляд, ацэніць таўшчыню і структуру пазногця, зробіць саскрэбванне тканак для аналізу. Толькі так урач зможа вызначыць наяўнасць грыбка, яго від і прызначыць індывідуальнае лячэнне. Лячэнне грыбка абавязкова комплекснае: таблеткі для прыёму ўнутр плюс мазі, лакі, пластыры вонкавага прымянення. Сучасныя процігрыбковыя сродкі, як правіла, прымаюць на працягу 2—3 месяцаў. У цяжкіх выпадках даводзіцца ісці на выдаленне пазногцевай пласціны з наступным лячэннем. Пасля гэтага вырастае новы пазногаць, хоць яго паверхня спачатку можа быць і няроўнай. У працэсе лячэння грыбковай інфекцыі і пасля яго важна прадэзінфіцыраваць усё, да чаго «дакранаўся» грыбок. Для гэтага ўрач выпіша рэцэпт, па якім у аптэцы прыгатуюць неабходны раствор. Абавязковай дэзінфекцыі падлягаюць падлога, сцены, ванны пакой, а таксама асабістыя рэчы хворага: бялізна, абутак, прадметы догляду скуры і пазногцяў.

І вось — падчас доўгага лячэння — знешнія праявы хваробы зніклі і неўзабаве вырастуць здаровыя пазногці. Але памятайце! Грыбковая інфекцыя — дастаткова каварная. У сувязі з гэтым, нават пры відавочным станоўчым выніку, неабходна зрабіць кантрольныя аналізы некалькі разоў, каб пераканацца: грыбок — не ваша праблема! Цяпер праблема ў тым, каб не «падхапіць» грыбок зноў. Таму прыміце да ўвагі наступныя парады:

- своечасова лячыце хранічныя захворванні;
- выключыце выкарыстанне абутку, адзення, асабістых прадметаў хворага на грыбок чалавека;
- даглядайце скуру ног і рук, пазбягайце траўмаў (не насіце цеснага, грубага абутку);
- апрацоўвайце скуру ступняў процігрыбковай маззю да і пасля наведвання грамадскай лазні, спартзалы або басейна; хадзіце туды толькі ў сваіх гумовых шлёпанцах; вярнуўшыся з пляжа або лазні, абавязкова памыйце ногі гарачай вадой з мылам;
- раз на тыдзень у мэтах профілактыкі можна пакрываць пазногці процігрыбковым лакам;
- ні ў якім разе не прымярайце абутак у магазіне на босую нагу і не карыстайцеся капронавым слядком, які прапануюць прадаўцы;
- калі ідзяце ў госці, лепш захапіць з сабой туфлі — і выглядаць будзеце эфектна, і засцеражацеся ад заражэння грыбком;
- не насіце ў гарачае надвор'е красоўкі, нават з баваўнянымі, а тым больш з сінтэтычнымі шкарпэткамі; летам абутак павінен абавязкова прапускаць паветра, каб скура дыхала і заставалася сухой;
- сачыце за якаснай санітарнай апрацоўкай інструментаў для манікюру і педыкюру ў салонах.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## Доктар адкажа

### ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) будуць:

**29 кастрычніка** — галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Уладзімір Пятровіч МАКСІМЧУК.

**30 кастрычніка** — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П.М. Машэрава Сяргей Рыгоравіч ГУСЕЎ.

**31 кастрычніка** — галоўны спецыяліст-радыёлаг Міністэрства аховы здароўя Георгій Васільевіч ЧЫЖ.

**1 лістапада** — галоўны ўрач 5-й сталічнай гарадской клінічнай бальніцы Міхаіл Фёдаравіч НАЗАРЧУК.

# ЗАВЯЗАЛІСЯ ВУЗЛЫ?

**5 верасня ў нашай газеце быў апублікаваны артыкул пад назвай «Хворы загінуў у бальніцы, а ўрач у калонію не трапіў. Чаму?». Нагадаем чытачам змест матэрыялу.**

**У чэрвені 2005 года пасля хірургічнай аперацыі па выдаленні грыжы памёр 30-гадовы жыхар Брагіна, бацька двух непаўналетніх дзяцей Яўген Піліпенка (у тым артыкуле ўсе прозвішчы былі зменены). Смерць пацыента, як устанавіў суд, наступіла па віне анестэзіёлага-рэаніматолага Аляксандра Арлова, які ў 2004 годзе закончыў Гомельскі медыцынскі інстытут і які, праходзячы гадавую інтэрнатуру ў абласной клінічнай бальніцы, быў накіраваны ў Брагін для аказання лячэбна-прафілактычнай дапамогі насельніцтву на пасаду ўрача-стажора анестэзіёлага-рэаніматолага. Рэчыцкі раённы суд, які разглядаў узбуджаную крымінальную справу ў лістападзе 2006 года, прыйшоў да высновы, што медык, ажыццяўляючы анестэзіялагічную дапамогу хвораму ў пасляаперацыйны перыяд, не на належным узроўні выконваў свае прафесійныя абавязкі і дапусціў некалькі грубых памылак, якія і прывялі да лятальнага зыходу пацыента. Прыгавор суда такі: чатыры з паловай гады абмежавання волі без накіравання ў калонію. За ім застаецца права працаваць урачом. Брагінская цэнтральная раённая бальніца як грамадзянскі адказчык павінна выплачваць грашовую дапамогу штомесяц дзецям Піліпенкі да іх паўналецця, а сам медык — аплаціць расходы на аказанне юрыдычнай дапамогі. Сям'і памерлага прызначана кампенсацыя за маральную шкоду.**

**Трэба зазначыць, што на судзе ўрач-стажор не прызнаў сваёй віны і даказваў, што чалавек памёр з-за таго, што ў сістэме газазабеспячэння закончыўся кісларод, без якога не маглі дапамагчы ніякія іншыя лекі, а калі ён даведаўся, што ў газеце з'явіўся артыкул пра падзеі ў Брагінскай ЦРБ, прыслаў нам вось гэтае пісьмо.**

## Вяртаючыся да надрукаванага

*«Адразу хачу сказаць, што не маю ніякіх прэтэнзій ні да вашай газеты, ні да журналіста, які напісаў артыкул, таму што добра разумею: усё было напісана згодна з прыгаворам суда, які прайшоў усе інстанцыі, нават Вярхоўны Суд. Не жадаю таксама аспрэчваць і рашэнне Вярхоўнага Суда — тут для гэтага не час і не месца. У мяне ёсць толькі жаданне данесці да чытачоў газеты некаторыя моманты, факты і дакументы, якія не былі адлюстраваны ў прыгаворы і артыкуле, але якія мелі месца падчас развіцця крымінальнай справы. А далейшыя высновы хай кожны робіць сам.*

*Я сцвярджаў, што прычынай трагедыі была адсутнасць кісларoду, які скончыўся пасля аперацыі, калі хвораму неабходна была падтрымка штучнай вентыляцыі (у яго ў час абуджэння развіўся моцны спазм бронхаў, на які не ўздзейнічалі ніякія лекі). Адміністрацыя лякарні сцвярджала, што версія пра праблемы з кіслародам з'явілася пазней, падчас следства. Суд вырашыў заняць бок адміністрацыі лякарні і згодна з заключэннем асобных экспертаў зрабіў выснову, што лекар-стажор выбраў не той рэжым штучнай вентыляцыі лёгкіх, што выклікала развіццё вострай дыхальнай недастатковасці і смерць.*

*Дарэчы, мае калегі-анестэзіёлагі, прабачце, толькі ўсміхаліся, калі чыталі пра прысуд. Справа ў тым, што на тым апарацце, на якім я працаваў (МК-1) ёсць толькі адзін прымусовы рэжым штучнай вентыляцыі і іншага выбраць немагчыма. Калі казаць пра параметры гэтага рэжыму (колькі разоў у хвіліну чалавек дыхае, на якую глыбіню), то гэтыя рэчы вывучаюцца на другім курсе медінстытута і добра вядомыя кожнаму студэнту. Гэта — азбука. І праводзіць наркоз, не ведаючы яе, тое ж самае, як займацца вышэйшай матэматыкай, не ведаючы табліцы памнажэння. Таксама не бывае так, што анестэзіёлаг памыляецца ў выбары гэтых параметраў, але дзве гадзіны апераціі добра праходзяць, хворы нават прачынаецца, а потым праз тры гадзіны памірае. Не бывае і так, што анестэзіёлаг, які бачыць, што хвораму не хапае паветра, не пачынае змяняць гэтыя параметры ў бок павелічэння (дарэчы, у гісторыі хваробы добра адлюстравана, што я гэта рабіў некалькі разоў, і ні ў каго з экспертаў не было прэтэнзій да гэтага).*

*Што ж сапраўды здарылася ў той чорны дзень у Брагіне? Адказ на гэта дало следства, якое цягнулася больш за год. Вывучаючы матэрыялы службовых даследаванняў упраўлення аховы здароўя (іх было два, і ў кожным з іх сцвярджалася, што ў Брагіне былі праблемы з кіслародам), праводзячы допыты працаўнікоў лякарні і родных памерлага, следства прыйшло да адназначнай высновы: кісларод у той дзень сапраўды адсутнічаў. Пра гэта казала перш за ўсё жонка памерлага, якая першапачаткова абвінавачвала дактароў у тым, што яе муж задыхнуўся без кіслароду. Родныя памерлага казалі, што неаднаразова чулі ад дактароў словы пра адсутнасць кіслароду. Кіраўнік лякарні сцвярджаў, што той дзень ён памятае вельмі добра, таму што гэта быў адзіны выпадак, калі ён экстранна ездзіў па кісларод. Аперацыйная сястра чула ад лекара-стажора словы пра тое, што кісларод хутка скончыцца. Сястра-анестэзістка цалкам пацвердзіла адсутнасць кіслароду і нават назвала час, калі ён знік канчаткова. Урач-хірург распавядала пра тое, што на наступны дзень галоўны ўрач склікаў да сябе ўсіх дактароў — удзельнікаў трагічнага выпадку — і строга сказаў ім: нічога пра праблемы з кіслародам не казаць. Усё гэта ёсць у матэрыялах следства, як і шмат іншых доказаў. Адзначу і той факт, што пракурор Гомельскай вобласці А. Палавінка вяртаў крымінальную справу да следчага з патрабаваннем прыцягнуць да адказнасці адміністрацыю бальніцы за факт адсутнасці кіслароду, што так і не было зроблена.*

*Факт адсутнасці кіслароду нікім не ставіўся пад сумненне амаль да канца апошняга судовага пасяджэння. Першапачатковае абвінавачванне мяне было ў тым, што ва ўмовах адсутнасці кіслароду я павёў сябе непрафесійна. Лічу, што па гэтым абвінавачванні я цалкам даказаў сваю невінаватасць. Нават эксперты з Мінска згадзіліся, што я сутыкнуўся з даволі цяжкім выпадкам і што без кіслароду было вельмі цяжка нешта зрабіць. Пасля гэтага я лічыў, што справа мной выйграна. Але напрыканцы суда, калі ўжо было немагчыма выклікаць сведкаў, пракурор стала сцвярджаць, што, паводле яе меркавання кісларод у бальніцы быў, у аснову чаго былі пакладзены паказанні кіслародчыка, адміністрацыі бальніцы і мае асабістыя, якія я даваў першапачаткова следчаму ў якасці сведкі пад ціскам адміністрацыі. Пры гэтым шмат сведкаў, якія казалі пра адсутнасць кіслароду, у суд нават не выклікаліся. Упэўнены, што менавіта гэта і абумовіла такі прысуд. Фактычна, напрыканцы суда мне было прад'яўлена новае абвінавачванне, па якім мне ўжо не далі магчымасці абараняцца і па якім асудзілі. Лічу, што тым самым быў груба парушаны Крымінальна-працэсуальны кодэкс, які патрабуе пры змяненні абвінавачвання правесці зноў допыт, а таксама даць магчымасць абараняцца (у тым ліку і выклікаць сведкаў) па новым абвінавачванні.*

*Улічваючы ўказаныя абставіны, прэзідыум абласнога суда адмяніў прыгавор суда першай інстанцыі і адправіў справу на новы судовы разгляд. Але замест гэтага яна пайшла ў Вярхоўны Суд разам са скаргамі суддзі Рэчыцкага раённага суда і жонкі памерлага. Праз месяц калегія Вярхоўнага Суда адмяніла рашэнне прэзідыума абласнога суда і пакінула прыгавор без змянення. На надглядныя скаргі, якія дасылалі я і мой адвакат туды, матываванага адказу мы так і не атрымалі. Зараз я падаў скаргу на імя генеральнага пракурора рэспублікі Пятра Пятровіча Міклашэвіча. Я не прашу мяне апраўдаць, а прашу толькі аб гарантаванай законам кожнаму грамадзяніну магчымасці абараніцца, якая была парушана.*

*Хачу яшчэ дадаць, што я вырашыў працаваць у Брагіне, каб паказаць, чаго я варты. Цэлы год працаваў адзін, часта без святаў і выхадных, таму што проста не было таго, хто мог бы мяне падмяніць. За гэты час было шмат чаго. Даводзілася праводзіць вельмі складаныя наркозы, якія працягваліся да 11 гадзін (хворага аперыравалі тры брыгады хірургаў, і праз два тыдні ён пайшоў з лякарні сваімі нагамі), даводзілася яшчэ неаднаразова працаваць без кіслароду (навучаны горкім вопытам, кожны раз я пісаў лісты на імя галоўнага ўрача — такіх выпадкаў было тры). І толькі прафесійныя дзеянні калектыву рэанімацыі дапамагалі выратоўваць хворых. Дарэчы, на момант майго прыезду ў Брагін і рэанімацыі самой не было. Менавіта за той год, калі я там працаваў, і было адкрыта рэанімацыйнае аддзяленне на тры ложкі. Я кіраваў набыццём неабходнай апаратуры, быў набраны штат супрацоўнікаў, якіх я асабіста навучаў спецыфіцы работы з цяжкімі хворымі. Усе гэтыя поспехі былі адзначаны і Прэзідэнтам нашай краіны Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам, які на 20-годдзе чарнобыльскай трагедыі прыязджаў у Брагін і асабіста мне паціскаў руку, што паказвалі ўсе цэнтральныя тэлеканалы.*

*Як чалавек веруючы я не трымаю ні на каго зла. Ведаю, што вышэйшая справядлівасць усё роўна ў свой час усё паставіць на сваё месца. А ўсё тое, што са мной адбываецца, я ўспрымаю толькі як іспыт, які мне неабходна прайсці, захаваўшы веру, надзею і любоў.*

*Звяртаюся да пацярпелай Алены Мікалаеўны. Прабачце, калі ласка, што не змог выратаваць вашага мужа, бацьку вашых дзяцей. Усё сваё жыццё я буду памятаць гэту трагедыю, з якой пачалася мая прафесійная дзейнасць. У той жа самы час прашу: не трымайце на мяне зла. На сваім месцы я на самай справе зрабіў усё, што мог. Маёй віны ў тым, што адбылося, няма. Вы самі гэта ведаеце.*

***Лічу, што мне няма чаго саромецца, і таму падпісваюся сваім сапраўдным прозвішчам. З павагай да вашай газеты і ўсіх яе чытачоў Арцём АДАМЕНКА».***

Вось такое пісьмо, якое, на нашу думку, нельга было пакінуць без увагі. Па некалькіх прычынах. Вядома ж, што папярэдні матэрыял «Хворы загінуў у бальніцы, а ўрач у калонію не трапіў. Чаму?» быў падрыхтаваны мною тады, калі крымінальная справа прайшла ўсе інстанцыі і прыгавор уступіў у законную сілу пасля разгляду яе ў Вярхоўным Судзе краіны. Натуральна, сумнявацца ў няправільнасці, неаб'ектыўнасці падыходу да канкрэтнага абвінавачанага ў дадзеным выпадку не даводзіцца

# ГРАНІ ГРАНІТА

Я зноў бачу кратэр. За два гады ён пашырыўся, стаў яшчэ глыбей. Зараз ніжняя адметка кар'ера 138 метраў. Менавіта з такой глыбіні пад Мікашэвічамі адкрытым спосабам працягваецца здабыча граніту. Трыццаць гадоў таму, калі пачыналася здабыча, наўрад ці думаў хто, што гэты камень набудзе ў гаспадарчым жыцці краіны такое вялікае значэнне. Зараз жа гэты будаўнічы матэрыял сімвалізуе нашу незалежнасць. Будаўнічы комплекс, аўтадарожнікі, чыгуначнікі маюць трывалую незалежную крыніцу пастаўкі шчэбню з гэтага матэрыялу. Значная колькасць яе ідзе на экспарт.

За трыццаць гадоў на прадпрыемстве дасканала адпрацавана не толькі тэхналогія. Як шасцяронкі прыцёрліся, прыгледзеліся, сышліся ў памкненнях людзі самых розных спецыяльнасцяў. Нават без спружыны ці батарэйкі колы вытворчасці ў Мікашэвічах рухаюцца наперад.

Дзяржава зацікаўлена ў стабільнай працы РУПП «Граніт». Унікальнае прыроднае радовішча на працягу мінулых гадоў давала неблагі прыбытак. Пастаўлена задача павялічыць яго яшчэ больш, у тым ліку і за кошт экспартных паставак. Уладзімір Фёдаравіч Аутко, які працуе генеральным дырэктарам апошнія два гады, лічыць яе цалкам вырашальнай.

Праўда, калі ўсе рашэнні, якія будуць прымацца на гэты конт, будуць і надалей грунтавацца выключна на эканамічных разліках.

Найгалоўнейшая і найскладанейшая з задач — рэканструкцыя асноўнай вытворчасці. Складанасць у тым, што весці яе трэба не збаўляючы тэмпаў, а таксама ў спецыфіцы «Граніта» — бура-ўзрыўныя работы, транспарціроўка шматтонных глыбаў граніту на БелАЗах на перапрацоўку ды і сама перапрацоўка, поўная грукату і пылу, ад якіх стамляюцца не толькі людзі, але і абсталяванне.

Тэхнічныя рашэнні для рэканструкцыі былі закладзены пяць гадоў таму. У якасці фактара, які стрымліваў яе тады, быў недахоп грошай і крэдытораў. Аднак Уладзіміру Фёдаравічу шанцу працаваць на старым задзеле не засталося, і ён пачаў рэканструкцыю за сродкі прадпрыемства.

— Знос абсталявання падыходзіў да крытычнай рысы, — кажа Уладзімір Фёдаравіч, — яго належала тэрмінова замяніць на ўсіх трох стадыях драблення. Праект прадугледжваў выхад на 10 млн тон шчэбню ў год. Аднак пасля завяршэння рэканструкцыі ёсць падставы разлічваць на больш высокую лічбу.

Зараз рэканструкцыя ідзе поўным ходам. Зношанае абсталяванне замяняецца новым фінскай вытворчасці. Яно больш дасканалае і зручнае ў абслугоўванні. Пусканаладачныя работы таксама праводзяць пастаўшчыкі. У першым квартале наступнага года ўсе мантажныя работы будуць завершаны, пачнецца тэхналагічная даводка працэсаў. Выхад на запланаваныя паказчыкі, як і належыць, адбудзецца ў другой палове 2008 года.

Трэба адзначыць, што пры ўсёй маштабнасці мантажных і пусканаладачных работ РУПП «Граніт», як і браўся, не знізіў абаротаў. У 2006 годзе выхад гатовай прадукцыі склаў 9,36 млн тон, не будзе ён меншым і сёлета. У параўнанні з першай паловай мінулага года яго выраб узрос на 226 тыс. кубаметраў. Уражваюць і іншыя паказчыкі. Плюсы стаяць там, дзе і належыць. Па таварнай прадукцыі вынік росту за паўгода — 114,5 працэнта, па адгрузцы гатовага шчэбню — 108,5 працэнта, па прыбытку тэмп росту склаў 170,2 працэнта. Але што асабліва паказальна, паказчык тэмпаў росту паставак на экспарт склаў 225,9 працэнта! Апошняя лічба дае падставу сказаць: у той прадукцыі, якая сёння пастаўляецца на рынак, магутны экспартны патэнцыял, яна запатрабавана за мяжой.

Неабходнае адступленне. Доўгі час для будаўнічых работ выкарыстоўваўся выключна пясок і гравій. Яны здабываліся даволі лёгка, але і службылі не надта доўга, з-за чаго не маглі быць выкарыстаны ў адказных канструкцыях. На дапамогу прыйшоў шчэбень. Найбольш дробная і гранулятага абсталявання вядуць наступальную рэкламу сваіх вырабаў. Між тым, навука навукай, а практыкі, аналізуючы суадносіны цаны і якасці, пакуль аддаюць перавагу не грануляванаму, а звычайнаму шчэбню дробных (да 20 мм) фракцый.

У Расіі вытворцы імкнуцца заявіць аб тым, што яны ўжо вырабляюць кубападобны шчэбень, але ўстаноўкі па яго вытворчасці маламагутныя. На Урале — асноўным рэгіёне горнай здабычы — карціна такая: больш за тры дзесяткі драбільна-сартавальных фабрык і заводаў вырабляюць шчэбень хадавых памераў і толькі адзіная ўстаноўка (на рудніку «Малы Куйбас») вырабляе шчэбень першай групы. Яна была запушчана ў 2000 годзе магутнасцю ўсяго 820 тыс. тон.

Галоўны тэхнолаг ЗАТ «Урал-Амега» з Магнітагорска В. Кушка, які нага інвестыцыйнага праекта».

А вось што піша ў сваім артыкуле «Што патрэбна, каб расійскія заводы вырабляліе кубападобны шчэбень?» кандыдат тэхнічных навук В. Бердус (Масква): «Тэхналагічная схема прадпрыемства павінна быць аптымальнай па двух крытэрыях: максімальны выхад шчэбню кубападобнай формы і мінімальны сабекошт прадукцыі. За мяжой для гэтага будуюць драбільна-сартавальныя заводы з захаваннем наступных правілаў: комплекснае выкарыстанне сыравіны, гібкая тэхналогія, якая забяспечвае змяненпраблем. Новую вытворчасць належала стварыць настолькі хутка, што звычайны падыход, калі спачатку ствараецца закончаны праект, а потым ідзе будаўніцтва, не падыходзіў. Вытворцы пачалі весці будаўніцтва з ліста літаральна наступаючы на пяткі праектантам. Зразумела, гэта было не лепшае выйсце. Пры мантажы канструкцый не прымусілі сябе чакаць пралікі спешлівага праекта-

гаворка, спажываецца ў асноўным дарожнікамі, што на Беларусі новых дарог не будуецца, патрэбы ўнутранага рынку нязначныя. Канкурэнты «Граніта» не вырабляюць кубападобны шчэбень з-за таго, што ён не знаходзіць вялікага збыту. Цана яго расце з-за непазбежных дадатковых страт (калі, скажам, тона звычайнага шчэбню памерам 5—10 мм каштуе прыблізна 17 000 рублёў за тону, то кубападобнай таго ж памеру — 23 000 рублёў. Між тым на абсталяванні, сабраным на жывую нітку, гранітаздабытчыкі летам здолелі ўжо атрымаць першую партыю грануляванага шчэбню. Пры гэтым высветлілася, што акрамя тэхнічных недахопаў працэс дае павышаную колькасць адходаў.

«Вось тут бы крышку беларускай разважлівасці», — кажуць на прадпрыемстве.

Грошай вострa не хапае на аднаўленне парка кар'ерных самазвалаў і кар'ернай гаспадаркі. Дырэктар аўтатранспартнага парка «Граніта» Аляксандр Васільевіч Кіслюк адзначае, што экскаватары ў кар'еры зношаны на 80 працэнтаў, аўтатранспарт прадпрыемства — на 70. Рост горнай здабычы выклікаў да жыцця выкарыстанне 45-тонных самазвалаў замест 22-тонных. Гэта пацягнула за сабой ланцужок праблем тэхнічнага абслугоўвання, неабходнасць рэканструкцыі дарожнай гаспадаркі. На вырашэнне праблемы патрэбны значныя сродкі (адзін самазвал каштуе звыш 500 мільёнаў рублёў, а належыць набыць хоць бы восем машын). Грошы можна было б пазычыць у банку, аднак пакідаць у заклад там няма чаго — усе асноўныя сродкі даўно закладзены пад крэдытаванне бягучай рэ-





не попыту і затаварванне адной фракцыяй, кампаноўка абсталявання, якая зводзіць ад мінімуму колькасць транспартнага абсталявання, высокі каэфіцыент выкарыстання рабочага часу і г.д.»

Адзначым галоўную выснову з праведзеных цытат: навукоўцы раяць не спяшацца з засваеннем новага віду прадукцыі. Галоўнае — разумны праект, узважанасць яго тэхнічных рашэнняў і, удумаемся: «карэктна складаць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне». Вытворцы РУПП «Граніт» добра ведалі канъюнктуру рынку і былі абсалютна не супраць таго, каб вырабляць у сябе грануляваны шчэбень. Але на гэтым шляху іх падсцерагаў цэлы шэраг

ляваная фракцыя шчэбню атрымала назву першай. Вось гэта — першая, найбольш дробная фракцыя ў якой вышыня, шырыня і даўжыня каменьчыка набліжаныя да раўназначнасці, якраз і лічыцца сёння будучыняй камнедрабільшчыкаў. Сама вытворчасць такога шчэбню залежыць толькі ад наяўнасці неабходнага абсталявання і ў першую чаргу цэнтрабежных драбілак. Яны пачалі вырабляцца адносна нядаўна ў тым ліку і ў Беларусі. Зразумела, што вытворцы гэпабываў у Мікашэвічах, у сваёй навуковай справаздачы напісаў: «Павялічыць выраб шчэбню першай групы на прадпрыемствах нярудная прамысловасці, якія дзейнічаюць, можна за кошт змянення тэхналагічнай схемы і аптымізацыі работы існуючага драбільнага абсталявання. Задача праекціроўшчыкаў драбільна-сартавальных заводаў, вытворцаў абсталявання, спецыялізаваных інстытутаў — карэктна складаць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне канкрэтвання. Даводзілася перарабляць канструкцыі, што займала шмат часу, сродкаў і сілаў вытворцаў. Выклікаў здзіўленне і вялікі кошт праектных работ. Але ўступаць у разборкі з праектантамі горназдабытчыкі не сталі. Яны рупіліся агульнадзяржаўным інтарэсам — як мага хутчэй пачаць вытворчасць новага віду прадукцыі.

Яшчэ раз падкрэслю: на «Граніце» працуюць выдатныя спецыялісты сваёй справы. Яны могуць вырабіць усё, але надта перажывае калектыў, што новае даводзіцца засвойваць такім старым шляхам. Выходзячы з вопыту работы камбіната, вытворцы ведаюць, што шчэбень, пра які ідзе канструкцыі асноўнай вытворчасці. На практыцы можа стацца так, што яе мадэрнізацыя дазволіць выпрацоўваць звыш 10 мільёнаў тон шчабёнкі ў год, а вось здабыць яе ў кар'еры і перавезці ў такой колькасці на перапрацоўку будзе немагчыма. Ва ўмовах спажытых крэдытаў (спачатку года на рэканструкцыю ўжо накіравана больш за 30 млрд рублёў) гэта можа прывесці да неапраўданых цяжкасцяў. Ох, як патрэбна зараз падтрымка дзяржавы!

Што датычыцца яшчэ адной задачы перапрацоўкі адсеваў, то прадпрыемства гатова яе вырашаць. «Граніт» ужо падрыхтаваў дакументы на тэндар па вышуку арганізатараў гэтага працэсу, шукае крэдыторaў на гэту справу і плануе завяршыць працэдуру ў адпаведнасці з законам. Выйсці на рэальны вытворчы вынік у гэтым пытанні плануецца не пазней 2009 года. Праўда, вытворцы выказваюць пажаданне, каб стандартызатары міністэрства своечасова ўключылі гэты будаўнічы матэрыял у абарот спажывання, а чыгуначнікі падрыхтаваліся да яго транспарціроўкі.

Гэтыя і іншыя праблемы вырашае сёння «Граніт». Аб іх жа баліць і галава генеральнага дырэктара. Ветэран вытворчасці, намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Анатоль Мікалаевіч Кустрэй адзначыў, што акрамя праблем асноўнай вытворчасці генеральны дырэктар дастаткова кампетэнтна вырашае іншыя пытанні жыцця калектыву, разумее важкасць маральнага стымулявання працы, неабходнасць развіцця фізкультуры і спорту, падтрымкі сельскай гаспадаркі. Два гады таму на баланс была прынята самая адсталая гаспадарка Лунінеччыны. У мінулым годзе ў яе станаўленне было ўкладзена 3,2 мільярда рублёў, зменены кадры. Сёння ёсць усе падставы разлічваць на яе прыбытковасць.

Да Дня будаўніка васемнаццаці работнікам прысвоена званне лепшага па прафесіі. Разам з выдатнымі каляровымі пасведчаннямі ім уручаны значныя грашовыя прэміі.

Ёсць заслуга дырэктара і ў тым, што аднаму з чатырох народных самадзейных калектываў камбіната — ансамблю сучаснага танца — прысвоена званне ўзорнага.

Развіваюцца на «Граніце» фізкультура і спорт. Каманда прадпрыемства па мініфутболу іграе ў вышэйшай лізе. Акрамя футбола працаўнікі РУПП «Граніт» адшукваюць для сябе і больш шырокі спектр заняткаў спортам. Для іх паслуг сучасны аздараўленчы комплекс з лазняй, басейнам, більярдам, трэнажорнай залай. Дырэктар фізкультурна-аздараўленчага комплекса Мікалай Якаўлевіч Кіпель аддаў спорту ўсё жыццё, працуе ў калектыве не адзін дзесятак гадоў. Ён — старшы трэнер Паралімпійскага камітэта зборнай краіны па жыме штангі (паўэрліфтынгу). Ганарыцца тым, што сярод яго выхаванцаў жыхары Мікашэвіч, працаўнікі камбіната Людміла Грэбень і Крывулец Сяргей не аднойчы станавіліся прызёрамі і чэмпіёнамі Еўропы ў гэтым відзе спорту. Людміла нядаўна пацвердзіла свой высокі клас на чэмпіянаце свету, дзе заняла другое месца.Зараз гэтыя спартсмены разам з трэнерам рыхтуюцца да паездкі на Паралімпійскія гульні ў Кітай. Ганарыцца Мікалай Якаўлевіч і яшчэ адным сваім выхаванцам — рэкардсменам і чэмпіёнам рэспублікі ў жыме штангі, рабочым камбіната Сяргеем Бут-Гусаімам. У мінулым годзе фізкультурны калектыў РУПП «Граніт» стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу, які праводзіў БРК галіновага прафсаюза. А ў Брэскай вобласці ён з'яўляецца базавым і рыхтуецца зараз да ўдзелу ў рэспубліканскай спартакіядзе, якая адбудзецца 2—4 лістапада ў Гродне. На базе «Граніта» напрыканцы ліпеня адбылася абласная спартакіяда. Яе ўдзельнікі адзначылі высокі ўзровень арганізацыі як быту спартсменаў, так і саміх спаборніцтваў. Гэта і не дзіва: штогод на арганізацыю фізкультурна-аздараўленчай працы і падтрыманне спартыўнай базы на сучасным узроўні камбінат траціць каля паўмільярда рублёў. Таму можна зразумець кіраўніцтва «Граніта», якое шкадуе, што яго прапанова па правядзянні на спартыўнай базе Мікашэвіч рэспубліканскай спартакіяды так і засталася без увагі. «Чаму так адбылося?» — пытаюся ў Анатоля Мікалаевіча Кустрэя. «Адказалі, што не зможам задаволіць патрэбы фізкультурнікаў. Ім, маўляў, цяпер падавай адпаведныя ўмовы: асобны нумар, выбар паверху ў гатэлі і г.д. Хоць, упэўнены, нават пры такіх патрэбах большасць была б задаволена».

Намеснік дырэктара запрасіў на стадыён. Там пасля працы адбываўся таварыскі матч паміж ветэранамі камбіната і мясцовай зборнай работнікаў Міністэрства ўнутраных спраў. Гулялі людзі, якім больш за дваццаць і больш за пяцьдзесят. Гульня захапіла шчырасцю. «Вось гэта і ёсць фізкультура», — зазначыў Анатоль Мікалаевіч. Цяжка было з ім не пагадзіцца.

Калі браць слова «культура» ў больш шырокім сэнсе, то ёй прасякнуты ўсе адносіны горназдабытчыкаў: ад культуры вытворчасці да чалавечых адносінаў. Сёння РУПП «Граніт» — адна каманда. Яна здольна выйграць любое спаборніцтва. І перш за ўсё — вытворчае.

**Віктар ХУРСІК.**

***1. Генеральны дырэктар РУПП "Граніт" Уладзімір Фёдаравіч АУТКО.***

***2. Новае абсталяванне фінскай вытворчасці па драбленню граніта было ўстаноўлена без спынення асноўнай вытворчасці.***

***3. Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалогіі, быту і кадрам Анатоль Мікалаевіч КУСТРЭЙ і старшыня прафкама прадпрыемства Мікалай Іванавіч ЯКУБОВІЧ здольны падтрымаць чалавека, стварыць добры настрой. Пра такіх гавораць – душа калектыву.***

***4. Ідзе мантаж вытворчай лініі па вырабу кубападобнай шчабёнкі.***

***5. Дырэктар аўтатранспартнага парка Аляксандр Васільевіч КІСЛЮК добра ведае, чаго варты "БелАЗы".***

***6. Выдатны трэнер і арганізатар аздараўленчай работы Мікалай Якаўлевіч КІПЕЛЬ шкадуе, што на базе РУПП "Граніт" не праводзяцца спартакіяды рэспубліканскага маштабу.***

***7. У ўскрышных пародах кар'ера сустракаюцца акамянелыя рэшткі дагістарычных жывёлін. Працаўнікі камбіната адносяцца да іх з належнай павагай. Не кожны палеанталагічны музей можа пахваліцца такімі экспанатамі.***

Забытае? Новае? Вечнае!

# КАБ ЗАРУЧАЛЬНЫ ПЯРСЦЁНАК НЕ РАЗЛУЧЫЎ

***«Сын пражыў з жонкай 13 гадоў і згубіў заручальны пярсцёнак… Цяпер у іх не ладзіцца жыццё. Ці выправіцца сітуацыя, калі ён купіць новы заручальны пярсцёнак?»***

**Ірына Аляксандраўна,** *Смаргоньскі раён.*

У сваіх публікацыях мы шмат разоў гаварылі пра тое, што практычна кожнае свята народнага календара пакідала пасля сябе атрыбут, які аказваўся ў цэнтры абрадавых падзей, а затым на доўгі час станавіўся надзейным абярэгам для чалавека, яго сям'і, хаты і нават усяго падворка. Гэта, напрыклад, перавяслы, якімі перавязвалі ногі нябожчыку, фата нявесты, валасы першага пастрыгу дзіцяці. Да шэрагу прадметаў, якім надаваўся **статус** надзвычайных абярэгаў, адносіліся перш за ўсё заручальныя **пярсцёнкі жаніха і нявесты.**

У полі духоўнай культуры нашых продкаў сфарміраваўся цэлы комплекс уяўленняў, якія літаральна **знітавалі ў адзінае цэлае свяшчэнны атрыбут і долю яго непасрэдных уладальнікаў і спадкаемцаў!**

Прывядзём толькі некалькі прыкладаў, якія датычыліся розных аспектаў выбару, набыцця, захавання і перадачы ў спадчыну заручальных пярсцёнкаў.

**1. Нашы продкі заўсёды аддавалі перавагу пярсцёнкам, якія былі выраблены з аднаго металу.** Часам гэта здзіўляе нашых сучаснікаў, але пры гэтым яны забываюць на тое, што ў розных культурах свету кожнаму знаку задыяка адпавядала свая планета, каштоўны камень, дрэва, колер, лічбавы код у нумаралогіі і, зразумела, метал. Тады чаму неабходна тлумачыць, што ў энергетычным плане наяўнасць аднаго металу мела больш спрыяльны характар? У даным выпадку мера каштоўнасці вымяраецца ступенню энергетычнай гарманічнасці, а не цаной металічнага вырабу.

2. У славянскай традыцыі **лічылася спрыяльным, каб абодва пярсцёнкі купляў жаніх.** Нас неаднаразова пераконвалі ў тым, што **пярсцёнкі трэба купляць за адны грошы, у адзін і той жа дзень, у адным магазіне,** што павінна было максімальна спрыяць доўгаму і шчаслівому сумеснаму пражыванню сямейнай пары. Старыя людзі раілі: **у той дзень, калі вы купілі пярсцёнкі і прыйшлі дадому, цікенька скажыце, гледзячы на іх: «На добрае жыццё, на верную сям'ю».**

3. Краеугольны прынцып народнай традыцыі «падобнае спрыяе падобнаму» пераконвае нас у тым, што **на заручальных пярсцёнках не павінна быць ніякіх выгравіраваных знакаў, сімвалаў, рысачак, узораў: чым больш гладкая паверхня, тым больш спакойным будзе жыццё сямейнай пары.**

**4. Ні ў якім разе нельга вырабляць заручальныя пярсцёнкі з іншых шляхам пераплаўкі і асабліва распілованнем напапалам.** Першае, вы не ведаеце, якую інфармацыю нясе гэты прадмет. Пярсцёнкі бацькоў захоўваюць памяць аб іх колішніх уладальніках і тым самым будуць уплываць на долю маладажонаў. Другое. Распіловаючы напалам тое, што некалі было сімвалам адзінства, якую праграму вы праецыруеце самі сабе або сваім родным дзецям? Трэцяе. Камень, метал, як і вада, здольны ўспрымаць і захоўваць бяду, хваробу, няшчасце… Таму нельга вянчацца пярсцёнкам удавы або сваіх бацькоў, якія скасавалі шлюб. На жаль, ад многіх людзей давялося чуць, што вясельныя пярсцёнкі выплавілі з устаўной сківіцы дзядулі ці бабулі, з зубоў-пратэзаў, разрэзалі шырокі бацькаў пярсцёнак, бо не хапала грошай на вяселле і г. д. Што было, тое і было, а зараз будзьце больш абачлівымі ў дачыненні да сваіх дзяцей і ўнукаў.

5. Аўдавелая жанчына (аўдавелы мужчына) павінны былі зняць пярсцёнак з правай рукі і надзець на палец левай рукі, але добра ведалі, што заручальны пярсцёнак нельга насіць на левай руцэ больш за тры гады, бо не толькі сам сабе закрыеш магчымасць другі раз стварыць сям'ю, але нашкодзіш сваім дзецям.

6. Разам з тым самай каштоўнай рэліквіяй для маладажонаў з'яўляюцца тыя пярсцёнкі, які былі ў бацькоў аж да іх сярэбранага вяселля. У такім выпадку бацькі дарылі маладым свае, ужо намоленыя, прамаркіраваныя доўгім жыццёвым шляхам, фактычна знітаваныя ў адзінае цэлае пярсцёнкі, а дзеці, у сваю чаргу, куплялі бацькам новыя са шчырым пажаданнем дажыць да залатога юбілею. **Яшчэ больш высокім сакральным статусам былі надзелены пярсцёнкі залатых юбіляраў. Звычайна яны станавіліся родавай рэліквіяй і перадаваліся ў спадчыну ад аднаго пакалення другому.**

У асяроддзі беларусаў шырока бытавала павер'е: калі пад час вянчання патухне свечка аднаго з маладых, то ён пражыве больш кароткі век, таму жаніха і нявесту прасілі патушыць свечкі адначасова!

Заручальныя пярсцёнкі маглі служыць не толькі надзейным абярэгам, але і прадметам-вешчуном. Так, існавала глыбокая перакананасць у тым, што падзенне аднаго з пярсцёнкаў падчас рэгістрацыі або вянчання прадказвала недаўгавечнасць шлюбу або хуткае ўдаўства. Таму і падносілі іх на талерачцы з зернем, каб не правакаваць лішнія перагуды з боку аднавяскоўцаў пры няўдалым руху аднаго з маладых.

Калі заручальны пярсцёнак згубіўся або яго ўкралі, або нечакана зламаўся ці трэснуў, то і гэта сітуацыя лічылася неспрыяльнай, бо прадказвала непаразуменні ў сям'і, сваркі, разлад, распадзенне сям'і і нават смерць або мужа, або жонкі. Каб хоць у нейкай ступені паўплываць на ход падзей, людзі куплялі **новую пару пярсцёнкаў** і асвячалі іх, трымаючы пры сабе падчас вянчання якой-небудзь іншай пары.

**Вянчальныя пярсцёнкі ні ў якім разе не даваліпрымяраць іншым людзям, нават родным братам ці сёстрам:** у сям'і пачнуцца сваркі, прэтэнзіі, звязаныя з пабочнымі заляцаннямі, недавер, падазрэнні. **Лічылася зусім недапушчальным дарыць пярсцёнкі (не толькі заручальныя, але і ў якасці ўпрыгажэння) да замужжа (маецца на ўвазе да заручын) — пара абавязкова разлучыцца.**

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

***Кантактны тэлефон — 292 21 03.***

Простыя рэчы

# ЦАГЛІНА



Восень. Пачалося чарговае звальненне салдат тэрміновай службы ў запас. Менавіта звальненне, а не дэмабілізацыя, бо дэмабілізацыя адбываецца пасля мабілізацыі ў час вайны, пры нейкіх канфліктах. Але «дзяды» на гэты час становяцца менавіта «дэмбелямі», пакуюць свае дэмбельскія чамаданы, адпраўляюцца групамі дадому. У нас таксама свята — мы са стану «кандыдатаў» перайшлі ў стан «дзядоў». Напярадзе яшчэ паўгода службы. Але гэта ўжо толькі вайсковая служба, навучанне маладых, «зялёнак», якія пачалі прыходзіць у роты. Гэтыя паўгода ні да якіх гаспадарчых работ нас ужо не прыцягваюць, пра ўборку казармы, тэрыторый у гарадку і размовы не можа ісці. Палігон, стрэльбішча — і адпачывай.

Але «дэмбелі» пакуюць чамаданы. Там абавязкова дэмбельскі альбом, абавязковыя ў дарозе прыналежнасці, падарункі родным. Ну, і сувеніры, праўда, недазволеныя — гільза ад буйнакалібернага кулямёта, яшчэ які-небудзь матэрыяльны напамінак аб службе. Чамаданы захоўваюцца ў капцёрцы, а капцёрчык жа наш чалавек — выйшаў з «кандыдатаў» у «дзяды». Таму часта наведваемся на суседнюю будоўлю, прыносім адтуль цэглу. Тагачасны чамадан адчыніць лёгка любой шпількай. І вось у кожны з іх кладзецца, прыхоўваецца цагліна. Гэта ніякая не помста, гэта традыцыя. І нам, каму яшчэ служыць паўгода, вельмі прыемна фантазіраваць, як прыязджае былы салдат у той жа Самарканд ці Ленінакан, пачынае разбіраць свой чамадан і…

Праз паўгода звальняўся я. Гэта нямала тузаніны, бегання па штабах, чаканне ў апошнюю ноч у казарме. Пра ўсё забываешся. І вось на аўтастанцыі ў Мінску, купіўшы білет, прысеў на лавачку, паставіў сумку. Альбома ў ёй не было. Ладны стос фатаздымкаў, рукапіс кнігі, якую напісаў у арміі за апошнія паўгода, падарункі. Пасядзеў, паглядзеў на сумку. І стаў яе расшпіляць. Так і ёсць — цагліна, яе хлопцы загарнулі ў газету, нібы ў знак таго, што ў апошнія паўгода я шмат пісаў і ў дывізіённую і ў акруговую газеты…

Відаць, праз год пасля звальнення патрапілі мы ў сутарэнні полацкага Сафійскага сабора. Рэстаўрацыйныя работы там толькі разгортваліся. І работнік музея паказала нам **плінфу**, старажытную цэглу, якая была будаўнічым матэрыялам для ўзвядзення храмаў. Слова гэта з грэчаскай — pjinthos (цэгла). Ды і завозілася спачатку на Беларусь яна з Візантыі. Так і была ўзведзена ў XI стагоддзі полацкая «Сафійка». Потым плінфу сталі выраблять на месцах пабудоў. Гэта прамавугольнікі таўшчынёй толькі да 4,5 сантыметра. Для збудавання пілястраў, іншых архітэктурных дэталяў прымянялася плінфа паўкруглая, розных памераў і канфігурацыі. Выраблялі яе ў формах з драўляным дном — на старажытнай цэгле ёсць адбіткі дошак. На кожнай плінфе ставіўся знак майстра. Абпальвалі яе ў напольных печах. У другой палове XIII стагоддзя плінфу паступова замяніла буйнапамерная брусковая цэгла. Аж да XVIII стагоддзя выраблялася так званая «пальчатка», — цэгла з адбіткамі пальцаў, а потым наносіліся на яе рыскі звычайнай трэскай. У XIX—пачатку XX стагоддзя цэгла набыла практычна той выгляд, які яна мае і сёння.

Недзе з XIV стагоддзя з'явілася на Беларусі і **кафля**, перанятая ў Заходняй Еўропе. Ад нямецкага — Kachel. Гэта практычна найвышэйшы ўзровень цэглы — керамічны выраб для абліцоўкі, дэкаратыўнага аздаблення печаў. Таксама для аздаблення інтэр'ераў і экстэр'ераў будынкаў стала выраблящца дэкаратыўная плітка. Чытаў, што вырашаецца пытанне аб занясенні Барысаглебскай, Каложскай царквы ў Гродне ў спіс помнікаў сусветнай спадчыны. І сапраўды, Каложа гэтага дастойная. У яе збудаванні прымянілі 17 варыянтаў формы пліткі.

З дзяцінства помню, як старыя людзі расказвалі, што ідучы ў нядзелю да касцёла, які будаваўся, жанчыны, бабулі, дзяўчаткі неслі ў белых хусцінках яйкі. Нібыта для муроўкі выкарыстоўвалі бялкі ад іх. Пісьмовых сведчанняў не знайшоў. Але з муроўкай, растворам для злучэння цаглін, сапраўды былі праблемы. Цэменту яшчэ не ўжывалі, выкарыстоўвалі найбольш вапну. Але сцены такіх муроў стаяць вечна. Стаіць у Паставах касцёл з чырвонай цэглы, толькі дзе-нідзе на цаглінах невялікія ямкі ад куль Першай сусветнай вайны. Стаіць белая, атынкаваная царква. А ў вёсцы Камаі велічна ўзвышаецца касцёл абарончага тыпу, пабудаваны ў 1603—1606 гадах. У яго сценах ядры ці не шведскага паходжання, як напамінак аб былых навалах.

Непарыўна з цаглінаю, цэглай звязана і слова **мур** (ням. Mauer, з лацінскай murus — сцяна). Гэта выкладзены з цэглы ці каменю будынак. У польскай мове адпаведнік слову мараваць — murowaz. Адсюль і муляр, чалавек які займаецца муроўкай, кладкай. Ёсць і слова **камяніца**, што таксама азначае пабудову з цэглы, каменю. Успомнім славутую Камянецкую вежу. Пабудавана ў 1271—1289 гадах дойлідам Алексам.

У Якуба Коласа ў паэме «Новая зямля» дзядзька ў Вільні трапіў на Замкавую гару:

*— Ото, брат, горад! От дамішчы,*
*Ото дзе сыпалі грашышчы!*
*Якія вежы і касцёлы!*
*Як толькі іх трымаюць долы!..*
*Зірні, зірні: гара якая!*
*На ёй і будка цагляная…*

Колас тут не пасміхаецца з дзядзькавай недасведчанасці. Ён паказвае розніцу ва ўспрыманні жыцця, навакольля ў гараджаніна, які больш-менш дасведчаны калі не ў гісторыі, то ў значэнні галоўных мясцін горада, і вяскоўца, які акрамя поля, лесу, рэчкі, самай звычайнай вясковай хаціны нічога не бачыў.

А ў беларускай паэзіі і цагліна, і мур, і камяніца здавён займаюць пачэснае месца.

Пімен Панчанка як заўсёды непаўторны:

*І цагляная чырвань новых мурoў*
*На мяне пральецца, як кроў.*
*І за белаю вапнаю свежых сцен*
*Я ўбачу хаціны чорны шкілет».*

Помню, некалі ў земляка і любімага паэта Максіма Танка прачытаў верш, які нечакана паказаў яго не толькі, як рэвалюцыянера, барацьбіта за лепшую долю людзей, але і як чалавека часам нястрыманага па маладосці:

*«Снежны вецер*
*ходзіць-блудзіць паркамі.*
*Пад нагамі брук звініць-звініць,*
*Агні рэклам рознакалёрных*
*яшчаркамі*
*Грэюцца ў вітрынах камяніц.*
*Кінеш у іх камнем — разбягаюцца*
*Па завулках змрочных і кутках.*
*Эх, як потым доўга надрываецца*
*Візгат паліцэйскага свістка!»*

Улічым, праўда, што напісаны гэты верш аж у 1930 годзе.

Прызнацца, хоць ніколі не цураўся і не цураюся ніякай працы, а вось мураваць нават самую простую сцяну не давялося. Праўда, у вырабе цэглы нейкі ўдзел прымаў. У шасцідзесятых — пачатку семідзесятых гадах у Паставах існавала свая цагельня, просценькая, са старым абсталяваннем, з мноствам ручной працы. Вось летам мы школьнікамі і наймаліся сюды выносіць друз, а то і цэглу-сырэц здымаць з транспарцёра. А вось Тадэвуш Цыбульскі сябра з дзяцінства, які і сёння жыве на нашай вуліцы, да муроўкі прызвычаіўся з шостага, відаць, класа. Яго бацька ўжо ў тыя гады, як цяпер бы сказалі, пайшоў на «шабашку». Мураваў, тынкаваў, выконваў іншыя будаўнічыя работы па найму. Навучыў, прыхаводзіў і сына. У Тадэвуша вышэйшая адукацыя. Але ўсе гады ён займаецца будаўніцтвам. Больш за дзесяцігоддзе адпрацаваў толькі пад Масквой, будуючы для новых рускіх. А цяпер працуе і пад Мінскам, і нават пад Пастаў, дзе будуюцца выбітныя дачы. Майстар. Ён сваімі рукамі пабудаваў сабе дом на роднай вуліцы. Паглядзіш на гэту кладку: цагліна да цагліны, швы роўненькія. Такой кладкі я нідзе больш не бачыў. Ды цяпер Тадэвуш муры і не кладзе. Нецікава яму гэта. А вось каміны робіць выдатныя. Каміны, цоклі да будынкаў. У яго вялізны стос фатаздымкаў, на якіх майстар і тое, што ён зрабіў. Заказчыкі, паглядзеўшы на такія ўзоры, рэдка калі адмаўляюцца ад паслуг.

Сёння шмат самых разнастайных будаўнічых матэрыялаў. І **сілікатная цэгла**, і **блокі**, і шмат чаго іншага. Будаўнікам ёсць дзе разгарнуцца, праявіць фантазію. Але ў аснове ўсяго — цагліна.

**Алесь КАСЦЕНЬ.**

Памяць

# НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ…

«1937-ы год»… гэта выслоўе стала амаль хадзячай назвай, а дата 29 кастрычніка застанецца жалобным днём… Менавіта ў гэты дзень роўна 70 гадоў таму ў падвалах мінскай турмы расстраляны выбітныя прадстаўнікі беларускай культуры, асветы, грамадскія дзеячы. З сотні загінулых у тую варфаламееўскую ноч — 22 літаратары: Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Васіль Каваль, Міхась Чарот, Янка Нёманскі, Валерый Маракоў і іншыя. Многія не маглі не тое што ісці, нават стаяць на нагах — на расстрэл іх проста цягнулі волакам… Сем'і загінулых былі сасланы ў казахстанскія стэпы. І проста помніць пра трагедыю — ужо ўшанаванне слынных беларускіх дзеячаў культуры. Успамінаем разам з Леанідам Мараковым — пісьменнікам, даследчыкам гісторыі рэпрэсій у Беларусі, якога падзеі 29 кастрычніка датычаць асабіста: сярод пакутнікаў быў і яго дзядзька — паэт Валерый Маракоў.

— З пачаткам беларусізацыі ў айчыннай літаратуры сталі з'яўляцца сотні паэтаў і пісьменнікаў — незвычайных, самабытных. І вось гэтае нацыянальнае багацце пачалі вынішчаць у 1930-х, — кажа Леанід Уладзіміравіч. — Прайшло 70 гадоў з тых трагічных падзей, а беларускай культуры дагэтуль не ўдалося аднавіць страчаны патэнцыял. Хвалі рэпрэсій са жніўня 1937-га (першага масавага палітычнага расстрэлу ў краіне) па лістапад 1938-га былі ахрышчаны гісторыкамі як «крывавы тунэль смерці». Адным з пікавых момантаў сталі падзеі 29—30 кастрычніка, калі ў сутарэннях так званай «амерыканкі» былі расстраляны выключна прадстаўнікі інтэлігенцыі — выкладчыкі, пісьменнікі, службоўцы. Сярод забітых тады не аказалася ніводнага рабочага ці селяніна. Масавае пакаранне інтэлігентаў, відаць, было прымеркавана да пэўнай даты… Гэта была, безумоўна, самая чорная ноч для беларускай культуры.

Леанід Уладзіміравіч валодае інфармацыяй не толькі пра пакутнікаў, але і пра іх катаў (сёлета ў свет выйшла яго кніга «Ахвяры і карнікі», дзе пададзены біяграфіі ўсіх расстраляных, распаведзена пра лёсы іх сем'яў, змешчана багата фатаздымкаў):

— Большасць з іх — вінаватых у тым, што маладыя мужчыны пераствараліся ў аслабілых і змучаных старых (Тодар Кляшторны ў свае 30 выглядаў на 70), — былі выхадцамі не з Беларусі. Гэта было выклікана і тым, што Сталін пастаянна перазмяркоўваў сваіх падначаленых. Аднак, як вядома, у 1939 годзе многіх следчых НКУС напраўдзе лёс іх ахвяраў. Жыццёвы шлях беларускіх дзеячаў літаратуры і асветы таксама быў загублены: жонкі расстраляных трапілі ў славуты Лагер жонак здраднікаў радзімы, а дзеці — у прытулкі. Многія з іх так ніколі і не вярнуліся дадому. Даследчыкам ёсць над чым працаваць, а значыць, ёсць і тое, на што ніяк нельга забывацца нам, беларусам.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## «Буцік» у цягніку

**Беларускія мытнікі і памежнікі выявілі своеасаблівы модны салон у пасажырскім вагоне цягніка «Брэст—Масква».**

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, буйная партыя адзення польскай вытворчасці (1780 найменняў агульным коштам амаль 100 млн рублёў), незаконна, без мытнага афармлення, была ўвезена ў нашу краіну для далейшага экспарту ў Расію.

Гэта не першы выпадак кантрабанды польскага адзення. Толькі за апошні месяц было спынена тры такія спробы. Агульны кошт затрыманага раней тавару склаў больш за 390 млн рублёў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# ЗАВЯЗАЛІСЯ ВУЗЛЫ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)***

«Праведзеныя гутаркі з медработнікамі, а таксама аналіз вынікаў папярэдніх службовых расследаванняў дазваляюць зрабіць выснову, што на момант заканчэння аперацыі хворага 8 чэрвеня 2005 года ў Брагінскай ЦРБ у сістэме газазабеспячэння адсутнічаў кісларод, а таксама на падставе таго, як сапраўды працуе апарат МК-1 пры адсутнасці кіслароду, можна зрабіць выснову аб тым, што смерць пацыента звязана з адсутнасцю кіслароду ў сістэме газазабеспячэння».

Што тут скажаш? Толькі адно: доўгачаканае мужнае прызнанне! Хоць, магчыма, і запозненае. Тым не менш не ў нашай кампетэнцыі «рэвізаваць» дзеянні як следства, так і судовых органаў. Гэтак жа, як і сцвярджаць, вінаваты ці не ўрач-стажор Арцём Адаменка. Мы толькі прывялі канкрэтныя факты, якія жывуць у адпаведнай крымінальнай справе…

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

**P.S.** *На гэтым мы хацелі б паставіць кропку. Але калі матэрыял рыхтаваўся да друку, нам стала вядома, што Брагінская ЦРБ, выплаціўшы суму іску пацярпелай (трохі меней за 30 мільёнаў рублёў), падала рэгрэсійны іск на доктараанестэзіёлага Арцёма Адаменку. Іск заснаваны на тым, што ў 2005 годзе ён быў у працоўных адносінах з указанай установай і яго дзеянні, як вырашыў суд, нанеслі шкоду бальніцы.*

*Але ў той жа час новы галоўны ўрач яе падае скаргу ў пракуратуру Гомельскай вобласці і ў Вярхоўны Суд краіны з просьбай адмяніць прыгавор у частцы іску таму, што, на яго думку, Адаменка не быў у працоўных адносінах з Брагінскай ЦРБ (не заключаў працоўнага дагавора), а афіцыйна лічыўся ўрачом-стажорам абласной клінічнай бальніцы, якая і павінна выплачваць іск.*

*І вось тут пачынаецца самае цікавае. Вярхоўны Суд, які раней ужо адмовіў Адаменку ў скасаванні прыгавора Рэчыцкага райсуда, адмаўляе таксама і галоўнаму ўрачу Брагінскай бальніцы. А вось абласная пракуратура сапраўды знаходзіць парушэнне заканадаўства пры вынясенні прыгавора і накіроўвае пратэст у генеральную пракуратуру рэспублікі. Слова зараз за ёй.*

# КАНФЛІКТ ПАМІЖ ВАКЗАЛАМІ

Свая справа

У віцебскі карпункт «Звязды» па просьбе сваіх таварышаў патэлефанаваў індывідуальны прадпрымальнік і папрасіў, як кажуць, даследаваць праблему. «Мы будзем вымушаны працаваць на вуліцы з-за таго, што новы гаспадар будынка, дзе мы аказваем паслугі насельніцтву, раптам захацеў істотна падняць плату за арэнду», — адзначыў суразмоўца.

Працуюць прадпрымальнікі ў Доме быту на вуліцы Касманаўтаў. Гэты 5-павярховы будынак (з цокальным паверхам) знаходзіцца паміж віцебскімі чыгуначным і аўтавакзалам. Месца, дзе заўсёды шмат людзей, кліентаў. Сюды спецыяльна прыязджаюць вяскоўцы, каб нешта адрамантаваць, купіць.

Адразу бачна, што шматпавярховы будынак гэтай вялікай «бытоўкі» патрабуе рамонту. Нават не касметычнага, а капітальнага. Непрыглядныя сцены, старыя дзверы. Пакуль шукаў пакойчык, дзе планавалася наша сустрэча, запісваў, якія паслугі тут можна атрымаць. Вось на 1-м паверсе рамантуюць гадзіннікі, прадаюць часопісы, на 2-м — хімчыстка, рамонт фенаў… А тут можна заказаць выраб ключоў, а вось — рэклама тэрміновага рамонту адзення, абутку… Два верхнія паверхі, наколькі я зразумеў, фактычна не эксплуатуюцца.

Некалькі прадпрымальнікаў захацелі расказаць пра свае праблемы. Адзін з іх расказвае: «Нас тут больш за 40 арандатараў. А разам з наёмнымі работнікамі выходзіць чалавек 150. Нядаўна будынак прадалі на аўкцыёне. Я там прысутнічаў. Стартавы кошт продажу складаў 2 мільярды беларускіх рублёў, а купілі за 4,25 мільярда. Новы гаспадар будынка — таварыства «Віцебскі двор» — хоча падняць у разы арэндную плату. А вось, паглядзіце, калі ласка, Грамадзянскі кодэкс (артыкул 588) прадугледжвае, што пераход права ўласнасці на здадзеную ў арэнду маёмасць да іншай асобы не з'яўляецца асновай для змянення альбо скасавання дагавора арэнды. Я займаюся рамонтам гадзіннікаў. Месца знайду другое без праблем, а многім гэта зрабіць цяжка».

Уступае ў размову ўладальніца швейнага атэльне і салона шлюбнага адзення: «Мы можам апынуцца на вуліцы. Мой калектыў маленькі — 9 чалавек. Мы зарэгістраваныя ў якасці юрыдычнай асобы. Ну, уявіце, калі за квадратны метр арандаваных памяшканняў трэба будзе плаціць 20 еўра, як цяжка будзе разлічвацца».

Яшчэ адзін прадпрымальнік займаецца рамонтам брытваў, фенаў: «У мяне шмат заказчыкаў з вёсак. Сельскі жыхар наўрад ці купіць новую брытву, а па месцы яго пражывання ніхто прыбор не адрамантуе. Вось і звяртаюцца людзі да мяне. А куды яны пойдуць, калі я не буду працаваць у Доме быту?»

Як высветлілася, ёсць прэтэнзіі ў прадпрымальнікаў і да ЖРЭТ Чыгуначнага раёна. Яны не задаволены высокай аплатай за камунальныя паслугі. Нізкай якасцю апошніх. Гэтыя нюансы разбірае раённы суд па заяве аднаго з арандатараў. А яшчэ, паводле слоў прадпрымальнікаў, мясцовыя ўлады стараюцца заставацца ў баку ад канфліктнай сітуацыі. Маўляў, калі ёсць нейкія прэтэнзіі, звяртайцеся ў гаспадарчы суд. А месцаў для пераносу нашага бізнэсу ў іншыя месцы горада недастаткова: «Прапануюваюць памяшканні на ўскраінах, у пасёлку Руба. Мала таго, што далёка, дык да таго ж гэтыя памяшканні без выгод».

Пракаментаваць гэту канфліктную сітуацыю я папрасіў аднаго з кіраўнікоў фірмы «Віцебскі двор». Мне растлумачылі, што ўжо некалькі тыдняў з арандатарамі вядзецца работа: «Мы просім іх канкрэтна нам адказаць, ці будуць пераключаць дагаворы на арэнду. Пакуль яны плацяць ад 0,5 да 1,5 еўра за квадратны метр. Гандзіцеся, што гэта мала, сімвалічная плата. Мы прапаноўваем да 20 еўра. У працэнтаў 80 з тых, што зараз арандуе памяшканні, тэрмін арэнды завяршаецца 31 кастрычніка. Мы ніяк не парушаем патрабаванні Грамадзянскага кодэкса, бо хутка арандатары афіцыйна такім не будуць, калі не пераключаць дагаворы. Па даных на 1 верасня, арандатары запазычылі за камунальныя паслугі ЖРЭТ Чыгуначнага раёна 56 мільёнаў рублёў. Безумоўна, калі мы набылі будынак, трэба яго эфектыўна эксплуатаваць. Раней, яшчэ да таго як мы сталі ўладальнікамі, і быў зроблены праект стварэння тут гандлёвага цэнтра. Праект прайшоў экспертызу. Калі пачнецца капітальны рамонт, трэба будзе наогул вызваліць усе памяшканні. У любым выпадку мы гатовы супрацоўнічаць з тымі, хто пажадае застацца ў будынку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


Увага! Конкурс «Пекін-2008»

## Чытачы нашай газеты маюць шанц паехаць у 2008 годзе ў сталіцу Гульняў XXIX Алімпіяды — Пекін!

**Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь сумесна з нашай газетай, а таксама спонсарамі і партнёрамі Алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь: ЗАТ «БелСвіссБанк», ЗП «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», ЗП «Рэстараны «МакДональдс», ЗП «Цэптэр Інтэрнацыянал» ТАА, ЗП «Мабільная лічбавая сувязь» аб'яўляе рэспубліканскі конкурс для юнакоў і дзяўчат Рэспублікі Беларусь 1990—1992 г.г. нараджэння, двое пераможцаў якога (юнак і дзяўчына) атрымаюць права з 6 па 26 жніўня 2008 года бясплатна пабываць у Алімпійскім маладзёжным спартыўным лагеры ў Пекіне (Кітай) — сталіцы Гульняў XXIX Алімпіяды, куды падчас Алімпійскіх гульняў прыедуць 600 юнакоў і дзяўчат з 205 краін свету, дзе ёсць Алімпійскія камітэты. Вы ўбачыце цырымонію адкрыцця Алімпійскіх гульняў, эстафету алімпійскага агню, пабываеце ў Алімпійскай вёсцы, пазнаёміцеся з культурай Кітая, ажыццявіце экскурсійны тур па Пекіну, станеце ўдзельнікамі розных маладзёжных міжнародных праграм на тэму спорту і мастацтва.**

BelSwissBank Белорусско-швейцарский банк · zepter International · Coca-Cola · VELCOM · Всё что я люблю

### АБАВЯЗКОВЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ КОНКУРСУ:

- **свабоднае валоданне англійскай мовай;**
- **узрост на 5 жніўня 2008 года павінен складаць ад 16 да 18 гадоў;**
- **добрае веданне гісторыі сусветнага алімпійскага руху;**
- **наяўнасць высокага ўзроўню ведаў у сферы развіцця і дасягненняў беларускага спорту;**
- **занятак спортам, грамадскай работай.**

■ Конкурс юных знаўцаў «Пекін-2008» праводзіцца ў **пяць тураў з 10 верасня па 10 снежня 2007 г.**

■ У кожным туры прапаноўваецца 10 пытанняў з варыянтамі адказаў (4—5). Кожны правільны адказ — адно заліковае ачко.

■ У кожным туры публікуецца спецыяльны купон, у якім удзельнікі конкурсу павінны напісаць правільныя варыянты адказаў.

■ Пераможцамі становяцца ўдзельнікі, якія набралі найбольшую колькасць ачкоў і паспяхова прайшлі **гутарку на англійскай мове** ў Нацыянальным алімпійскім камітэце Рэспублікі Беларусь на тэмы развіцця беларускага спорту і сусветнага алімпійскага руху.

■ Кожны ўдзельнік мае права выслаць толькі **адзін варыянт адказу** — запоўнены арыгінал-купон, выразаны з газеты. (Ксеракопіі не прымаюцца.)

■ Купон высылаецца на працягу 7 дзён пасля публікацыі (правяраецца па паштоваму штэмпелю на канверце) на адрас: вул. Я. Коласа, 2, г. Мінск, 220005, Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь **з паметай: «Конкурс «Пекін-2008» і ўказаннем нумара тура на канверце**.

■ Удзельніку, які ўпершыню выслаў купон, неабходна таксама ўкласці ў пісьмо ксеракопію старонкі пашпарта (дзе маецца фатаграфія і дата нараджэння).

■ Пераможцы і прызёры конкурсу атрымаюць памятныя дыпломы НАК Беларусі, пуцёўкі ў Пекін і прызы ад фірмаў-спонсараў конкурсу.

■ У выпадку, калі два ці больш удзельнікаў набяруць роўную колькасць балаў, пераможцу вызначае жэрабій конкурсу.

**Палажэнне аб конкурсе «Пекін-2008» на сайце *www.noc.by*.**

### Пытанні III тура

***1. Якая колькасць краін (НАКаў) узяла ўдзел у Алімпійскіх гульнях 1996 года ў Атланце?***
1 — 169 4 — 199
2 — 189 5 — 202
3 — 197

***2. Колькі ачкоў выбіў Сяргей Мартынаў дзесяцюю стрэламі ў фінале алімпійскіх спаборніцтваў 2004 года ў Афінах у стральбе з малакалібернай вінтоўкі са становішча лежачы?***
1 — 102,5 4 — 104,7
2 — 104,2 5 — 105,6
3 — 104,3

***3. Ураджэнцам якога раёна з'яўляецца беларускі алімпійскі чэмпіён у кіданні молата Рамуальд Клім?***
1 — Мядзельскага
2 — Нясвіжскага
3 — Пухавіцкага
4 — Слуцкага
5 — Смалявіцкага

***4. Югаслаўская гандбалістка Святлана Кіціч на маскоўскай Алімпіядзе забіла больш за ўсіх галоў у адным з матчаў турніру (14) у вароты каманды…***
1 — Венгрыі
2 — ГДР
3 — Конга
4 — СССР
5 — Чэхаславакіі

***5. Якая рака стала месцам першых трэніровак беларускага алімпійскага чэмпіёна весляра Уладзіміра Раманоўскага?***
1 — Бярэзіна 4 — Ушача
2 — Прыпяць 5 — Шчара
3 — Сож

***6. У якім годзе ў Мінску быў адкрыты Музей алімпійскай славы?***
1 — 2003 4 — 2006
2 — 2004 5 — 2007
3 — 2005

***7. Хто з гімнастаў заваяваў медалі на найбольшай колькасці Алімпійскіх гульняў?***
1 — Мікалай Андрыянаў
2 — Жорж Міз
3 — Такасі Оно
4 — Хейкі Савалайнен
5 — Петэр Хол

***8. Які апошні алімпійскі рэкорд быў устаноўлены ў жаночай лёгкай атлетыцы?***
1 — Алена Ісінбаева, скачкі з шастом
2 — Вольга Кузянкова, кіданне молата
3 — Ослейдзіс Менендэс, кіданне кап'я
4 — Алена Слесарэнка, скачкі ў вышыню
5 — Фані Халкія, бег 400 м з бар'ерамі
6 — Джаан Хеес, бег 100 м з бар'ерамі

***9. У якім годзе ў члены МАК упершыню быў выбраны прадстаўнік Кітая Ван Чжэнцін?***
1 —1921 4 — 1947
2 —1930 5 — 1988
3 — 1939

***10. У якім відзе спорту атлеты Кітая заваявалі найбольшую колькасць залатых медалёў на Алімпійскіх гульнях 1984 года?***
1 — гімнастыцы спартыўнай
2 — скачках у ваду
3 — стральбе з лука
4 — стральбе кулявой
5 — цяжкай атлетыцы

### Адказы на пытанні I тура

1. Беларускія спартсмены на Алімпійскіх гульнях 1952 года выступілі ў двух відах спорту — лёгкай атлетыцы і фехтаванні. Адказ № 1.

2. На Алімпійскіх гульнях у Афінах у 1-м раўндзе перамогу над сваім сапернікам італьянцам Данілэм Беці атрымаў баксёр Віктар Зуеў. Адказ № 4.

3. Кацярына Карстэн, выступаючы на чатырох Алімпіядах, удзельнічала ў 11 заездах. Адказ № 2.

4. Падчас Алімпійскіх гульняў 2008 года ў Пекіне найбольшая колькасць узнагарод (34) будзе разыграна 17 жніўня. Адказ № 2.

5. На Алімпійскіх гульнях у спаборніцтвах па дзюдо разыгрываецца 14 камплектаў узнагарод. Адказ № 3.

6. Яхты класа «Зорны» адносяцца да кілявых яхтаў-двоек. Адказ № 2.

7. Найбольш вялікаўзроставым прызёрам Алімпійскіх гульняў у конным спорце з'яўляецца аўстраліец Уэйн Райкрофт. Ён заваяваў бронзавы медаль у камандных спаборніцтвах па трохбор'і на Алімпіядзе 1976 года ў 61-гадовым узросце. Адказ № 4.

8. На Алімпійскіх гульнях не выступаў футбаліст Дыега Марадона. Адказ № 2.

9. Вежа каля Алімпійскага стадыёна ў Хельсінкі ўзведзена ў гонар алімпійскай перамогі кідальніка кап'я Маці Ярвінена. Ён перамог на Гульнях 1932 года з вынікам 72 метры 71 сантыметр. Менавіта такой вышыні вежа стадыёна ў сталіцы Фінляндыі. Адказ № 5.

10. Літары (S) або (A),

# ШАХМАТЫ

**Юбілейны конкурс «Яўгену Дзвізаву — 70»**

*(Працягваем публікаваць вынікі конкурсу. Пачатак гл. у папярэдніх шахматных выпусках)*

№ 9. F. BERTOLI (Італія). «Звязда» (Беларусь), 2007. Юбілей «Я. Дзвізаў-70». 1-ы ганаровы водгук.



Ход чорных. Белыя робяць нічыю. (4+6).

1. ... g1Ф 2. Ke5 Kpg7 3. Ch6+ Kp:h6 4. f8Ф+ Kph7 5. Фf5 Kpg7 6. Фf7+ Kph6 7. Фf8+ Фg7 8. Фf4+ Kg5 9. Kpd6 Kph7 10. Ф:h4+ Kpg8 11. K:d3 Ф:g6+ 12. Kpc5 Ke6+ 13.Kpc4 і нічыя.

Складаны эцюд. Сярод шматлікіх аналітычных варыянтаў цяжка вылучыць асноўнае рашэнне.

№ 10. R. BECKER (ЗША). «Звязда» (Беларусь), 2007. Юбілей «Я. Дзвізаў-70». 2-і ганаровы водгук.



Нічыя (5+7).

1. Лf2! Kpe3 2. Лf3+ Kpd4 3. Лf2! Kpe4 4. K:h3 C:h3 5. Лe2+! Kpf4 6. Лf2+ Kpg4 7. Л:d2 Лc4 8. Kpe1 Лc1+ 9. Kpf2 Лh1 10. gh+ Kp:h3 11. Лd3+ Kp:h2 12. Лd4 Kph3 13. Лd3+ Kpg4 14. Kpg2 Лa1 15. Лg3+ hg і пат.

№ 11. Б. СІДАРАЎ, Э. КУДЗЕЛІЧ (Расія). «Звязда» (Беларусь), 2007. Юбілей «Я. Дзвізаў-70». 3-і ганаровы водгук.



Ход чорных. Белыя выйграюць. (10+5).

1. ... Cc4+ 2. b5 Фc8+ 3. Лb7+ Ф:b7+! 4. cb Cd5 5. Л:g7 Cc4 6. f7! C:f7 7. Л:h7 Ce8! 8. Лd7 C:d7 9. h7 Ce8 10. h8C! Cc6 11. Ce5x.

№ 12. O. CARLSSON (Аргенціна). «Звязда» (Беларусь), 2007. Юбілей «Я. Дзвізаў-70». 4-ы ганаровы водгук.



Выйгрыш (5+7).

1. Cf8 Фh8 2. b4+!! Kp:b4 3. Лd8+ Kpb3 4. Лd3+ Kpc4 5. Лh3+ Kpd4 6. Л:h8 і выйгрыш.

*(Працяг вынікаў конкурсу — у наступным шахматным выпуску).*

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй Міхайлаў.




## ТЭАТРАЛЬНЫ ФОРС-МАЖОР

**Новы — восемдзесят другі па ліку — тэатральны сезон у Віцебскім Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа павінен быў адкрыцца камедыяй-фантасмагорыяй «Дзверы». Але прэм'еры гледачы так і не ўбачылі.**

Першага паказу з напружаным хваляваннем чакалі ўсе, хто меў дачыненне да пастаноўкі «Дзвярэй»: група маладых акцёраў пад кіраўніцтвам рэжысёра Юрыя Лезінгевіча, аўтар п'есы Сяргей Кавалёў, кампазітар Уладзімір Кандрусевіч, які напісаў музыку да спектакля. Аднак літаральна напярэдадні прэм'еры заняты ў галоўнай ролі Яўген Бераснеў зламаў нагу ў двух месцах і аказаўся надоўга закутым у гіпс — давялося адкласці прэм'еру на некалькі месяцаў. Цяпер маэстра Кандрусевіч жартуе, што варта лепей наглядаць за астатнімі акцёрамі, каб больш не было ніякіх непрыемнасцяў.

Зрэшты, кампазітару ёсць чым суцяшацца — у віцебскім тэатры ў новым сезоне была паказана абноўленая пастаноўка «Залёты» паводле В. Дуніна-Марцінкевіча, музыку да якой таксама напісаў Уладзімір Пятровіч. Да таго ж ідуць перамовы з прадстаўнікамі некалькіх буйных канцэртных пляцовак, дзе можна было б прадставіць вялікі мюзікл, напісанню якога Кандрусевіч прысвяціў апошні год. Фрагмент «Гойя» з гэтага спектакля быў паказаны на прэзентацыі прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» у чэрвені гэтага года і выклікаў вялікую цікавасць у музычных крытыкаў. Адзін з варыянтаў назвы будучага мюзікла — «Небяспечныя сувязі», а мяркуемы час прадстаўлення яго публіцы — сярэдзіна 2008 года.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**СКАНВОРД + СУДОКУ (20 кастрычніка). Па гарызанталі:** Уфолаг. Секанс. Егер. «Амок». Гід. Ятка. Апіс. Тупік. Фламастар. Тар. «Ака». Стадола. Хоста. Сава. Стан. «Аманал». Мыла. Леў. Акоп. Сцяг. Сана. Вал. Андарак. **Па вертыкалі:** Фэст. Лебяда. Фагот. Кракатаў. Ларга. Атоса. Сквер. Града. Саланец. Патрава. Ярлык. Скокі. Алег. Страх. Космас. Пластыка. Талон. Сарочка. Анапа.

**Адказы на судоку гл. у табліцы.**

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | 6 | 7 | 3 | 9 | 8 | 2 | 1 | 5 |
| 5 | 8 | 9 | 4 | 1 | 2 | 3 | 6 | 7 |
| 3 | 2 | 1 | 7 | 5 | 6 | 9 | 4 | 8 |
| 8 | 4 | 5 | 9 | 2 | 7 | 1 | 3 | 6 |
| 6 | 9 | 3 | 1 | 8 | 4 | 5 | 7 | 2 |
| 7 | 1 | 2 | 5 | 6 | 3 | 4 | 8 | 9 |
| 2 | 3 | 4 | 6 | 7 | 9 | 8 | 5 | 1 |
| 9 | 5 | 6 | 8 | 3 | 1 | 7 | 2 | 4 |
| 1 | 7 | 8 | 2 | 4 | 5 | 6 | 9 | 3 |

*Нашы шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні мілай* ***Настачцы КАЗАКЕВІЧ*** *з Мінска з нагоды цудоўнай даты — 18-годдзя.*

*Жадаем, каб людзі цанілі цябе*
*І мы каб табой ганарыліся.*
*Гадочкі твае, як вясновы букет,*
*Любоўю і шчасцем свяціліся.*

**Родныя,** *г. Мінск.*

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Скарпіёны павінны стаць больш актыўнымі, а Стральцы — больш мудрымі

**ВАЕН**. Зможаце выгадна прадставіць вашы дзелавыя якасці, што спрыяльна адаб'ецца на поспехах у справах. Здольнасць марыць і ажыццяўляць мары дапаможа справіцца з любымі перашкодамі і цяжкасцямі, якія сустрэнуцца на вашым шляху. Смелыя задумы ў прафесійных справах могуць ажыццявіцца, але давядзецца патраціць шмат сілаў і часу. Спатрэбіцца дакладнасць, метадычнасць і дысцыпліна, якія ў спалучэнні з арганізатарскімі здольнасцямі будуць тварыць цуды. У пятніцу перад вамі адкрыюцца перспектывы, пра якія вельмі доўга марылі.

**ЦЯЛЕЦ**. Тыдзень, пры вашым на тое жаданні, будзе працякаць без асаблівых клопатаў і ўскладненняў. Панядзелак прадуктыўны для вырашэння важных задач і правядзення дзелавых сустрэч. Падумайце пра пашырэнне сваіх магчымасцяў — навучэнне новай спецыяльнасці вам не толькі не пашкодзіць, але і дасць шанц уладкавацца на больш высокааплатную работу. Хатнія праблемы лепш вырашаць адразу, па меры іх з'яўлення, інакш яны будуць цягнуць вас назад.

**БЛІЗНЯТЫ**. Прыемныя сюрпрызы і непрыемныя нечаканасці будуць у асноўным адносіцца да работы, але ў некаторых выпадках будуць звязаны са здароўем. У панядзелак не варта залішне перагружаць сябе зносінамі. Гэты дзень лепш падыходзіць для разумовых і духоўных заняткаў. У сярэдзіне тыдня ў хатніх справах бярыце ініцыятыву на сябе. Вам будуць удавацца такія няпростыя справы, як пошукі майстроў для рамонту кватэры. У другой палове тыдня намеціцца пазітыўны зрух у справах.

**РАК**. Неабходна спыніцца і задумацца над тым, што ж вы робіце. У прафесійных справах верагодны рэзкія змены, аднак гэта не асабліва паўплывае на вынік. Магчыма, калі праявіце зацікаўленасць і актыўнасць, з'явіцца вельмі перспектыўны праект. Неабходна прадумаць дробязі і ўважліва ўзважыць яго фінансавыя наступствы. Тыдзень можа прывесці да аднаўлення некаторых партнёрскіх адносінаў. Спрыяльны час для духоўнага росту і развіцця.

**ЛЕЎ**. Давядзецца выйсці за рамкі звыклага акружэння, каб лепш зразумець сітуацыю, якая склалася, і ўбачыць далейшыя перспектывы. Больш увагі надайце прафесійным абавязкам. У панядзелак не варта спяшацца з заключэннем новых дагавораў. У сярэдзіне тыдня можаце стаць перад выбарам новага шляху для сваёй кар'еры. Не даводзьце сябе да ператамлення: ёсць немалая верагоднасць, што здароўе можа падкачаць. У нядзелю варта крыху расслабіцца і выбраць для гэтага пасіўны адпачынак.

**ДЗЕВА**. Час спрыяе выражэнню працоўных пытанняў. Зможаце справіцца ці амаль справіцца з усімі праблемамі. Калі задумалі змяніць работу, то ажыццяўляйце свае задумы, тым больш, калі ёсць цікавыя прапановы. Найбольш спрыяльным днём для рэалізацыі гэтага з'яўляецца аўторак. Разлічвайце на сваю інтуіцыю.

**ШАЛІ**. Вы лёгкія на пад'ём, рашучыя, энергічныя? Гэтыя якасці з'яўляюцца залогам поспеху. Самы час заняцца ажыццяўленнем задуманага. Ад гэтага павысіцца настрой, і ўзрастуць шанцы на поспех. Выкарыстоўвайце праверэныя метады для дасягнення мэтаў. Аўторак — спрыяльны дзень для падпісання дагавораў і заключэння кантрактаў. У чацвер найлепшым чынам вырашацца папяровыя справы. У пятніцу планы павінны быць канкрэтнымі, інакш яны не рэалізуюцца. Пастарайцеся не зрывацца на хатніх. Поспехі і дасягненні дзяцей парадуюць у выхадныя.

**СКАРПІЁН**. Для паспяховага прасоўвання наперад вам неабходна праявіць актыўнасць і ўнутрана засяродзіцца. Такія намаганні часам бывае складана зрабіць, але ў дадзены момант мэта апраўдвае сродкі. Гэты тыдзень можа быць дастаткова напружаным, але плённым. Поспех у справах будзе праяўляцца марудна, але грунтоўна і надоўга, і гэта прыдасць адчуванне ўпэўненасці ў асабістых сілах. У пятніцу вакол вас могуць кіпець сапраўдныя страсці: будзьце асцярожнымі. У нядзелю парадуйце сябе чым-небудзь прыемным.

**СТРАЛЕЦ**. Будзьце больш мудрымі пры вырашэнні праблем дома і на рабоце. Абачлівасць таксама не зашкодзіць. Пастарайцеся рэалізаваць свае ідэі. Калі вы не заганарыцеся сваімі талентамі і здольнасцямі, то будзеце здольны змякчыць вострыя вуглы сітуацый, якія складаюцца. Надайце дастаткова часу свайму духоўнаму развіццю. Не перастарайцеся з арыгінальнасцю, інакш навакольныя могуць вас няправільна зразумець.

**КАЗЯРОГ**. Настаў добры момант для рэалізацыі справы, якая даўно і доўга ў вас не атрымлівалася. Не сумнявайцеся, зрабіце рашучы крок наперад — і вы адчуеце доўгачаканую палёгку і ўпэўненасць у асабістых сілах. Павялічце колькасць кантактаў і карысных дзелавых сустрэч. Вы можаце сустрэць надзейных паплечнікаў у важнай справе, калі праявіце дыпламатычны талент і пачуццё такту і меры. Пастарайцеся больш часу ўдзяляць дзецям і блізкім людзям.

**ВАДАЛЕЙ**. Тыдзень можа быць звязаны з неабходнасцю перамяшчэння на значныя адлегласці. Пашырыцца ваша кола зносінаў. Большае значэнне можа набыць вучоба і авалодванне рознымі навыкамі. Каб не стаць ахвярай падману ў сераду, будзьце больш уважлівымі і не прымайце важных рашэнняў. Другая палова тыдня прамільгне за працоўнымі справамі і хатнімі клопатамі. Пастарайцеся расправіцца з імі своечасова, каб пакінуць больш часу для сябе. У суботу важна быць побач з тымі, каго вы сапраўды кахаеце. Нядзеляй пастарайцеся распарадзіцца так, як вам таго хацелася б, а не так, як патрабуюць ад вас родныя ці сябры.

**РЫБЫ**. З'явяцца новыя дзелавыя партнёры і заступнікі, у сувязі з гэтым вы можаце рэалізаваць самыя дзёрзкія планы, стварыць добры задзел на будучыню, палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. У справах будзе спадарожнічаць удача. Першая палова будзе напоўнена цікавымі сустрэчамі і запомніцца вам надоўга. У аўторак, магчыма, вы нарэшце справіцеся са складанымі задачамі. Гэта выкліча шмат зменаў у прафесійным плане. Цалкам рэальныя праблемы з пажылымі бацькамі, а таксама візіт кагосьці з родных.

# Сёння

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.59 | 17.47 | 9.48 |
| Віцебск — | 7.52 | 17.33 | 9.41 |
| Магілёў — | 7.49 | 17.37 | 9.48 |
| Гомель — | 7.42 | 17.38 | 9.56 |
| Гродна — | 8.14 | 18.03 | 9.49 |
| Брэст — | 8.10 | 18.07 | 9.57 |

## Месяц

***Поўня 26 кастрычніка.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

## Імяніны

***Пр.*** *Праскоўі, Мікалая, Назара, Пратаса, Селівана;*
***К.*** *Зоі, Івоны, Сабіны, Вінцэнта, Пятра.*

## Надвор'е на заўтра




## …у суседзяў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +11 — +13 °C | МАСКВА | +5 — +7 °C |
| ВІЛЬНЮС | +7 — +9 °C | РЫГА | +7 — +9 °C |
| КІЕЎ | +10 — +12 °C | С-ПЕЦЯРБУРГ | +6 — +8 °C |

Без ападкаў

## Дзве даты

## 27 кастрычніка

**1557 год** — кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт II Аўгуст выдаў «Лясны статут». Згодна з новым законам, для вырашэння ўсіх спрэчных пытанняў аб праве карыстання ляснымі ўгоддзямі ствараліся адмысловая камісія. Лясніцкія атрымалі падрабязную інструкцыю аб дзеяннях у час аб'езду лясоў і пушчаў. Статут забараняў высечку дрэў без дазволу каралеўскай улады, абмяжоўваў рыбную лоўлю і колькасць паляўнічых сабак.

**1728 год** — нарадзіўся Джэймс Кук, славуты англійскі мараплавец, кіраўнік трох кругасветных экспедыцый, першаадкрывальнік Новай Зеландыі і Гавайскіх астравоў.

## Цытата дня:

***«Прасіць парады — ёсць найвялікшы давер, які адзін чалавек можа аказаць другому».***

**Джавані Бакача (1313—1375), італьянскі пісьменнік-гуманіст.**

## Усміхнёмся!

— Дзядзя, а можна я вам тэлевізар парамантую?

— Нельга хлопчык... і пакладзі вантуз на месца.

☺

**Аб'ява. Муж на гадзіну: адрамантаваць прас, павесіць штору, урэзаць замок, паставіць фінгал, прапіць палучку, пераспаць з суседкай.**

☺

— Джон, я прынесла табе дзесяць гамбургераў!

— Прыгажосць!

Голас дыктара:

— Вы праслухалі радыёспектакль «Прыгажосць па-амерыканску».

☺

**— З якой машынай у вас асацыюецца ваш муж?**

**— З «Ферары». Занадта хуткі і твар чырвоны…**

☺

Сустракаюцца рускі і француз. А іх жонкі пра гэта не ведаюць!

*Адміністрацыя РУП «Аўтобусны парк № 2» г. Баранавічы віншуе ўсіх дзеючых супрацоўнікаў прадпрыемства, ветэранаў вытворчасці, а таксама ўсіх вадзіцеляў краіны з прафесійным святам — Днём аўтамабіліста і дарожніка.*

*Жадаем усім моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту і новых творчых узлётаў у працы.*

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I КВАРТАЛ I ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насцярэжы чарнобылю

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
СВАЯ СПРАВА — БІЗНЭС. ЭКАНОМІКА. ФІНАНСЫ
Наш культурны асародак ЖЫРАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
КРАЙ ЗДАРОЎЯ

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8800 рублёў на месяц<br>26400 рублёў на квартал<br>52800 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8300 рублёў на месяц<br>24900 рублёў на квартал<br>49800 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 14000 рублёў на месяц<br>42000 рублёў на квартал<br>84000 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12800 рублёў на месяц<br>38400 рублёў на квартал<br>76800 рублёў на паўгоддзе |
| ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку) | | |
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 7460 рублёў на месяц<br>26400 рублёў на квартал<br>44760 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 6990 рублёў на месяц<br>20970 рублёў на квартал<br>41940 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 9938 рублёў на месяц<br>29814 рублёў на квартал<br>59628 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 9431 рубель на месяц<br>28293 рублі на квартал<br>56586 рублёў на паўгоддзе |

ПРАКТЫКА

## ТВІСТАР НА ДВАЙНІКУ

Кожны рыбалоў-спінінгіст ведае, што твістары — гэта таннасць, універсальнасць, уловістасць, прастата ў карыстанні, неабмежаваны матэрыял для канструктарскай думкі. Але многія з аматараў рыбнай лоўлі яшчэ не здагадваюцца аб усіх асноўных варыянтах аснашчэння твістара, і не ўяўляюць сабе, наколькі яны простыя, спадручныя і эфектыўныя. Звычайна, кожны рыбалоў выкарыстоўвае нейкі адзін, радзей два-тры, найбольш звычных і спадручных для сябе спосабаў аснасткі гэтай прынады. Між тым, з кожным годам з'яўляюцца новыя варыянты і некаторыя з іх даволі перспектыўныя.

Шмат спінінгістаў зараз адмаўляюцца ад мантажу твістара на джыг-галоўцы, паколькі такая снасць змяншае далечыню закіду і павялічвае колькасць сходаў. Таму і з'явіўся варыянт мацавання твістара на двайніку, які прадугледжвае шарнірнае злучэнне з «вушастым» грузам праз завадное кольца.

Асноўных варыянтаў сем. Найбольш распаўсюджаны «класічны» варыянт мантажу твістара з двайніком робіцца наступным чынам: двайнік уводзіцца ў цела твістара знізу, і кручкі нібыта ахопліваюць яго па краях *(фота 1)*. Такая аснастка лепш за ўсё падыходзіць для невялікіх (да 10 сантыметраў) твістараў. Калі ж вам трэба прыладзіць буйнейшы твістар, то ўзнікаюць некаторыя цяжкасці. Парушаецца аэрадынаміка — прынада пачынае выгінацца, ветразіць, а тое і круціцца ў палёце, што значна змяншае далечыню закіду. Ды і з эстэтычнага пункту погляду не зусім прэзентабельная. Для буйных твістараў больш падыдзе другі варыянт. Трэба адрэзаць частку цела твістара такім чынам, каб частка, якая застанецца, раўнялася даўжыні цаўя кручка. Кольца двайніка ўводзіцца непасрэдна ў пункце пераходу цела ў хвост *(фота 2)*. Калі хвост у твістара шырокі, то пры праводцы «страта масы» не адчувальная, хвост пры гульні стварае дастаткова моцныя хістанні, якія нададуць прынадзе неабходную масіўнасць. Можна зберагчы цела твістара і не абразаць яго. Кольца двайніка ўводзіцца зверху прыкладна ў сярэдзіне цела і прапіхваецца да галоўкі. Кручкі як «антэнкі» тырчаць з

прынады і цудоўна спраўляюцца са сваімі абавязкамі *(фота 3)*.

Калі ўзяць два двайнікі і ўвесці ў цела твістара, як апісана вышэй, з двух бакоў, атрымаецца нядрэнная альтэрнатыва трайніку *(фота 4)*. Імправізаваны «чацвярнік» выручае ў сітуацыі, калі рыба бярэцца вельмі неахвотна, і не заўсёды засякаецца двайніком або трайніком, а таксама пры лоўлі буйной рыбы. У прыватнасці, некаторыя рыбаловы выкарыстоўваюць такі варыянт аснасткі пры лоўлі сома.

Наступныя тры спосабы спадручныя для мантажу невялікіх і сярэдніх твістараў.

Брытвай ці вострым нажом наносяцца два прадольныя надрэзы ад сярэдзіны цела твістара да галоўкі *(фота 5-1)*. Потым твістар працягваецца паміж двума кручкамі, якія злёгку разводзяцца ў бакі, пры гэтым цаўё кожнага кручка павінна трапіць у прарэз *(фота 5-2)*. Гэты спосаб асабліва падыходзіць для аматараў «пагуляць колерам» — дастаткова прыгатаваць дома некалькі прынад рознага колеру, а потым мяняць іх на вадаёме — справа некалькіх секундаў. Не дзіўна, што гэты спосаб прыйшоўся даспадобы многім спартсменам — на спаборніцтвах час вельмі каштоўны.




Твістар насаджваецца на адзін кручок двайніка па аналогіі з джыг-галоўкай, а другі кручок знаходзіцца звонку і выконвае ролю прыцікной спружыны, не даючы прынадзе спаўзаць *(фота 6)*. Гэта адзін з самых простых варыянтаў аснашчэння. Такі спосаб таксама можна выкарыстоўваць для хуткай замены твістара пры яго пашкоджанні ці для змены колеру. Апошні варыянт больш нагадвае галавалом-ку. У вольны час можаце паэкспериментаваць. Тады прапануем вашай увазе простую канструкцыю блешні, якая пры праводцы паводзіць сябе як блешня, якая круціцца і, хоць не з'яўляецца ідэальным варыянтам спінінгавай прынады, але добра падыдзе для лоўлі акуня і невялікага шчупака.




Для прыгатавання блешні (дакладней казаць — блешанькі) спатрэбяцца:

— два завадныя кольцы;

— карабін (лепш тыпу «бочачка»);

— пялёстак невялікага памеру ад любой зламанай блешні, якая круціцца. Пялёстак таксама можна выразаць з любой бляшанкі ці каляровага цэлулоіда, зрабіўшы ў іх дзірку для завадного кольца. Прыкладны памер гэтай дэталі — з пазногаць вялікага пальца, форма не мае прынцыповага значэння.

Зборка. Пры дапамозе першага завадного кольца карабін і трайнік. Далей да першага кольца пры дапамозе другога далучаецца пялёстак. Блешня гатовая!

У час праводкі блешня стварае вярчальныя рухі пялёстка і трайніка вакол уяўнай восі, якая праходзіць праз цела карабіна. Для правільнай гульні блешні пажадана выбіраць памер пялёстка і трайніка такім чынам, каб пры падвесцы блешні за карабін іх даўжыня супадала, а шырыня пялёстка была б роўная або крыху меншай, чым максімальнае раскрыццё вастрыя трайніка.

МАЙСТЭРНЯ

## БЛЕШНЯ ЗА ДЗВЕ ХВІЛІНЫ

Уявіце сабе такую сітуацыю — на рыбалцы ў вас не засталося блешняў. Шчыра кажучы, пры багацці арсенала сучаснага рыбалова гэта амаль немагчыма, але ў жыцці рознае здараецца. Можа вы (крый Божа) пасадзілі ўсе свае (ну не ўсе, а самыя ўловістыя) блешні ў каражніку, або драпежнік іх вам зламаў вострымі зубамі. Або ў вас раптам узнікла жаданне паэксперыментаваць. Тады прапануем вашай увазе простую канструкцыю блешні, якая пры праводцы паводзіць сябе як блешня, якая круціцца і, хоць не з'яўляецца ідэальным варыянтам спінінгавай прынады, але добра падыдзе для лоўлі акуня і невялікага шчупака.

Для павелічэння далечыні закіду пажадана выбіраць карабіны большых памераў і, а п а в е д н а, большай вагі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.517. Індэкс 63850. Зак. № 5873. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12